ВЫДАННЕ АСВЕТНІКАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

СПЕЦЫЯЛЬНЫ ВЫПУСК

# НАСТАЎНІЦКАЯ газета

Выходзіць з 20 снежня 1945 года

№ 14 (7303)

Аўторак, 5 лютага 2013 года

## Акцэнты ў агульнай, дашкольнай, спецыяльнай адукацыі

У агульнай сярэдняй адукацыі абавязковы выпускны экзамен па замежнай мове абмяркоўваецца больш, чым любы іншы. Яго арганізацыя і правядзенне сталі тэмай не аднаго пасяджэння, семінара і канферэнцыі. Акрамя таго, працягваецца эксперымент па ўкараненні ІКТ у адукацыйны працэс, што таксама знаходзіцца ў цэнтры ўвагі як настаўнікаў, так і бацькоў. У сферы дашкольнай адукацыі ў мінулым годзе ствараліся новыя тыпы, віды і профілі дашкольных устаноў, актуальнай у спецыяльнай адукацыі стала праблема адаптацыі выпускнікоў інтэрнатных устаноў. Усе гэтыя пытанні — у цэнтры ўвагі і нашых карэспандэнтаў.

►►► 4—7 стар.

## Сарыентавацца і выбраць правільныя падыходы

Актуальныя пытанні выхаваўчай работы можна падзяліць на некалькі блокаў. Тры такія ўмоўныя блокі і былі вылучаны для сённяшняга абмеркавання. Гэта дзейнасць цэнтраў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, дзейнасць музеяў устаноў адукацыі, а таксама перанасычанасць выхаваўчага працэсу конкурсамі і акцыямі.

►►► 8—9 стар.

## Новая схема падрыхтоўкі кадраў: больш сучасная і мабільная

У 2012 годзе Міністэрства адукацыі зацвердзіла пералік спецыяльнасцей з тэрмінам атрымання адукацыі менш як 5 гадоў і графік пераходу на дыферэнцаваныя тэрміны атрымання вышэйшай адукацыі першай ступені. Мяркуецца, што ў хуткім часе падрыхтоўка спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй будзе весціся пераважна па схеме “4 + 2”. Праведзена вялікая работа па развіцці практыка-арыентаванай магістратуры і фарміраванні адпаведных спецыяльнасцей, распрацоўваюцца адукацыйныя стандарты і тыпавыя вучэбныя планы. Усё больш увагі ўдзяляецца ўмацаванню супрацоўніцтва ўстаноў адукацыі з арганізацыямі і прадпрыемствамі ў падрыхтоўцы кадраў. Гэтыя і іншыя аспекты развіцця вышэйшай школы мы вырашылі абмеркаваць са спецыялістамі.

►►► 12—15 стар.

## Не рэформа, а трансфармацыя

Мінулы год запомніўся пачаткам аптымізацыі сістэмы прафесійнай адукацыі. У Год беражлівасці гэтая тэма набывае яшчэ большую актуальнасць. Чым будзе адметны працэс аптымізацыі прафесійнай адукацыі, якія вынікі чакаюцца пасля яе правядзення, наколькі гэта паўплывае на якасць прафесійнай адукацыі? Па гэтых пытаннях аўтарытэтнае меркаванне выказвае рэктар Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі, доктар педагагічных навук, прафесар А.Х.Шкляр.

►►► 16 стар.

## Простая мова

Зразумела, шмат падзей адбылося і ў вучэбнай, і ў выхаваўчай, і ў сацыяльнай сферы адукацыі. З якімі праблемамі сутыкнуліся прадстаўнікі ўсіх галін адукацыі пры рэалізацыі пастаўленых задач, чытайце ў бліц-апытаннях, праведзеных журналістамі “НГ” перад пасяджэннем калегіі.

►►► 2—15 стар.

*Заўтра, **6 лютага**, адбудзецца пасяджэнне калегіі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь “Аб выніках работы Міністэрства адукацыі за 2012 год і асноўных задачах на 2013 год”.*

***Сёння ў нумары мы разам з супрацоўнікамі сістэмы адукацыі, кіраўнікамі адукацыйнай галіны рэгіёнаў, педагогамі, бацькамі навучэнцаў паспрабавалі нагадаць чытачам аб асноўных найбольш знамянальных падзеях 2012 года ў сістэме адукацыі і зазірнуць у найбліжэйшую перспектыву адукацыйнага жыцця краіны.***


















## Свет асаблівага дзяцінства



**Міхаіл Андрэевіч ЦІХАНЧУК, начальнік упраўлення адукацыі Брэсцкага аблвыканкама:**

— Адметнасцю мінулага года для вобласці стала ўвядзенне ў эксплуатацыю трох новых школ агульнай умяшчальнасцю 456 месцаў: 120 месцаў у в. Гвазніца Маларыцкага раёна, 168 месцаў у в. Вулька-2 Лунінецкага раёна, школа на 168 месцаў з дзіцячым садам на 20 месцаў (адкрыта 40 месцаў) у в. Альгамель Столінскага раёна. Акрамя таго, завершана будаўніцтва трох дзіцячых дашкольных устаноў у Брэсце, Пінску і ў в. Лінова Пружанскага раёна (адпаведна на 260, 170 і 95 месцаў). У мінулым годзе было пабудавана 5 аднакватэрных жылых дамоў для сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў. У 2013 годзе будуць пабудаваны яшчэ чатыры. У 2012 годзе завершана будаўніцтва другой чаргі інтэрната № 4 Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта імя А.С.Пушкіна. Урачыстае адкрыццё інтэрната прайшло ў першы дзень гэтага навучальнага года з удзелам старшыні Брэсцкага аблвыканкама К.А.Сумара.

Школы Брэстчыны маюць багаты вопыт у сферы энергазберажэння і гатовы назапашваць яго і далей у Год беражлівасці. Так, у прыватнасці, у Гродне на рэспубліканскім конкурсе "Энергамарафон" у намінацыі "Лепшы вучнёўскі праект практычных мерапрыемстваў па энергазберажэнні" 1-е месца занялі навучэнцы гімназіі № 5 Баранавіч Аляксей Самусеў, Ігар Гайдук. Аляксей Водчыц, з сярэдняй школы № 19 Баранавіч, у міжнародным конкурсе "Энергія і асяроддзе пражывання" ў Осла (Нарвегія) атрымаў прыз Нарвежскага таварыства аховы прыроды.

У Рэспубліканскім этапе конкурсу "Летапіс населенага пункта" ў рамках акцыі навучэнскай моладзі "Жыву ў Беларусі і тым ганаруся" юныя краязнаўцы Астроміцкай сярэдняй школы Кобрынскага раёна занялі 1-е месца.

Узорны ансамбль эстраднага танца "Прэстыж" абласнога цэнтра маладзёжнай творчасці (кіраўнік А.М.Ляўчук) стаў уладальнікам Гран-пры Міжнароднага фестывалю дзіцячай і маладзёжнай творчасці "Зоркі восені — 2012" у Польшчы.

У сістэме спецыяльнай адукацыі значнымі ў мінулым годзе сталі абласныя мерапрыемствы, прымеркаваныя да Міжнароднага Дня інвалідаў і да Новага года: абласная выстава дэкаратыўна-прыкладной творчасці дзяцей-інвалідаў і дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця "Свет асаблівага дзяцінства", абласная дабрачынная ёлка, у якіх прынялі ўдзел больш за 200 дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, іх педагогі і бацькі.

Выхаванцы Столінскага раённага Цэнтра карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі прынялі ўдзел у фінале рэспубліканскага конкурсу "Усе разам", які праходзіў у Магілёве. Каманда Брэсцкай вобласці перамагла ў намінацыі "Самыя ўмелыя".

Важнай падзеяй у сістэме спецыяльнай адукацыі Брэстчыны стала правядзенне ў Баранавічах пасяджэння калегіі Міністэрства адукацыі, на якім разглядаліся злабадзённыя пытанні развіцця сістэмы спецыяльнай адукацыі краіны на прыкладзе Брэсцкай вобласці. У новым годзе запланавана правядзенне ўжо трэцяй Міжнароднай канферэнцыі педагогаў сістэмы спецыяльнай адукацыі "Работа з сем'ямі, якія выхоўваюць дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця".

Характэрна для вобласці і тое, што вядзецца актыўная работа па стварэнні ў сістэме прафесійна-тэхнічнай адукацыі вобласці рэсурсных цэнтраў. У 2012 годзе на базе Брэсцкага прафесійна-тэхнічнага каледжа гандлю створаны чацвёрты ў галіне рэсурсны цэнтр вытворчага навучання. У цэлым у 2012 годзе на абсталяванне рэсурсных цэнтраў выдаткавана каля 1,5 млрд руб. (2011 год — 300 млн руб.). У рэспубліканскім конкурсе прафесійнага майстэрства па сельскагаспадарчых прафесіях у асабістым першынстве дыплом III ступені Міністэрства адукацыі атрымаў Дзмітрый Равуцкі, навучэнец Столінскага прафесійнага ліцэя сельскагаспадарчай вытворчасці. У V Міжнародным фестывалі прыгажосці "Hair-2012" каманда навучэнцаў Брэсцкага прафесійна-тэхнічнага каледжа сферы абслугоўвання пад кіраўніцтвам выкладчыка М.А.Булдык заняла 2-е месца па цырульніцкім майстэрстве сярод навучальных устаноў.

У гэтым годзе мы плануем правядзенне адкрытых конкурсаў прафесійнага майстэрства навучэнцаў і майстроў вытворчага навучання па прафесіях "Мантажнік санітарна-тэхнічных сістэм і абсталявання", "Электраманцёр па рамонце і абслугоўванні электраабсталявання", "Цырульнік", "Трактарыст-машыніст сельскагаспадарчай вытворчасці".

## Паніжаны ўзровень сацыяльнага сіроцтва



**Іван Антонавіч ШЧУРОК, начальнік упраўлення адукацыі Віцебскага аблвыканкама:**

— У мінулым годзе намаганні органаў кіравання адукацыяй вобласці былі накіраваны на выкананне асноўных паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця ў сферы адукацыі, умацаванне кадравага патэнцыялу ўстаноў адукацыі, павышэнне эканамічнай эфектыўнасці сістэмы адукацыі, павелічэнне пазабюджэтных даходаў устаноў адукацыі і інш.

Ахоп дзяцей дашкольнай адукацыяй склаў 80 працэнтаў. Забяспечанасць дзяцей месцамі ў дашкольных установах склала 120 працэнтаў (стандарт — 85 працэнтаў).

У сістэме агульнай сярэдняй адукацыі вобласці выкананы дзяржаўныя сацыяльныя стандарты. Назіраецца станоўчая дынаміка паспяховасці навучэнцаў, добрыя вынікі выступлення віцебскіх школьнікаў на заключным этапе рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах, навукова-даследчай дзейнасці, выпускных экзаменах.

Адзначу, што па-ранейшаму мы захоўваем станоўчыя тэндэнцыі зніжэння ўзроўню падлеткавай злачыннасці. Колькасць злачынстваў, учыненых непаўналетнімі, зменшылася ў параўнанні з 2011 годам з 481 да 407 (на 15,4 працэнта).

У сістэме дадатковай адукацыі вобласці ажыццяўляецца планамернае развіццё сеткі аб'яднанняў па інтарэсах, ствараюцца ўмовы для павышэння якасці адукацыйных паслуг на аснове запытаў і патрабаванняў навучэнцаў і іх бацькоў.

Удасканаленне сеткі спецыяльных устаноў і структур інтэграванага тыпу дазволіла павялічыць у мінулым годзе агульны працэнт ахопу дзяцей спецыяльнай адукацыяй і карэкцыйна-педагагічнай дапамогай да 98,8 працэнта. Быў паніжаны ўзровень сацыяльнага сіроцтва. На выхаванне ў сем'і ўладкаваны 71 працэнт выяўленых дзяцей-сірот.

Калі гаварыць пра развіццё ў вобласці прафесійна-тэхнічнай адукацыі, то выкананы асноўныя паказчыкі па прыёме і выпуску рабочых кадраў. Прайшлі прафесійную падрыхтоўку, перападрыхтоўку і павышэнне кваліфікацыі па дагаворах са службамі занятасці, арганізацыямі і фізічнымі асобамі каля 4,8 тысячы чалавек. Адметнасцю года стала і адкрыццё двух рэсурсных цэнтраў па лёгкай прамысловасці і машынабудаванні.

У мінулым годзе была ўведзена ў эксплуатацыю дзіцячая дашкольная ўстанова на 230 месцаў у мікрараёне Білева-1 Віцебска, два жылыя дамы для сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, у аграгарадку Арэхаўна Ушацкага раёна і г.п.Відзы Браслаўскага раёна, завершана будаўніцтва прыбудовы ў г.п. Арэхаўск Аршанскага раёна. Такім чынам, асвоена 53,9 млрд рублёў.

У бягучым годзе будзе працягнута будаўніцтва пяці дзіцячых дашкольных устаноў у Віцебску, Полацку, Оршы і ясляў-сада—пачатковай школы у Наваполацку, базавай школы на 120 месцаў у в.Літусова Сенненскага раёна і сярэдняй школы на 1020 месцаў у Віцебску, двух плавальных басейнаў у Віцебску і Новалукомлі Чашніцкага раёна, спальнага корпуса з харчаблокам для Віцебскага кадэцкага вучылішча, двух жылых дамоў для сем'яў, у якіх жывуць дзеці-сіроты і дзеці, якія засталіся без апекі бацькоў, у г.п.Ула Бешанковіцкага раёна і ў Талачыне. На гэтыя мэты прадугледжана накіраваць сродкі абласнога бюджэту ў памеры 102,4 млрд рублёў.

У гэтым годзе на арганізацыю адукацыйнага працэсу выдзелена 13,5 млрд рублёў. Грошы будуць выдаткаваны на набыццё мабільных камп'ютарных класаў, абсталявання для кабінетаў фізікі, хіміі і біялогіі, абсталявання цэнтраў па падрыхтоўцы навучэнцаў да алімпіяд.

На маю думку, варта актывізаваць работу па прапагандзе ўладкавання дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, у сем'і, забяспечыўшы пры гэтым не менш як 80 працэнтаў уладкавання выяўленых дзяцей названай катэгорыі на сямейныя формы выхавання.

Акрамя таго, патрабуецца тэрміновае прыняцце мер па карэкціроўцы аб'ёмаў падрыхтоўкі рабочых кадраў у бок павелічэння за кошт росту колькасці навучэнцаў, якія вучацца па праграмах прафесійна-тэхнічнай адукацыі і ў сярэдніх спецыяльных навучальных установах вобласці па падрыхтоўцы рабочых з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй.

Сёння вельмі важна нацэліць калектывы на рацыянальнае выкарыстанне сродкаў бюджэту, на эканомію паліўна-энергетычных рэсурсаў, пашырэнне адукацыйных і іншых паслуг.

## Новая адукацыйная парадыгма



**Міхаіл Уладзіміравіч МІРОНЧЫК, старшыня камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама:**

— Перш за ўсё 2012 быў годам выпрацоўкі новых стратэгій у дзейнасці па павышэнні якасці адукацыі. Яны заключаюцца ва ўзмацненні кампетэнтнаснага складніку адукацыйнага працэсу, у стварэнні перадумоў да кампетэнтнаснага разумення і ацэнкі адукацыйнага выніку.

Галоўным дасягненнем лічу тое, што педагогі ўсвядомілі і прынялі гэты выклік часу, мабільна адрэагавалі на яго. Многія з іх ужо сёння фарміраванне тых ці іншых ключавых кампетэнцый разумеюць як задачу вучэбнай дзейнасці. Але, што важней, прафесійна рыхтуюць сябе да работы ва ўмовах новай адукацыйнай парадыгмы.

У горадзе праводзіцца сертыфікацыя педагагічных работнікаў як карыстальнікаў інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій. Як на сёння прайшлі 583 педагогі, у 2012 годзе — амаль 300, многія настаўнікі маюць свае прадметныя сайты.

Для развіцця інфармацыйна-камунікацыйных кампетэнцый педагогаў ва ўмовах высокатэхналагічнага адукацыйнага асяроддзя ў дадатак да ўжо існуючых 33 прадметных рэсурсных цэнтраў у мінулым годзе было адкрыта 12 рэсурсных цэнтраў па інфарматызацыі. Зараз усе яны працуюць у новым фармаце, замацаваным у Палажэнні аб рэсурсным цэнтры. Гэта ўпершыню распрацаваны лакальны нарматыўны дакумент, які забяспечвае больш дакладную каардынацыю і кантроль за іх дзейнасцю.

Пазітыўным вынікам мінулага года можна лічыць пашырэнне ўмоў і магчымасцей для фарміравання ў маладых людзей лідарскіх якасцей і вопыту грамадскай дзейнасці. Найбольш паспяховым праектам з'яўляецца Маладзёжная палата пры Мінскім гарадскім Савеце дэпутатаў, якая працуе ўжо трэцяе скліканне. Па ініцыятыве членаў палаты адкрыты забаўляльныя пляцоўкі, у тым ліку для заняткаў экстрэмальнымі відамі спорту, унесены змены ў сістэму школьнага харчавання, новыя нормы ў Палажэнне аб прадметнай алімпіядзе. Сёння рэалізуецца яшчэ некалькі аналагічных праектаў, сярод якіх "Мінская змена", Мінскі гарадскі студэнцкі савет, лідарскі конкурс "Лесвіца поспеху".

Для ўзаемадзеяння з моладдзю ў 2012 годзе ў Мінску з'явіўся шэраг інавацыйных пляцовак. Адна з іх — гарадскі крэатыўна-інавацыйны цэнтр, які стане пляцоўкай для рэалізацыі самых розных сацыяльных маладзёжных праектаў.

Яшчэ адзін праект, у які ўключыўся горад, — глабальная ініцыятыва ЮНІСЕФ "Горад, дружалюбны да дзяцей". Яго задачай з'яўляецца ўдзел дзяцей і моладзі ў падрыхтоўцы рашэнняў, якія закранаюць іх інтарэсы, стварэнне ўмоў для максімальнага раскрыцця патэнцыяльных магчымасцей кожнага дзіцяці.

У 2012 годзе скончыўся цыкл стварэння раённых цэнтраў ваенна-патрыятычнага выхавання і допрызыўнай падрыхтоўкі навучэнцаў, у якіх ёсць усё неабходнае для арганізацыі ваенна-патрыятычнага выхавання моладзі і падрыхтоўкі юнакоў да выканання сваёй грамадзянскай місіі абаронца Айчыны. Тым самым мы стварылі ўмовы для забеспячэння якасна новага ўзроўню работы па грамадзянска-патрыятычным выхаванні падрастаючых пакаленняў.

Усё гэта ўяўляе сабой магутны інавацыйны выхаваўчы патэнцыял, рэалізаваць які — наша прафесійная задача.

У 2012 годзе адукацыйная прастора горада папоўнілася дзвюма новымі школамі і дзвюма дашкольнымі ўстановамі. Створаная адукацыйная сістэма і яе інфраструктура забяспечваюць умовы для якаснай арганізацыі адукацыйнага працэсу. Але ўжо сёння патрабуюцца структурныя і змястоўныя змены ўнутры самой сеткі, гэта значыць яе аптымізацыя. 2012 год стаў годам актыўнага пачатку гэтага працэсу. Эфектыўнае выкарыстанне існуючых рэсурсаў, эканомія сродкаў бюджэту па ўтрыманне будынкаў і памяшканняў — наша перспектыўная задача.

А галоўнымі адукацыйнымі арыенцірамі застаюцца ранейшыя: якасныя веды і ключавыя кампетэнцыі — у навучэнцаў, прафесійнае майстэрства і мабільнасць — у педагогаў і кіраўнікоў.

## Свая траекторыя



**Аляксандр Генрыхавіч СОНГІН, начальнік упраўлення адукацыі Гродзенскага аблвыканкама:**

— У мінулым годзе рэгіянальная сістэма адукацыі Гродзеншчыны зрабіла яшчэ адзін крок у павышэнні якасці і даступнасці адукацыі, аб чым сведчаць вынікі па цэлым шэрагу кірункаў. З мэтай забеспячэння крокавай даступнасці дашкольнай адукацыі з садоў выведзена 39 першых класаў, арганізавана работа трох сямейных дзіцячых садоў. На базе 4 устаноў паспяхова рэалізуецца эксперыментальны праект па апрабацыі мадэлі навучання з выкарыстаннем індывідуальных электронных прылад. Працягваючы традыцыі ўзаемадзеяння з установамі вышэйшай адукацыі ў 2012 годзе быў адкрыты 21 філіял кафедраў ГрДУ імя Янкі Купалы на базе ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі Гродна.

У Год кнігі значная ўвага была ўдзелена развіццю школьных бібліятэк, 94 з якіх функцыянуюць у статусе інфармацыйна-бібліятэчных цэнтраў. У 28 населеных пунктах былі інтэграваны сельскія публічныя і школьныя бібліятэкі. Палепшыліся вынікі работы па прафілактыцы сямейнага недабрабыту, ахове дзяцінства. Адметна, што мы змаглі дасягнуць скарачэння колькасці дзяцей, якія маюць патрэбу ў дзяржаўнай абароне. Павялічыўся да 60,5% паказчык вяртання дзяцей у сям'ю.

Што тычыцца выхаваўчай работы, то для Гродзеншчыны найбольш значнымі падзеямі сталі рэспубліканскі семінар на базе Карэліцкага і Лідскага раёнаў "Ад выхаваўчай прасторы ўстановы — да выхаваўчай прасторы рэгіёна", на якім быў прадстаўлены вопыт ідэалагічнай і выхаваўчай работы ўстаноў адукацыі ва ўзаемадзеянні з сям'ёй. Даволі паспяхова рэалізаваны абласны мегапраект "Патрыятычны марафон сацыяльна значных спраў "Паклонімся вялікім тым гадам", які складаецца з 27 праектаў. Працавала абласная пляцоўка ідэй "Свая траекторыя".

Хацелася б нагадаць і пра праект "Дэпутацкая прыёмная", які стаў асновай стварэння абласнога маладзёжнага парламента пры Гродзенскім абласным Савеце дэпутатаў. Ужо адбыліся дзве сесіі парламента, дзе маладыя парламентарыі распрацаваны шэраг ініцыятыў па працаўладкаванні і занятасці дзяцей і падлеткаў, па развіцці валанцёрскага руху, навучанні камп'ютарнай пісьменнасці дзяцей-інвалідаў.

Трэба адзначыць, што за мінулы год была істотна ўмацавана матэрыяльная база ўстаноў адукацыі і развіццё пазабюджэтнай дзейнасці. На правядзенне капітальнага і бягучага рамонту было затрачана 165,7 млрд руб. Асабліва вынікова спрацавалі тыя ўстановы адукацыі, якія выконвалі рамонтныя работы гаспадарчым спосабам. На гэтыя мэты было накіравана звыш 92 млрд руб. Да работы па ўмацаванні матэрыяльнай базы былі далучаны ўсе без выключэння ўстановы сістэмы адукацыі. Для выканання работ было задзейнічана больш за 1000 рамонтных брыгад агульнай колькасцю больш за 6100 чалавек. Уведзены ў эксплуатацыю 17 аб'ектаў, у тым ліку 6 аб'ектаў новага будаўніцтва і 11 аб'ектаў пасля рэканструкцыі.

У 2013 годзе перад сістэмай адукацыі вобласці стаяць нялростыя задачы. Выказваю ўпэўненасць у тым, што прафесіяналізм педагогаў, кіраўнікоў, адказнае стаўленне да справы дазволяць дастойна іх выканаць.

## Станоўчая дынаміка занятасці дзяцей



**Леанід Сцяпанавіч СМАТРЫЦКІ, начальнік упраўлення адукацыі Магілёўскага аблвыканкама:**

— У мінулым годзе ў сістэме дашкольнай адукацыі зроблена нямала: уведзены ў эксплуатацыю дашкольныя ўстановы на 240 месцаў у Магілёве і Бабруйску, на 95 — у новым мікрараёне Спадарожнік Магілёва, адкрыта прыватная дашкольная ўстанова "Умка-клас" на 20 месцаў у абласным цэнтры. Павялічылася колькасць цэнтраў развіцця дзіцяці з 8 да 10. Новыя цэнтры адкрыліся ў Кіраўскім і Горацкім раёнах. Звыш устаноўленых нарматываў выконваюцца дзяржаўныя сацыяльныя стандарты: забяспечанасць месцамі ў дашкольных установах у 2012 годзе склала 108%. Усе дзеці 5-гадовага ўзросту ахоплены падрыхтоўкай да школы. Сярэдні паказчык пропуску па хваробе адным дзіцем на працягу апошніх трох гадоў не перавышае 6 дзён у годзе (сярэднерэспубліканскі складае 9 дзён). Пацвярджэннем сістэмнай работы ў гэтым кірунку стала перамога дашкольнага цэнтра развіцця дзіцяці № 1 Магілёва ў рэспубліканскім конкурсе ў намінацыі "Лепшая дашкольная ўстанова года горада" (кіраўнік Таццяна Юр'еўна Шваццова).

У вобласці сфарміравана сістэма работы па выяўленні, падтрымцы і развіцці творчых здольнасцей навучэнцаў. Як вынік, паспяховае выступленне навучэнцаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі на міжнародных алімпіядах, а таксама на заключным этапе рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах (у 2012 годзе — другое камандное месца (86 дыпломаў, або 42,6%). Спецыяльным фондам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў у мінулым годзе быў узнагароджаны 121 навучэнец, пераможцы міжнародных і рэспубліканскіх алімпіяд і конкурсаў па вучэбных прадметах, і 28 педагогаў, якія ўнеслі асаблівы ўклад у развіццё здольнасцей адораных навучэнцаў і студэнтаў. У камп'ютарным банку даных адоранай моладзі сёння знаходзяцца звесткі пра 168 навучэнцаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі вобласці.

Хачу заўважыць, што на працягу апошніх пяці гадоў забяспечваецца станоўчая дынаміка занятасці дзяцей і падлеткаў ва ўстановах дадатковай адукацыі. Разнастайнымі відамі вольнага часу ахоплены 60% ад агульнай колькасці навучэнцаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі вобласці (самы высокі паказчык у рэспубліцы). Усяго ў мінулым навучальным годзе ва ўстановах адукацыі вобласці функцыянавала больш за 5 тысяч творчых аб'яднанняў і 2 тысячы спартыўных секцый.

У выніку праведзенай работы ў мінулым годзе ў параўнанні з 2011 годам зменшылася колькасць непаўналетніх удзельнікаў злачынстваў на 27,5%, затрыманых за ўжыванне спіртных напіткаў — на 18,3%. На Магілёўшчыне сёння самы нізкі ў краіне паказчык падлеткавай злачыннасці.

Дае свае станоўчыя вынікі і прафілактычная работа з сацыяльнанядобранадзейнымі сем'ямі. У 2012 годзе без апекі бацькоў засталося 371 дзіця. Гэта на 134 менш, чым у папярэднім годзе. Скарачэнне колькасці дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, а таксама ўладкаванне іх на выхаванне ў замяшчальныя сем'і, і, як вынік, змяншэнне колькасці дзяцей, якія накіроўваюцца ў інтэрнатныя ўстановы, спрыяла закрыццю ў мінулым годзе Круглянскай школы-інтэрната для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў.

Магілёўшчына займае лідзіруючую пазіцыю па колькасці дамоў сямейнага тыпу. Іх колькасць складае 40. Два з іх, у Круглянскім і Чэрыкаўскім раёнах, адкрыліся ў 2012 годзе. У 2013 годзе падобныя дамы з'явяцца ў Магілёўскім раёне і Бабруйску.

У нашым рэгіёне актывізавалі работу па ўсынаўленні дзяцей. Толькі за 2012 год у Магілёўскай вобласці новыя сем'і прынялі 73 дзіцяці. Важнай задачай органаў аховы дзяцінства з'яўляецца ўладкаванне дзяцей у замяшчальныя сем'і. За 2012 год у апякунскія, прыёмныя сем'і, дзіцячыя дамы сямейнага тыпу, у "SOS-Дзіцячую вёску Магілёў", дзе формы выхавання набліжаны да сямейных, уладкаваны 82% дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў. Нягледзячы на тое, што ў вобласці праведзена вялікая работа па выкананні Дэкрэта Прэзідэнта № 18, гаварыць аб завяршэнні праграмы нельга. У рэгіёне застаюцца 2575 дзяцей з 1482 сем'яў, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы. Работа будзе працягвацца да таго часу, пакуль кожны маленькі грамадзянін Магілёўскай вобласці не набудзе добранадзейную сям'ю.

Калі разглядаць становішча прафесійна-тэхнічнай адукацыі вобласці, то найбольш характэрным для яе з'яўляецца стварэнне рэсурсных цэнтраў як аднаго з крокаў аптымізацыі сеткі ўстаноў прафесійнай адукацыі. Так, на сённяшні дзень працуюць тры такія цэнтры па сельскагаспадарчым профілі на базе Магілёўскага прафесійнага агралесатэхнічнага каледжа імя К.П.Арлоўскага, па электраабсталяванні ў Магілёўскім прафесійным электратэхнічным каледжы, па будаўніцтве на базе Магілёўскага прафесійнага ліцэя № 9. У шасці раёнах вобласці на базе ўстаноў прафесійна-тэхнічнай адукацыі арганізавана перападрыхтоўка і павышэнне кваліфікацыі работнікаў сельскагаспадарчых вытворчых калектываў. Па прафесіях "Аператар машыннага даення", "Трактарыст-машыніст сельскагаспадарчай вытворчасці" ў адпаведнасці з даручэннем аблвыканкама ўпершыню ў бягучым годзе пачата падрыхтоўка старшакласнікаў сельскіх школ.

Прыярытэтнымі кірункамі развіцця сістэмы адукацыі на 2013 год: трымаць на пастаянным кантролі ход рэалізацыі ў рэгіёне, непасрэдна ва ўстанове праграм развіцця дашкольнай, агульнай сярэдняй, спецыяльнай, прафесійна-тэхнічнай адукацыі, забяспечыўшы ў поўным аб'ёме выкананне асноўных прагнозных паказчыкаў; працягваць работу па павышэнні адукацыйнага і кваліфікацыйнага ўзроўняў педагагічных работнікаў, удасканаленні сістэмы іх матэрыяльнага стымулявання ў адпаведнасці з вынікамі; весці сістэмную работу па аптымізацыі сеткі ўстаноў адукацыі, праводзіць актыўную прапаганду ўсынаўлення як прыярытэтнай формы сямейнага ўладкавання дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў; працягнуць работу па ўмацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў адукацыі, будаўніцтве новых аб'ектаў.

## У ролі першапраходца

**Галіна Мікалаеўна КАЗАК, начальнік упраўлення адукацыі Мінаблвыканкама:**

— Мяркуючы па выніках мінулага года, можна з упэўненасцю сказаць, што для адукацыі Мінскага рэгіёна характэрна станоўчая дынаміка, якая пацверджана шматлікімі дасягненнямі ў сферы адукацыі. Прыкметай мінулага года стала будаўніцтва новых навучальных устаноў.

Так, у прыватнасці, былі ўведзены ў эксплуатацыю школьная прыбудова да сярэдняй школы № 1 Фаніпаля на 200 месцаў, 3 дзіцячыя садкі на 230 месцаў кожны: яслі-сад № 6 Маладзечна, яслі-сад № 4 Лагойска, вучэбна-педагагічны комплекс "дзіцячы сад—сярэдняя школа" Бараўлян Мінскага раёна. За кошт вываду першых класаў, перапрафілявання функцыянальных памяшканняў пад групавыя, адкрыцця ўстаноў пасля рамонту і рэканструкцыі створана 988 дадатковых месцаў.

У вобласці сёння дзейнічаюць 10 сямейных дзіцячых садоў, 6 з якіх адкрыты ў 2012 годзе. Для стварэння сямейных умоў выхавання дзяцей у Мінскай вобласці ўведзена 35 дамоў сямейнага тыпу, у якіх пражываюць 259 дзяцей. У 2012 годзе 2 дамы сямейнага тыпу былі адкрыты ў Чэрвені і Уздзе, што сведчыць аб істотным клопаце дзяржавы аб дзецях.

Калі гаварыць аб здабытках у павышэнні якасці адукацыйнага працэсу, то найперш гэта вынікі сёлетняга цэнтралізаванага тэсціравання: 17 навучэнцаў атрымалі 100 балаў. Гэта сапраўды выдатны вынік у параўнанні з пазамінулым годам, калі толькі 6 навучэнцаў атрымалі жаданыя 100 балаў. Мы па праве ганарымся дзецьмі, якія праславілі Мінскую вобласць на рэспубліканскіх, міжнародных алімпіядах і конкурсах. Так, навучэнка гімназіі № 1 Жодзіна Хрысціна Пічугіна стала ўладальніцай галоўнага прыза школы MEF на XXI Міжнароднай выставе даследчых праектаў школьнікаў у Турцыі. Нічыпар Лазоўскі, з гімназіі № 1 Слуцка, заваяваў залаты медаль на 44-й Міжнароднай хімічнай алімпіядзе ў ЗША. Сяргей Сіняк, навучэнец гімназіі Дзяржынска, у складзе зборнай каманды нашай краіны стаў уладальнікам залатой узнагароды 4-га Міжнароднага турніру юных матэматыкаў у Францыі.



Прыемна гаварыць і аб тым, што ў мінулым годзе лаўрэатамі спецыяльнай прэміі Мінскага аблвыканкама "Чалавек года Міншчыны" сталі Святлана Рыгораўна Пузіноўская, настаўніца інфарматыкі сярэдняй школы № 4 Дзяржынска, і Ірына Мікалаеўна Пічугіна, настаўніца геаграфіі гімназіі № 1 Жодзіна. Хацелася б назваць празвішчы і тых педагогаў, якія сталі лаўрэатамі прэміі "За духоўнае адраджэнне". Так, у 2012 годзе прэзідэнт уручыў прэмію бацькам-выхавальнікам Нясвіжскага дзіцячага дома сямейнага тыпу Ігару Вітальевічу і Галіне Леанідаўне Бушмакіным, а ў 2013 годзе з рук кіраўніка дзяржавы гэтую высокую ўзнагароду атрымаў дырэктар Радашковіцкай школы-інтэрната для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, Ігар Міхайлавіч Дзятлоўскі.

Падрыхтоўка ініцыятыўных, дзелавых людзей, якія ўмеюць нестандартна вырашаць надзённыя праблемы, заўсёды знаходзіцца ў цэнтры нашай увагі. У 2011/2012 навучальным годзе стартаваў праект па стварэнні школьных бізнес-кампаній. Падобнага вопыту ў нашай краіне пакуль няма, і Мінская вобласць выступіла ў гэтым кірунку ў ролі першапраходца. На сённяшні дзень на базе ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі рэгіёна адкрыты 62 школьныя бізнес-кампаніі, у якіх заняты 501 навучэнец. Па выніках першага года работы юныя бізнесмены зарабілі каля 10 млн рублёў. Амаль 30% бізнес-кампаній задзейнічаны ў аграрным кірунку — вырошчванні расады кветкавых і агародніных культур. Як бачна, зроблена шмат. Але ў далейшай рабоце нам неабходна сканцэнтраваць намаганні на павышэнні якасці адукацыйнага працэсу і эфектыўнасці выкарыстання бюджэтных сродкаў, і, такім чынам, забяспечыць стабільнае функцыянаванне сістэмы адукацыі Мінскай вобласці.

## Для ўзняцця прэстыжу настаўніцкай прафесіі

**Сяргей Іванавіч ПАРОШЫН, начальнік упраўлення адукацыі Гомельскага аблвыканкама:**



— Калі гаварыць пра вынікі работы сістэмы адукацыі Гомельскай вобласці, то ў першую чаргу гэта вынікі нашых выхаванцаў і навучэнцаў. Школьнікі Гомельшчыны ў 2012 годзе прынеслі ў скарбонку перамог нашай краіны 2 залатыя і 2 бронзавыя медалі з міжнароднай алімпіяды па інфарматыцы і біялогіі, залаты медаль у секцыі матэматыкі і сярэбраны ў секцыі інфарматыкі на Міжнароднай канферэнцыі юных вучоных, якая прайшла ў Галандыі. Вячаслаў Мурашка з гомельскай гімназіі № 71 у складзе каманды Беларусі стаў пераможцам Міжнароднага турніру юных матэматыкаў. Першае камандное месца і дыплом абсалютнай пераможцы, які заваявала Вольга Нянашава з гімназіі № 14 Гомеля, прывезлі навучэнцы вобласці з Масквы з VII алімпіяды школьнікаў Саюзнай дзяржавы "Расія і Беларусь: гістарычная і духоўная еднасць".

2012 год быў адзначаны перамогамі навучэнцаў устаноў прафесійна-тэхнічнай адукацыі. Напрыклад, на рэспубліканскім конкурсе прафесійнага майстэрства па прафесіі "Тынкоўшчык", у асабістым заліку выхаванцы прафтэхустаноў Гомельшчыны прызнаны лепшымі ў краіне. За кожнай гэтай перамогай — велізарная праца педагогаў, кіраўнікоў навучальных устаноў, вопыт многіх з іх неадназова быў прадстаўлены на старонках "Настаўніцкай газеты".

Прыемна адзначыць, што ўвогуле для ўзняцця прэстыжу настаўніцкай прафесіі за мінулы год было зроблена нямала. Гэтаму спрыялі рэгіянальныя конкурсы прафесійнага майстэрства на лепшага настаўніка замежнай мовы, лепшага трэнера каманды па падрыхтоўцы навучэнцаў да алімпіяды і, вядома, першы абласны конкурс на лепшага кіраўніка ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі.

З мэтай падтрымкі дзіцячых ініцыятыў, рэалізацыі прынцыпу "роўны вучыць роўнага" ў вобласці быў упершыню арганізаваны абласны форум лідараў дзіцячых і маладзёжных грамадскіх аб'яднанняў, органаў школьнага самакіравання "Лідары XXI стагоддзя: ініцыятыва — у дзеянні", абласны злёт актываў дзіцячых аб'яднанняў (клубаў, гурткоў) "Юныя сябры міліцыі", "Юныя інспектары руху", "Юныя ратавальнікі-пажарныя".

Летам мінулага года была рэалізавана міжведамасная праграма "Разумныя канікулы: лета — 2012", якая ўключала мерапрыемствы ўсіх зацікаўленых абласных структур і ведамстваў: упраўлення ўнутраных спраў, упраўлення МНС, аддзела па справах моладзі, БРСМ, камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, упраўлення фізічнай культуры, спорту і турызму, упраўлення культуры і іншых. Як вынік — зніжэнне ўдзельнай вагі колькасці правапарушэнняў, злачынстваў сярод школьнікаў у летні перыяд 2012 года ў параўнанні з аналагічным перыядам 2011 года. У параўнанні з 2011 годам зменшылася на 10% і колькасць непаўналетніх, якія знаходзяцца на наркалагічным уліку, на 60% — колькасць учыненых суіцыдаў сярод падлеткаў.

Вельмі прыемна адзначыць, што дзякуючы дзейнасці аддзелаў адукацыі рэгіёна, ячэ 17 дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, набылі сям'і. Гэта стала магчыма пасля адкрыцця трох дзіцячых дамоў сямейнага тыпу ў Гомелі, Добрушы, Мазыры. Сёння ў вобласці такіх дамоў ужо 30, у якіх выхоўваецца 250 дзяцей.

Як і папярэднія гады, 2012 год быў адметны наваселлямі. Пры падтрымцы рэспубліканскага бюджэту, юныя мазыране атрымалі ў падарунак унікальны сучасны будынак сярэдняй школы № 16, абсталяваны па апошнім слове тэхнікі. У вобласці такая школа — адзіная. А для маленькіх жыхароў Гомеля адкрыўся новы яслі-сад з басейнам. Гэта выдатная магчымасць не толькі навучыць дзяцей плаваць, але і ўмацаваць іх здароўе і ў цэлым пашырыць спектр адукацыйных паслуг навучальнай установы.

Не застаёмся ў баку і ад такога важнага кірунку, як энергазберажэнне. Па выніках рэспубліканскага конкурсу школьных праектаў па эканоміі і беражлівасці "Энергамарафон — 2011" вобласць прызнана лепшай у краіне. У 2012 годзе мы атрымалі спецыяльны грант Міжнароднага Вышаградскага фонду для рэалізацыі праекта "Энергарандэву ў Беларусі". Гэта дазволіла развіваць супрацоўніцтва ў сферы энергазберажэння паміж установамі адукацыі Чэхіі, Славакіі, Польшчы і нашай краіны.

Новы год толькі пачаўся, але мы ўжо намецілі новыя задачы і перспектывы. Вельмі значнымі для сістэмы адукацыі вобласці ў 2013 годзе застаюцца пытанні аптымізацыі сеткі ўстаноў, павышэння якасці дашкольнай, школьнай, прафесійна-тэхнічнай адукацыі, выхавання дзяцей у тым ліку і ў прыёмных сем'ях, эканоміі бюджэтных сродкаў і многія іншыя.

Не на словах, а на справе хацелася б ажыццявіць усе мерапрыемствы, звязаныя з Годам беражлівасці, самым галоўным вынікам якога, на наш погляд, будзе захаванне матэрыяльных і чалавечых рэсурсаў.

**Падрыхтавала Ала КЛЮЙКО.**

Дзяржаўнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку", ЛП № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, праспект Незалежнасці, 79. Тыраж 38.500 экзэмпляраў. Заказ № 572.

# Персанальныя электронныя прылады патрабуюць адукацыйнага кантэнту

**Другі навучальны год у Ліцэі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта праходзіць эксперымент па ўкараненні персанальных электронных прылад у адукацыйны працэс. Навучэнцы 11 хіміка-біялагічнага класа вывучаюць магчымасці выкарыстання рыдараў у ліцэі і дома. Эксперымент павінен даць адказ на шэраг пытанняў: як выкарыстанне электронных кніг уплывае на здароўе навучэнцаў? ці мэтазгодна масава ўкараняць такія прыстасаванні ў школах? ці ёсць ад іх адчувальны педагагічны эфект? ці зможа электронная кніга стаць альтэрнатывай папяроваму падручніку?**



Рыдары кампактныя і лёгкія, і, па сведчанні ліцэістаў, амаль знікла неабходнасць звяртацца ў бібліятэку, бо ўсё можна знайсці ў інтэрнэце і запампаваць у электронную кнігу (пад рукой можа быць не адзін, а тысячы твораў — памяць рыдараў дастаткова вялікая), асабліва калі патрабуецца спецыялізаваная літаратура, якой часам не знойдзеш у бібліятэцы.

"Калі ў БДУ вызначаліся, якому з персанальных прыстасаванняў аддаць перавагу, то бралі пад увагу найперш бяспеку для здароўя іх уладальнікаў, кампактнасць і невялікую вагу, наяўнасць сеткавых інтэрфейсаў, вялікую працяглась аўтаномнай работы, трываласць, прастату ў выкарыстанні і зразумелы інтэрфейс, — адзначае навуковы кіраўнік эксперыментальнага праекта, намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце Ліцэя БДУ Ігар Мікалаевіч Варакса. — Выбар спыніўся на электроннай кнізе, або рыдары. Адна з істотных пераваг рыдара — выкарыстанне тэхналогіі электроннай паперы, дзякуючы якой яго экран не свеціцца і не мільгае, а таму не стамляе зрок, у яго няма праблем з вугламі агляду і сонечнымі блікамі. Праўда, у цемры з яго не пачытаеш. Прымяненне ж тэхналогіі электронных чарнілаў дазваляе паменшыць нагрузку на органы зроку амаль на 30%. Батарэі хапае ў сярэднім на тры тыдні (да поўнай разрадкі трэба прачытаць 6-7 тысяч старонак). Акрамя таго, электронная кніга мае дыяганаль 9,7 дзюйма: старонка падручніка без маштабавання добра бачна. Сярод мінусаў — чорна-белыя выявы, адсутнасць магчымасці ствараць дакументы, заходзіць у інтэрнэт, глядзець відэа".

Зусім невыпадкова для ўдзелу ў эксперыменце быў выбраны менавіта хіміка-біялагічны клас. Яго навучэнцы актыўна карысталіся дадатковымі вучэбнымі матэрыяламі, створанымі педагогамі ліцэя і размешчанымі на серверы дыстанцыйнага навучання.

Сёння ў рыдарах ліцэістаў змяшчаюцца падручнікі для 10–11 класа (электронныя версіі ў pdf-фармаце прадастаўлены Нацыянальным інстытутам адукацыі), тэксты літаратурных твораў і дадатковая літаратура па беларускай і рускай літаратуры, а таксама матэрыялы, якія рыхтуюць настаўнікі. "Гэта лекцыйныя матэрыялы, з якімі навучэнец можа азнаёміцца як напярэдадні заняткаў і прыйсці падрыхтаваным на іх, так і пасля заняткаў, замацоўваючы пройдзенае, умовы самастойных і кантрольных работ, якія праводзіць настаўнік, — гаворыць дырэктар Ліцэя БДУ Вадзім Эдвардавіч Матуліс. — Як правіла, пасля кантрольных работ у дзяцей узнікаюць пытанні, як выканаць тое ці іншае заданне, ім хочацца даведацца пра правільны адказ па гарачых слядах. Настаўнік перакідвае на рыдар адказы, і навучэнец дома можа правесці работу над памылкамі і высветліць тое, што яму засталося незразумелым. Пры гэтым не затрачваецца такі каштоўны час на ўроку. Нарэшце, гэта дамашнія заданні: навучэнцы атрымліваюць умовы, а пасля і тлумачэнні да іх выканання".

Па словах Вадзіма Эдвардавіча, эксперымент даў штуршок педагогам да павышэння інфармацыйнай культуры, да творчасці, да стварэння новых дадатковых матэрыялаў. Як паказвае практыка, асабліва актыўна выкарыстоўваюць рыдары ў адукацыйным працэсе настаўнікі, якія працавалі з навучэнцамі дыстанцыйна.

Вынікі апытання навучэнцаў паказалі, што прапанаваныя матэрыялы аказаліся запатрабаванымі для актыўнага самастойнага вывучэння хіміі (штодня да іх звяртаецца да 80% навучэнцаў эксперыментальнага класа), матэматыкі, біялогіі, для чытання твораў рускай і беларускай літаратуры. Вызначана таксама, што наяўнасць электронных прылад для чытання дазваляе ўдвая скараціць час, які праводзіць навучэнец перад маніторам камп'ютара, і больш эфектыўна яго выкарыстоўваць: у сярэднім навучэнец 11 класа праводзіць каля камп'ютара 3 гадзіны ў дзень, а ў эксперыментальным класе — 1,5 гадзіны плюс 45 хвілін з электроннай кнігай. Выяўлены таксама перавагі навучэнцаў пры выкарыстанні інтэрнэт-рэсурсаў: у эксперыментальным класе інтэрнэт выкарыстоўваецца пераважна для навучання, у кантрольным — для зносін. Але, як лічыць І.М.Варакса, гэты вопыт прыдатны толькі для канкрэтнай установы адукацыі і яго немагчыма маштабіраваць.

"Мы назіраем, як адбываецца змена парадыгмы навучання: калі ў навучэнца ёсць якая-небудзь мабільная прылада, то ён менш часу выдаткоўвае на камп'ютар і больш якасна яго выкарыстоўвае, — адзначае Ігар Мікалаевіч. — Магчыма, гэта тлумачыцца тым, што калі навучэнцы працуюць з рыдарам, то ўвага іх сканцэнтравана і ні на што не адцягваецца, а вось працуючы за камп'ютарам, навучэнец вымушаны, толькі засяродзіўшыся на вучобе, пераключаць сваю ўвагу на іншыя рэчы".

Па выніках першага этапу эксперыментальнай дзейнасці ўстаноўлена, што ўкараненне ў адукацыйны працэс рыдараў забяспечвае павышэнне эфектыўнасці арганізацыі адукацыйнага працэсу на вучэбных занятках; аптымізацыю пазакласнай і пазаўрочнай дзейнасці навучэнцаў пры ўмове наяўнасці адаптаваных вучэбных матэрыялаў для выкарыстання на выбраных прыладах. Вызначаны больш нізкі ўзровень стомленасці навучэнцаў эксперыментальнага класа ў параўнанні з кантрольным класам, дзе не выкарыстоўваюцца электронныя кнігі. А вось вывучэнне ўплыву выкарыстання электронных прылад для чытання на паставу і зрок ліцэістаў працягваецца і зараз. Канчатковыя вынікі будуць падведзены напрыканцы навучальнага года.

Пры ўсіх перавагах выкарыстання рыдараў эксперымент выявіў і некаторыя недахопы. У прыватнасці, чорна-белая выява не вельмі добра пасуе да навучання па тых прадметах, дзе колер — вельмі істотная рэч. Напрыклад, як без выкарыстання колеру вывучаць тую ж біялогію? Калі навучэнцы вывучаюць як па сасудах цячэ кроў, то звычайна на малюнках у папяровым падручніку яна паказана чырвоным і сінім колерамі, а на рыдары яна будзе шэрай. Хаця гэта могуць быць розныя адценні шэрага, але паспрабуй здагадайся, якому колеру адпавядае артэрыя, а якому — вена. Па-другое, рыдары марудна працуюць. Так, электронная кніга першапачаткова прызначана для няспешнага чытання, але на ўроку зусім іншы тэмп. Трэба жыва рэагаваць на заданне настаўніка, а рыдары не паспяваюць, трэба зрабіць паўзу, каб перайсці на пэўную старонку. Акрамя таго, карыстальнікаў не задавальняе таксама вялікая колькасць націскаў для ажыццяўлення элементарных функцый. Калі патрэбна адкрыць пэўную старонку, то трэба зрабіць 3-4 націскі: вярнуцца ў "меню", набраць нумар патрэбнай старонкі, пацвердзіць і пэўны час чакаць.

Таксама патрабуе аналізу і дадатковых даследаванняў успрыманне інфармацыі з электроннай кнігі. Навучэнцам эксперыментальнага класа і класаў, дзе не выкарыстоўваліся электронныя кнігі, быў прапанаваны мастацкі твор для чытання і тэсты на праверку засваення прачытанага. У выніку высветлілася, што тыя навучэнцы, якія чыталі мастацкія тэксты з электронных прыстасаванняў, напісалі тэсты па творах горш за тых, якія звярталіся да папяровых крыніц. Тыя, хто чытаў звычайную кнігу, мелі адзнакі 9-10 балаў, хто з рыдара — 6-7. Было відаць, што ўсе навучэнцы прачыталі тэкст, прычым хутчэй чыталася па рыдары, аднак — па дыяганалі. Тут, мабыць, спрацоўвае такая рэч, як спалучэнне зрокавай і маторнай (кінестэтычнай) памяці пры чытанні з папяровых носьбітаў, што паляпшае засваенне, а пры чытанні з экрана мы задзейнічаем толькі зрокавую памяць. Магчыма, лічыць І.М.Варакса, гэта справа звычкі, і праз некаторы час, калі выкарыстанне электронных кніг стане звычайнай справай, ужо не будзе адчувацца розніцы ва ўспрыманні інфармацыі. Пэўная нязручнасць існуе і са стварэннем пазнак пры чытанні тэксту. Паколькі ў рыдары адсутнічае клавіятура, то для таго, каб нешта занатаваць, патрэбна зрабіць шмат націскаў. І пакуль гэта робіш, губляецца сэнс таго, што робіш.

"Калі персанальныя электронныя прылады прыйдуць у школы, што абавязкова адбудзецца, мы павінны быць падрыхтаваны да гэтага і даць навучэнцам электроннае напаўненне, кантэнт, якім яны маглі б карыстацца, — адзначае І.М.Варакса. — Зараз у сістэме адукацыі, на жаль, не існуе вучэбнага кантэнту, аптымізаванага для выкарыстання ў рыдарах і планшэтах. Першы крок да стварэння такога напаўнення — электронныя версіі друкаваных падручнікаў у фармаце pdf, аднак гэты фармат не вельмі падыходзіць для выкарыстання ў мабільных прыладах. Сёння варта адаптаваць вучэбна-метадычныя комплексы, у тым ліку падручнікі па вучэбных прадметах, да фармату ePub з плаваючай вёрсткай, а таксама рыхтаваць усё новыя і новыя матэрыялы. Менавіта над гэтым і варта працаваць у найбліжэйшыя гады".

**Наталля КАЛЯДЗІЧ.**
*kaliadich@ng-press.by*
**Фота Алега ІГНАТОВІЧА.**

## Меркаванні

**Якія пытанні ўкаранення ІКТ у адукацыйны працэс сёння самыя актуальныя? Як ставяцца педагогі і бацькі да выкарыстання ў практыцы навучання персанальных электронных прылад?**

***Вольга Анатольеўна СЧАСНОВІЧ, настаўніца інфарматыкі Варатынскай сярэдняй школы Бабруйскага раёна Магілёўскай вобласці, фіналіст конкурсу "Настаўнік года-2006":***

— Як гэта ні парадаксальна гучыць, аднак актуальным па-ранейшаму застаецца аснашчэнне ўстаноў адукацыі камп'ютарнай тэхнікай (у рэспубліцы ёсць школы, дзе на 13-14 навучэнцаў — гэта палова класа — прыходзіцца 5-6 камп'ютараў). У гарадскіх школах адна з праблем — вялікая загружанасць кабінетаў інфармацыйных тэхналогій і недахоп мультымедыйных установак: калі настаўнікі, каб трапіць у кабінет інфарматыкі і правесці там урок, запісваюцца за месяц ці з-за загружанасці гэтага кабінета ўрокамі непасрэдна інфарматыкі ўвогуле не маюць туды доступу. Важным уяўляецца і фарміраванне ў нашых навучэнцаў культуры работы ў інтэрнэце.

Наконт эксперымента з персанальнымі электроннымі прыладамі. Маё глыбокае перакананне: калі гэта эксперымент, то давайце давядзём яго да лагічнага завяршэння, усё праверым, атрымаем рэальныя вынікі і пастараемся зрабіць аб'ектыўныя высновы! Асабіста я люблю папяровыя кнігі. Падабаецца мне пах друкарскай фарбы, шэлест новых старонак і ўвогуле цяжар кнігі ў руках. Аднак новае пакаленне — гэта дзеці камп'ютарнай тэхнікі, яны растуць з ёй і не ўяўляюць сябе без гэтага. А таму, лічу, час расставіць усё па сваіх месцах.

***Ірына Сяргееўна НІКАНАВА, намеснік дырэктара па вучэбна-метадычнай рабоце гімназіі № 1 Наваполацка:***

— Хочацца ўзняць пытанне недахопу фінансавых сродкаў і немагчымасці ў сувязі з гэтым своечасовага абнаўлення існуючай тэхнікі і набыцця новага абсталявання. Таксама сёння наспела неабходнасць увядзення ў штат установы адукацыі пасады сеткавага адміністратара, які б займаўся аднаўленнем сайта, устанаўліваў новыя праграмы і г.д.

Другі год у гімназіі рэалізоўваецца эксперыментальны праект па ўкараненні нэтбукаў. Узрасла матывацыя педагогаў і навучэнцаў. Павысілася кваліфікацыя настаўнікаў, значна пашыралася іх кампетэнтнасць. Назіраецца інтарэс бацькоў да новай мадэлі навучання. Педагогі, якія не ўдзельнічаюць у эксперыменце, таксама жадаюць уключыцца ў гэты працэс. Аднак, па нашым меркаванні, электронны падручнік не можа і не павінен замяніць папяровы.

***Ірына Мікалаеўна СКУРАТАВА, мама шасцікласніка:***

— Што б ні казарылі настаўнікі аб тым, што ІКТ у адукацыйным працэсе выкарыстоўваюцца ў поўнай ступені, практыка сведчыць пра адваротнае. Нават у гімназіях пры наяўнасці сучаснай тэхнікі ўрокі праводзяцца традыцыйна, як у савецкія часы: з крэйдай каля дошкі. Магу меркаваць па сваім дзіцяці-шасцікласніку, у якога з пачатку навучальнага года, акрамя як заняткаў на камп'ютары па інфарматыцы, ні разу на ўроках не быў задзейнічаны камп'ютарны клас, інтэрактыўная дошка, мультымедыйная прыстаўка і г.д. І прычына, па-першае, у непадрыхтаванасці большасці педагогаў-прадметнікаў да выкарыстання ІКТ на сваіх уроках. Па-другое, стрымлівае ўкараненне новых тэхналогій недастатковасць праграмных прадуктаў айчыннай вытворчасці па вучэбных прадметах. Так, педагогі самі ствараюць электроннае суправаджэнне для ўрокаў, аднак часта яно неадпаведнай якасці і патрабуе ўдасканалення.

Што тычыцца ўкаранення ў вучэбны працэс электронных персанальных прылад, то лічу, што гэта непазбежна адбудзецца. Ды і што дрэннага ў тым, калі ў партфелі дзіцяці замест трох-чатырох дапаможнікаў будзе адна электронная кніга ці планшэт? Але неабходна напоўніць гэтыя прылады зместам адукацыйнай накіраванасці.


Ю.У.Касталомава са сваімі навучэнцамі.

# Гаворыць настаўнік – загавораць і навучэнцы

**Мінулы год быў багаты на розныя мерапрыемствы для настаўнікаў замежнай мовы. Дапамогу і падтрымку настаўнікі-замежнікі адчувалі на ўсіх узроўнях. Вельмі актыўнымі былі абласныя інстытуты развіцця адукацыі, Акадэмія паслядыпломнай адукацыі, якія правялі шмат самых розных мерапрыемстваў. Але і педагогі не заставаліся ўбаку, а заяўлялі аб сабе новымі падыходамі, методыкамі ў навучанні замежнай мовы.**

Напрыклад, Віталь Валянцінавіч Пятроўскі, настаўнік англійскай мовы сярэдняй школы № 37 Гомеля, з'яўляецца распрацоўшчыкам дыскавага курсу па замежных мовах "Чароўны памочнік", які шырока выкарыстоўваецца настаўнікамі замежных моў Гомельскай вобласці.

"Гаворачы аб праблемах, варта адзначыць некаторую скаванасць дзяцей, боязь зрабіць памылку. На ўроках неабходна ствараць такія псіхалагічна камфортныя ўмовы для навучэнцаў, калі адчуванне страху за памылку будзе адсутнічаць поўнасцю. Не трэба тузаць дзяцей за кожны промах у гаворцы. Пісьменная мова выкрышталізуецца ў працэсе работы. Але спачатку — матывацыя да вывучэння мовы і псіхалагічна спрыяльныя ўмовы. Гэта першачарговая задача кожнага педагога", — адзначыў у інтэрв'ю Віталь Валянцінавіч.

Сёння настаўнік замежнай мовы выступае ў ролі арганізатара самастойнай актыўнай дзейнасці навучэнцаў, як кансультант і фасіліятар. І ён не проста перадае веды, а арганізуе навучанне, не толькі кантралюе вынікі вучэбнай дзейнасці навучэнца, а перш за ўсё ажыццяўляе дыягностыку іх дзейнасці, каб своечасова дапамагчы ліквідаваць цяжкасці і праблемы.

"Мая тэхналогія навучання французскай мове — гэта арганізацыя дзейнасці навучэнцаў па практычным прымяненні ведаў лексікі і граматыкі з апорай на моўны, асобасны, суб'ектыўны вопыт школьнікаў, іх творчыя здольнасці. Зараз гэта модна называць камунікатыўнай дзейнасцю. Я так працавала заўсёды. На мой погляд, гэта адна з лепшых тэхналогій, якая стварае ўмовы жывых зносін на замежнай мове", — лічыць Таццяна Эдуардаўна Лелес, настаўніца французскай мовы сярэдняй школы № 4 Рагачова імя В.С.Вялічкі.

Спецыфіка вучэбнага прадмета "Замежная мова" ў тым, што, будучы, як і ўсе моўныя прадметы, дзейнасным вучэбным прадметам, ён адрозніваецца ад іх тым, што школьнікі першапачаткова не валодаюць іншамоўнай маўленчай дзейнасцю і што авалоданне ёю ва ўмовах адсутнасці іншамоўнага асяроддзя і складае асноўную цяжкасць. Таму сэнс засваення замежнай мовы не толькі і не столькі ў авалоданні моўнымі і краіназнаўчымі ведамі, колькі ў авалоданні актыўнай іншамоўнай маўленчай дзейнасцю з выкарыстаннем гэтых ведаў.

"Я вучуся ўсё жыццё. А працуючы з дзецьмі, вучуся і ў іх такса-ма. Іх рэакцыя на мае пэўныя педагагічныя дзеянні з'яўляецца своеасаблівай лакмусавай паперкай правільнасці ходу маіх педагагічных думак.

Перш за ўсё на ўроку павінны быць зносіны. І гэтым зносінам можна навучыцца толькі гледзячы на настаўніка, які з'яўляецца ўзорам. Свае набытыя моўныя ўменні дзеці будуць параўноўваць з узроўнем свайго настаўніка. Атрымліваецца: гаворачы, мы гаворым", — адзначала Людміла Аляксандраўна Борына, настаўніца англійскай мовы гімназіі № 2 Гродна.

Каб падтрымліваць сябе як настаўніка ў тонусе, мая суразмоўца самаўдасканаленнем займаецца штодня. Па тэлебачанні яна глядзіць англамоўны канал Бі-бі-сі, пры падрыхтоўцы да ўрокаў звяртаецца да арыгінальнай англійскай вучэбнай літаратуры, а таксама прэсы (па магчымасці).

Вопыт Марыны Пятроўны Кароза, намесніка дырэктара па вучэбнай рабоце сярэдняй школы № 11 Гродна імя генерала арміі А.І.Антонава, сведчыць, што ключавыя кампетэнцыі на ўроку англійскай мовы дапамогуць сфарміраваць фільмы-праекты. Кожны фільм-праект, створаны настаўніцай разам з навучэнцамі, змяшчае відэаматэрыял двух узроўняў (больш лёгкі з субцітрамі і больш складаны), праекты-прэзентацыі навучэнцаў, асноўны лексічны матэрыял па тэме, заданні для праверкі ўспрымання і разумення англійскай мовы. Матэрыял, на якім пабудаваны фільмы-праекты, уяўляе сабой набор сюжэтных малюнкаў, прэзентацый, відэаматэрыялаў, а таксама заданняў для кантролю ўспрымання і разумення маўленчага матэрыялу.

А вось Юрый Віктаравіч Стулаў, старшыня праўлення Беларускай асацыяцыі выкладчыкаў англійскай мовы, загадчык кафедры замежнай літаратуры МДЛУ, заўважыў: "Настаўнік павінен быць тонкім псіхолагам, а гэта азначае, што да свайго ўрока ён павінен рыхтавацца вельмі сур'ёзна. Прыцягнуць ці пераключыць увагу можна самымі рознымі спосабамі. У прыватнасці, рознымі гукавымі прыстасаваннямі накшталт свістка ці трашчоткі. Здавалася б, выкарыстанне такіх прыстасаванняў на занятках з'яўляецца недарэчным, але менавіта яны іншым разам дапамагаюць стварыць неабходны настрой і своечасова пераключыць увагу".

Гаворачы пра тое, як трэба выпраўляць памылкі, каб, з аднаго боку, забяспечваць камунікацыю, а з другога — вучыць гаварыць без памылак, Юрый Віктаравіч адзначыў, што настаўнік для сябе павінен рэгістраваць усе моманты. Работа на занятках павінна быць як франтальнай, калі ўсе разам адказваюць на пытанні, перакладаюць, чытаюць, так і індывідуальнай, калі педагог з навучэнцам абмяркоўвае шляхі пазбаўлення ад нейкага тыпу памылак (здараецца, што навучэнец пэўны час можа рабіць адну і тую ж памылку, і каб выправіць яе, патрабуецца індывідуальная работа). Увогуле методыка выпраўлення памылкі залежыць ад яе характару. Калі настаўнік адчувае, што школьнік можа зрабіць памылку, то ён, канечне, павінен апярэдзіць сітуацыю: напрыклад, даць патрэбную форму слова да таго, як навучэнец яго агучыць.

У канцы хочацца выказаць сваю салідарнасць з Петрам Медзешам, сусветна вядомым навукоўцам, аўтарам шматлікіх падручнікаў па англійскай мове, намеснікам дзяржаўнага сакратара міністра адукацыі Венгрыі, прафесарам, які, выступаючы перад нашымі педагогамі, адзначыў, што выкладчык замежнай мовы, які не з'яўляецца яе носьбітам, — гэта лепшы педагог, бо ён ведае і разумее ўсе цяжкасці, з якімі сутыкаюцца пры вывучэнні замежнай мовы навучэнцы. Для іх ён мадэль, узор, бо сам некалі пачынаў вывучаць замежную мову з нуля. А ўлічваючы тое, што такі педагог сам выхадзец з асяроддзя навучэнцаў, ён выдатна разумее патрэбы сваіх выхаванцаў і з'яўляецца носьбітам іх роднай мовы.

**Вольга ДУБОЎСКАЯ.**
*dubowska@ng-press.by*

## Меркаванні

**Каб даведацца, у якім настроі і з якімі думкамі чакаюць экзамену па замежнай мове ў навучальных установах краіны, мы звярнуліся да тых прадстаўнікоў педагагічнай грамадскасці, якія найбольш зацікаўлены ў паспяховым правядзенні выпускнога экзамену.**

***Юлія Уладзіміраўна КАСТАЛОМАВА, настаўніца іспанскай мовы гімназіі № 2 Ваўкавыска:***

— Экзамен, як і любая іншая з'ява ў нашым жыцці, мае і станоўчы, і адмоўны бок. Выпускнога экзамену па замежнай мове мы чакаем з нецярпеннем і трывогай. Канечне, гімназіі адносна школ знаходзяцца ў больш выгадным становішчы, бо ў нас на вывучэнне замежнай мовы даецца больш гадзін. Нам лягчэй, але праблемы ўсё роўна існуюць.

Нягледзячы на ўсе метадычныя рэкамендацыі, не зусім зразумела, як жа тэхнічна арганізаваць экзамен: у якім парадку павінны адказваць навучэнцы? адразу ўсёй камісіі ці аднаму экзаменатару? навучэнцы павінны адразу выконваць аўдзіраванне, а пасля чытаць ці наадварот? Вы пісалі ўжо, што ў некаторых раёнах апрабавалі свае мадэлі здачы экзамену, але мне здаецца, што мы вынаходзім веласіпед. Калі мы ўсе здаём абавязковы выпускны экзамен, то яго арганізацыя і правядзенне павінны быць аднолькавымі па ўсёй краіне.

Што тычыцца падрыхтоўчых матэрыялаў, то, канечне, з'яўленне зборнікаў па падрыхтоўцы да экзамену — гэта своечасовая дапамога, але і тут узнікаюць пытанні: тэксты ў гэтых зборніках даюцца не раўназначныя. Безумоўна, вельмі цяжка падабраць усе тэксты аднолькавай складанасці, і складальнікі дапаможнікаў зрабілі вялікую работу. Тым не менш падобна на тое, што некаторыя былі ўзяты са зборнікаў для вышэйшай школы. Нават нашы самыя моцныя вучні, пераможцы алімпіяд адзначаюць, што працаваць з гэтымі тэкстамі няпроста.

Некаторыя пытанні выклікаюць і моўныя сітуацыі, бо можна задаць канкрэтнае пытанне, якое вывучаецца ў межах школьнага матэрыялу, а ёсць пытанні, адказы на якія патрабуюць разважання, аналізу. Умоўна: можна спытаць "Хто гатуе ежу ў тваёй сям'і?" і "Як навука ўздзейнічае на эканамічны патэнцыял краіны?". Зноў-такі, калі мы праводзім адзіны выпускны экзамен, то аб'ём пытання павінен уяўляць сабой абмежаванае выказванне. Ёсць моўныя сітуацыі, якія ўяўляюць маналагічнае выказванне, а ёсць простыя пытанні, якія з'яўляюцца асновай дыялога, і адказы на такія пытанні таксама простыя. І гэты момант ніяк не агаворваецца ў метадычных рэкамендацыях да выпускнога экзамену. А ў нас тут жа ўзнікае пытанне: ці павінны мы прытрымлівацца нейкага аб'ёму або глядзець па сітуацыі?

Увогуле ж выпускны экзамен мае і станоўчы бок, бо ён мабілізуе і навучэнцаў, і настаўнікаў і з'яўляецца дадатковай матывацыяй да больш глыбокага вывучэння замежнай мовы.

***Наталля Валер'еўна ВАЛЫНЕЦ, дырэктар сярэдняй школы № 14 Навапалацка:***

— Апошнія два гады падрыхтоўку да выпускнога экзамену па замежнай мове мы вядзём у межах трох напрамкаў. Першы — рыхтуем педагогаў. Нядаўна на базе горада сіламі Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта былі арганізаваны курсы па падрыхтоўцы настаўнікаў. І педагогі нашай школы прайшлі гэтае навучанне. Безумоўна, такая падрыхтоўка ажыццяўляецца і на мясцовым (непасрэдна ў сваёй навучальнай установе праводзяцца пасяджэнні настаўнікаў-прадметнікаў), і гарадскім (абмен вопытам з калегамі з іншых школ) узроўнях.

Другі напрамак — падрыхтоўка навучэнцаў. У мінулым годзе па рашэнні савета школы (разам з бацькамі) у дзясятым класе (цяпер гэта адзінаццаты) была праведзена своеасаблівая рэпетыцыя экзамену. Гэта было зроблена для таго, каб дзеці адчулі і зразумелі, што іх чакае, і каб атрымаць пэўны зрэз якасці ведаў школьнікаў. Па выніках гэтай работы мы вызначыліся з яшчэ адным напрамкам дзейнасці ў падрыхтоўцы да выпускнога экзамену — больш увагі падрыхтоўцы пачалі ўдзяляць на факультатыўных і дадатковых занятках. Хаця, канечне, увядзенне трэцяй гадзіны і дзяленне класа на тры групы таксама вельмі дапамагае вучыць дзяцей згодна з новай канцэпцыяй.

Трэці напрамак — дыдактычная і матэрыяльна-тэхнічная база. Я па-добраму зайздрошчу тым навучальным установам, дзе ёсць лінгафонныя кабінеты, але і нам грэх скардзіцца. Дзякуючы шэфам, у нас два выдатныя камп'ютарныя класы, у якіх, натуральна, праходзяць і ўрокі замежнай мовы. У гэтай сувязі тэхнічны бок выпускнога экзамену ў нас будзе забяспечаны.

Канечне, калегі з гімназій знаходзяцца ў больш выйгрышнай сітуацыі, але і ў нас створаны добрыя ўмовы для вывучэння замежнай мовы: тры гадзіны ў тыдзень, дзяленне класа на тры падгрупы, факультатывы, вопытныя настаўнікі. І мы можам даць сваім навучэнцам столькі гадзін, колькі дапушчальна ў межах максімальнай нагрузкі, узгодненай з Міністэрствам аховы здароўя, і столькі, колькі па сіле навучэнцу ўзяць самому.

Калі старшакласнік матываваны і хоча здаць экзамен і нават ЦТ па замежнай мове, то ў нашай школе для гэтага створаны ўсе ўмовы. Дарэчы, у мінулым годзе 9 нашых выпускнікоў здавалі ЦТ па англійскай мове. Максімальны бал быў 87, а мінімальны — 15, сярэдні — больш за 40. Лічу, што гэта добры вынік. Хаця, канечне, на думку педагогаў, падрыхтоўка да выпускнога экзамену і да здачы тэсціравання розная. І ці не будзе ўсё гэта дадатковай нагрузкай? Час пакажа.

***Таццяна Васільеўна ДУБРОВА, метадыст аддзела адукацыі Мазырскага райвыканкама:***

— Калі ў мінулым годзе з'явіўся праект метадычных рэкамендацый па арганізацыі і правядзенні экзамену па замежнай мове, то працаваць у рэчышчы падрыхтоўкі стала прасцей. Але нягледзячы на тое, што экзамен не раз інсцэніраваўся на пасяджэннях метадычнага аб'яднання, на курсах павышэння кваліфікацыі, некаторыя настаўнікі яшчэ і зараз яго чакаюць з хваляваннем. Разам з тым наш аддзел адукацыі тлумачальную работу па выпускным экзамене вядзе на ўсіх узроўнях: на мясцовым тэлебачанні, у газеце, школах, на пасяджэннях метадычных аб'яднанняў.

На гэты момант настаўнікі кожную чвэрць праводзяць вучэбна-дзелавую гульню, свайго роду міні-экзамен, па замежнай мове. Гэта адбываецца на стымулюючых або на факультатыўных занятках і робіцца ў першую чаргу для таго, каб максімальна наблізіць адзінаццацікласніка да ўмоў экзамену. Безумоўна, такія гульні праводзяцца выключна па жаданні дзяцей і настаўнікаў. Але інсцэніроўкі выпускнога экзамену карысныя яшчэ і тым, што дапамаглі нам выпрацаваць алгарытм правядзення экзамену. Мы вызначыліся з чарговасцю экзаменацыйных этапаў і колькасцю навучэнцаў, якія могуць адначасова знаходзіцца ў кабінеце (для некаторых аптымальна 4 чалавекі, для іншых — 3).

Яшчэ ўзнікаюць пытанні па кантрольна-ацэначнай дзейнасці вынікаў выпускнога экзамену, ёсць пытанні па фарміраванні прыёмных камісій у сельскіх школах. Калі, напрыклад, там працуе адзін настаўнік-"замежнік", то хто павінен вырашаць праблему арганізацыі камісіі: аддзел адукацыі, які накіруе туды педагогаў з іншых навучальных устаноў, ці дырэктар школы, які патэлефануе свайму калегу і папросіць дапамогі? Мы чакаем дадатковага пакета дакументаў ад міністэрства па арганізацыі і правядзенні абавязковага выпускнога экзамену па замежных мовах. Мяркуецца, што ён з'явіцца ў красавіку, і мы спадзяёмся, што знойдзем там адказы на ўсе свае пытанні.

А пакуль рыхтуемся, выкарыстоўваючы ўсе рэзервы і магчымасці. Нават падрыхтавалі свой зборнік па падрыхтоўцы да экзамену. Ён адрасаваны навучэнцам, быў створаны на аснове вопыту настаўнікаў раёна і ўключае тэксты і матэрыялы для аўдзіравання на дыску. Вельмі задаволены зборнікамі па падрыхтоўцы, што створаны спецыялістамі МДЛУ. Яшчэ ў навучальных установах раёна дзейнічае 13 лінгафонных кабінетаў, ёсць кансультацыйныя пункты, таму на правядзенне экзамену педагогі ў прынцыпе настроены.

# Стварыць здаровую канкурэнцыю паміж дашкольнымі ўстановамі

**У сістэме дашкольнай адукацыі краіны ў апошні час адбываюцца актыўныя пераўтварэнні: ствараюцца новыя тыпы, віды і профілі дашкольных устаноў (садаўскіх груп), якія дазваляюць у значнай ступені задаволіць попыт бацькоў і рэалізаваць правы дзяцей на атрыманне даступнай і якаснай дашкольнай адукацыі.**

## Павялічыць ахоп дашкольнай адукацыяй на сяле

Гезгалаўскі яслі-сад Дзятлаўскага раёна на працягу апошніх трох гадоў з'яўляўся інавацыйнай пляцоўкай Міністэрства адукацыі, педагагічны калектыў прымаў удзел у праекце "Укараненне мадэлі кароткачасовага знаходжання дзяцей у дашкольнай установе як новай формы адукацыі". У выніку інавацыйнай дзейнасці сада павялічыўся ахоп дашкольнай адукацыяй дзяцей рэгіёна. Змяніліся адносіны бацькоў да дашкольнай установы, павысіўся яе аўтарытэт. Поспехам можна лічыць і тое, што многія бацькі перавялі сваіх дзяцей з груп кароткачасовага знаходжання ў групы на пастаяннай аснове.

"Адкрыццё груп кароткачасовага знаходжання на базе нашага сада было выклікана перш за ўсё тым, што ў рэгіёне 27% дзяцей ад 1 да 6 гадоў не наведвалі дашкольныя ўстановы, — адзначае загадчык Гезгалаўскага ясляў-сада Святлана Рыгораўна Гурская. — Асноўныя прычыны гэтага — у матэрыяльных цяжкасцях некаторых сем'яў, у стане здароўя дзяцей (алергічныя захворванні), ёсць сярод бацькоў і тыя, хто аддае перавагу сямейнаму выхаванню. У той жа час усе яны былі не супраць дапамогі педагогаў. Удзел сада ў інавацыйным праекце стаў рашэннем гэтых праблем".

Ва ўстанове былі адкрыты групы кароткачасовага знаходжання "Развіццё" для дзяцей 3—6 гадоў, выхаванцы сталі наведваць іх тры разы на тыдзень (у панядзелак, сераду, пятніцу) з 9.00 да 12.00 гадзін. Была створана адаптацыйная група "Малышка" для дзяцей 1—3 гадоў, у якой два разы на тыдзень (па тры гадзіны ў дзень) дзеці займаюцца разам з бацькамі.

У пачатку работы па праекце педагогі сутыкнуліся з некаторымі цяжкасцямі. Яны спрабавалі выканаць усе патрабаванні праграмы за кароткі час знаходжання дзяцей у садзе, што прыводзіла да перагрузкі малышоў. Потым выхавальнікі перайшлі да інтэграцыі ведаў. Азнаямленню з мастацкай літаратурай, развіццю маўлення не прысвячаліся асобныя заняткі, гэтыя віды дзейнасці рэалізоўваліся ў агульным працэсе разам з іншымі. Частка заняткаў па фізічным выхаванні і заняткі пазнавальна-маўленчага цыкла былі ўключаны ў час прагулак. Назіраючы за работай педагогаў, бацькі навучыліся пэўным прыёмам узаемадзеяння з дзецьмі, таму і заняткі ў дамашніх умовах, якія яны праводзілі, былі карыснымі. У групах кароткачасовага наведвання асаблівая ўвага ўдзялялася падрыхтоўцы дзяцей да школы. Педагогі ўлічвалі і тое, што ў групу на працягу навучальнага года паступаюць новыя дзеці. Таму заняткі планаваліся такім чынам, каб дзіця, якое прыйшло, магло без праблем у іх уключыцца.

## Расце попыт на групы на аснове самаакупнасці

Першая група на аснове самаакупнасці адкрылася ў нашай краіне ў верасні 2003 года ў яслях-садзе № 532 ААТ "Гарызонт" (Мінск). З верасня 2012 года ва ўстанове пачала працаваць другая такая група. Аб гэтым паведаміла дырэктар комплексу ДДУ ААТ "Кіруючая кампанія холдынга "Гарызонт" Алена Генадзьеўна Рэйшаль. Ініцыятарам адкрыцця групы на аснове самаакупнасці стаў генеральны дырэктар прадпрыемства Ю.І.Прадко. Папярэдне быў вывучаны попыт бацькоў на прыватныя дашкольныя ўстановы ў сталіцы. Дашкольная ўстанова для арганізацыі такой групы абрана невыпадкова. Былі ўлічаны яе матэрыяльная забяспечанасць, месца размяшчэння, запатрабаванасць у бацькоў. Усе клопаты, якія ўзніклі пры адкрыцці групы, узяла на сябе загадчык сада Алена Міхайлаўна Варвашэня.

"Групы на аснове самаакупнасці зняты з бюджэтнага фінансавання, — адзначыла Алена Генадзьеўна. — Бацькі аплачваюць усе іх выдаткі — камунальныя паслугі, заработную плату персаналу, харчаванне дзяцей, адлічэнні на мэблю, посуд, мяккі інвентар, цацкі, вучэбна-метадычныя дапаможнікі і г.д. З бацькамі заключаны дагавор, на рукі ім выдадзена калькуляцыя. Па стане на 1 студзеня 2013 года плата за знаходжанне аднаго дзіцяці ў такой групе складае 3 мільёны рублёў у месяц".



У чым адметнасць платных груп? Тут працуюць вопытныя педагогі: у першай палове дня — два выхавальнікі і памочнік выхавальніка, у другой — выхавальнік і вузкія спецыялісты. Работа з дзецьмі вядзецца па падгрупах (у кожнай з іх 5—7 дзяцей), што дазваляе ўдзяліць увагу кожнаму дзіцяці. Дадатковая праводзяцца заняткі па навучанні выхаванцаў замежнай мове, бісерапляценню і іншыя. Дзеці наведваюць і басейн. У бацькоў ёсць магчымасць у любы час папрысутнічаць у групе і паўдзельнічаць у адукацыйным працэсе, выказаць свае прапановы па яго ўдасканаленні. Бацькі задаволены, што групы на аснове самаакупнасці рознаўзроставыя і яны могуць прыводзіць у іх і малодшых, і старэйшых дзяцей. Вітаецца і тое, што ў групе не больш як 15 выхаванцаў. Харчаванне дзяцей пяціразовае і арганізавана па нормах санаторнай дашкольнай установы. І бацькі гатовы плаціць за адукацыю сваіх дзяцей, галоўнае — каб яна адпавядала іх высокім патрабаванням.

**Надзея ЦЕРАХАВА.**
*terekhova@ng-press.by*

## Меркаванні

**Мы правялі апытанне кіраўнікоў дашкольных устаноў наконт таго, якія праблемы існуюць сёння ў дашкольнай адукацыі.**

***Таццяна Юр'еўна ШВЯЦОВА, загадчык ДЦРД № 1 Магілёва:***

— Адказнасць за навучанне і выхаванне дзяцей павінны падзяляць паміж сабой дзяржава і бацькі. Аднак у бацькоў іншы раз праяўляюцца спажывецкія адносіны да таго, што прапаноўвае дзяржава. Яны, шчыра скажам, не прывыклі плаціць. Папячыцельскія саветы, якія ствараюцца пры дашкольных установах, дзейнічаюць на прынцыпах добраахвотнасці, яны разлічаны толькі на свядомых бацькоў. Дашкольныя ўстановы Магілёва неаднойчы наведвалі замежныя дэлегацыі, неяк і ў наш цэнтр завіталі прадстаўнікі Германіі. Яны былі здзіўлены невялікім памерам платы, якую ўносяць бацькі за магчымасць, прадастаўленую іх дзіцяці, — наведваць цэнтр на працягу дня і атрымліваць у ім усе адукацыйныя паслугі, у тым ліку і паўнацэннае харчаванне. Нават платныя гурткі, якія арганізоўваюць педагогі ўстановы, маюць нізкую рэнтабельнасць. У развітых краінах не кожная сям'я можа дазволіць сабе адправіць дзіця на цэлы дзень у сад. Аднак там развітая сетка дзіцячых садоў і яны разлічаны са спажыўцоў з розным узроўнем даходаў. За мяжой існуе дыферэнцаваны падыход да аплаты за паслугі, кожная з якіх мае свой кошт (магчымасць хадзіць у басейн каштуе столькі, карыстанне пясочніцай — столькі і г.д.). На мой погляд, мы таксама павінны ісці па шляху дыферэнцыяцыі аплаты за дашкольныя ўстановы. Гэта, дарэчы, стане адным са шляхоў павышэння заробку педагагічных работнікаў. Калі бацькі выбіраюць для свайго малыша не звычайны сад, а дашкольны цэнтр развіцця дзіцяці, які вылучаецца высокім узроўнем адукацыйных паслуг, значыць, і аплата павінна быць большай. Асобным установам можна пайсці па шляху стварэння груп на аснове самаакупнасці, якія будуць улічваць розныя бацькоўскія запыты і г.д. Гэта будзе стымуляваць педагагічныя калектывы да самаразвіцця, да барацьбы за свайго спажыўца.

Яшчэ адна праблема нашай сістэмы, якую б хацелася агучыць, — адток маладых кадраў. Яны адпрацоўваюць прызначаны тэрмін пасля заканчэння ўніверсітэта і знаходзяць іншую работу. Прычына гэтага — у вялікай эмацыянальнай нагрузцы, якой патрабуе работа з дзецьмі, той адказнасці за іх жыццё і здароўе, якую нясуць педагогі, прытым што памер заробку выхавальніка несувымерны з цяжарам адказнасці.

У сады часам ідуць працаваць настаўнікі, і яны трансліруюць на дашкольнікаў школьныя методыкі і тэхналогіі, што таксама непрымальна.

Наступная праблема — захапленне многіх бацькоў ранняе развіццём і навучаннем дзяцей. Яны часта забываюць аб тым, што асноўны від дзейнасці, які дае дзіцяці развіццё, — гэта гульня, таму ўсё навучанне павінна будавацца на гульнёвых метадах. Задача ўстановы — стварыць адпаведнае гульнёвае асяроддзе для таго, каб дзеці маглі паўнацэнна гуляць і развівацца.

***Наталля Іванаўна ДЗЕРГАЧОВА, загадчык Чысцінскага дзіцячага ясляў-сада № 2 Маладзечанскага раёна:***

— У пасёлку Чысць высокая нараджальнасць і высокая запатрабаванасць дашкольнай адукацыі. Два дзіцячыя сады, якія тут працуюць, перапоўнены. Але гэта не ўплывае адмоўна на якасць адукацыйных паслуг. Толькі крыху стрымана мы ў плане развіцця тых адукацыйных паслуг, якія патрабуюць дадатковых плошчаў. Удзел і перамога ў рэспубліканскім конкурсе на лепшую дашкольную ўстанову года ўзнялі прэстыж нашага сада. Мы ўдзячны журы за такую высокую ацэнку і гатовы старанна працаваць і далей, ствараць камфортныя ўмовы для дзяцей, укараняць, згодна з запытамі бацькоў, новыя формы адукацыі, развіваць платныя паслугі.

Мяне як кіраўніка цікавіць і клапоціць сёння ўкараненне інфармацыйных тэхналогій у адукацыйны працэс сельскіх дашкольных устаноў, каб кожны педагог мог асвойваць і выкарыстоўваць у сваёй рабоце новыя праграмныя прадукты. Асаблівую важнасць для нас уяўляе электронная сістэма арганізацыі харчавання (у гарадскіх садах ідзе яе апрабацыя) у сувязі з тым, што ў дашкольных установах цяпер няма стаўкі медсястры па дыетхарчаванні.

Хвалюе і тое, што дзеці дашкольнага ўзросту амаль не валодаюць беларускай моваю. Каб выправіць такую сітуацыю, у нашай установе прыкладаецца шмат намаганняў: выхаваўчыя мерапрыемствы праходзяць на роднай мове, дзеці развучваюць беларускія гульні, у міні-музеі створаны этнапакой, дзе ладзяцца народныя святы.

Пытанне бяспекі дзяцей у сельскай мясцовасці надзвычай актуальнае. Малышы часам застаюцца без нагляду дарослых, што прыводзіць да трагедый, нават да гібелі дзяцей. Дашкольнікі часцей застаюцца адны летам, калі бацькі працуюць з раніцы да позняга вечара. Каб папярэдзіць небяспечныя сітуацыі, кіраўнікам дашкольных устаноў трэба задумацца над стварэннем кругласутачных груп у тых населеных пунктах, дзе гэта больш за ўсё неабходна.

***Наталля Віктараўна ЗАЕВА, загадчык Холмецкага ясляў-сада Рэчыцкага раёна:***

— Адна з асноўных праблем, якую трэба вырашаць у сельскай мясцовасці — рэарганізацыя маленькіх дзіцячых садоў, асабліва тых, што знаходзяцца ў дрэнных умовах. Гэты працэс ужо ідзе ў нашым раёне. У маленькіх дзіцячых садах, як правіла, групы рознаўзроставыя, таму ўдзяліць належную ўвагу дзецям, згодна з іх узростам, складана. Трэба далучаць маленькія дзіцячыя сады да вялікіх, дзе створаны лепшыя ўмовы, працуюць усе спецыялісты, а значыць, і падрыхтоўка дзяцей будзе весціся на высокім узроўні.

Праблема, уласцівая сельскім садам, — недахоп маладых спецыялістаў, асабліва музычных кіраўнікоў, кіраўнікоў фізвыхавання. Прапаноўваю, як адно з выйсцяў, праводзіць падрыхтоўку дашкольных педагогаў у раённых педагагічных каледжах (не ўсюды яна вядзецца). Для Рэчыцкага раёна гэтае пытанне актуальнае.

# Набыць прафесію і пропуск у дарослае жыццё

**Аб праблемах адаптацыі выпускнікоў дапаможных інтэрнатных устаноў да соцыуму гаворыцца шмат. Пасля заканчэння школы або прафесійнага вучылішча яны не заўсёды могуць самастойна працаўладкавацца і ўтрымацца на рабоце без чыёй-небудзь падтрымкі, губляюць жыллё або не даглядаюць за ім, часам не ў стане стварыць сям'ю. Маладым людзям неабходна садзейнічанне і дапамога. У Капыльскай дапаможнай школе-інтэрнаце існуе свая мадэль падрыхтоўкі выпускнікоў да самастойнага жыцця, выпрацаваны падыходы да патранатнага суправаджэння.**

"У нашай установе створаны ўсе належныя ўмовы для падрыхтоўкі дзяцей да будучага самастойнага жыцця, — гаворыць намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце Аляксандр Іванавіч Нікалаевіч, кіраўнік праекта самастойнага пражывання. — Пры падтрымцы галандскага дабрачыннага фонду "Дзіцячыя дамы Беларусі" і ўпраўлення адукацыі Мінаблвыканкама ў Капыльскай школе-інтэрнаце з 2006 года працуе аграсацыяпраект, у межах якога навучэнцы атрымліваюць сельскагаспадарчую адукацыю і набываюць адпаведныя прафесіі, пасля чаго працуюць на сельгаспрадпрыемстве, якое створана пры ўстанове.



З 2008 года ў школе пачала дзейнічаць рэспубліканская эксперыментальная пляцоўка "Апрабацыя мадэлі самастойнага пражывання выпускнікоў школы-інтэрната". Пры яе ўкараненні спачатку быў выкарыстаны дом у вёсцы Калінаўка, набыты за кошт фонду. Пражываючы ў ім самастойна, старшакласнікі вучыліся весці гаспадарку, наладжваць зносіны, арганізоўваць свой адпачынак. Дапамагалі ім у гэтым педагогі".

З верасня 2010 года пачата работа па рэалізацыі праекта "Кватэра — самастойнае пражыванне". На бюджэтныя сродкі і сродкі фонду побач з вучэбным корпусам інтэрната быў пабудаваны камфартабельны двухпавярховы дом для самастойнага пражывання навучэнцаў, пакоі ў ім разлічаны на 3-4 чалавекі, прадугледжана пражыванне ў доме педагога. У працяг праекта пабудаваны яшчэ адзін дом — чатырохкватэрны (у кожнай кватэры — па 2 навучэнцы, ёсць нават кватэра для аднаго чалавека), маладыя людзі жывуць тут таксама пад патранатам педагога. У хуткім часе будзе здадзены трэці дом, у якім паселяцца выхаванцы, якія ў поўнай меры адаптаваліся да самастойнага жыцця. Дом будзе нагадваць звычайны, вясковы, для яго ацяплення будуць выкарыстоўвацца мясцовыя віды паліва, якое навучэнцы нарыхтуюць самі, побач з домам прадугледжаны калодзеж.

У дамах самастойнага пражывання селяць навучэнцаў, якія пакінуць інтэрнат праз некалькі гадоў, у іх праходзяць курсы адаптацыі (па месяцы) выпускнікі 9-10 класаў. А ў дом, што знаходзіцца ў вёсцы Калінаўка, выпускнік, які не змог уладкавацца ў жыцці, можа вярнуцца ў любы момант. Яму заўсёды акажуць дапамогу.

"Падчас рэалізацыі праекта самастойнага пражывання па ўсіх пытаннях, што ўзнікалі, нас кансультавалі сябры з Галандыі, — падкрэслівае дырэктар школы Марыя Іосіфаўна Крэпская. — Хутка споўніцца 10 гадоў, як фонд супрацоўнічае са школай. Старшыня фонду Марыя Элізабэт Схраверус прапанавала нам прыняць удзел у новым праекце па наладжванні супрацоўніцтва паміж трыма дапаможнымі школамі — Гарадзейскай, Рудзенскай і Капыльскай з мэтай дапамогі дзецям у атрыманні той прафесіі, якая ім даспадобы. Напрыклад, навучэнец нашай школы марыць аб будаўнічай спецыяльнасці, але мы не можам яму ў гэтым дапамагчы. Затое пасля 10 класа ў нас будзе магчымасць перавесці яго ў Рудзенскую школу, дзе навучэнцы атрымліваюць адпаведныя навыкі. Марыя Элізабэт працуе і над праектам "Сем школ Беларусі". Кожная ўстанова, якая ўвойдзе ў гэты спіс, атрымае сродкі для набыцця вучэбнага матэрыялу па тых кірунках працоўнага навучання, якія ў ёй развіваюцца".

"Мы вывучаем акружэнне, у якое могуць трапіць нашы выпускнікі, — адзначае Аляксандр Іванавіч. — Звязваемся са сваякамі, імкнёмся аднавіць роднасныя сувязі. Наладжваем кантакты з кіраўнікамі ўстаноў, куды дзеці будуць уладкоўвацца на работу, пасля даведваемся, як яны спраўляюцца са сваімі абавязкамі. У асноўным выпускнікі працуюць садаводамі, агароднікамі, жывёлаводамі на жывёлагадоўчых комплексах. Як правіла, месца работы знаходзіцца побач з жыллём, якое судом замацавана за нашым выпускніком. Калі раптам у маладых людзей нешта не атрымліваецца, ім не ўдаецца знайсці сябе ў жыцці, — вывучаецца прычына. Яна можа быць у неспрыяльным акружэнні — дзіця вярнулася ў сям'ю, дзе пануюць дрэнныя звычкі. У такім выпадку выпускнік ізалюецца ад сваякоў і яму абавязкова прадастаўляецца сацыяльнае жыллё. Ёсць дзеці, якія пасля школы працягваюць навучанне ў ПТВ (у Праўдзінску, Чэрвені, Барысаве і Капылі) і атрымліваюць будаўнічыя спецыяльнасці. Многія з іх тэлефануюць выхавальнікам, расказваюць пра сваё жыццё, прыязджаюць у школу нават з сем'ямі, наведваюць сваіх малодшых братоў і сясцёр, якія вучацца ў нашай установе. Нядаўна прыязджаў адзін выпускнік і вельмі парадаваў усіх педагогаў, расказаў, што працуе жывёлаводам, набыў дом, абсталяваў яго, трымае немалую гаспадарку".

**Надзея ЦЕРАХАВА.**

*terekhova@ng-press.by*

## Меркаванні

**Якія праблемы непакояць сёння прадстаўнікоў сістэмы спецыяльнай адукацыі і бацькоў і што пажадана змяніць у ёй?**

### Стварыць камфортныя ўмовы для кожнага

***Алена Сталіеўна ВАРАБ'ЁВА, старшыня савета кіраўнікоў устаноў спецыяльнай адукацыі дырэктар Гродзенскай спецыяльнай агульнаадукацыйнай школы-інтэрната для дзяцей з парушэннямі зроку:***

— Пры планаванні работы нашага савета, створанага нядаўна, мы перш за ўсё засяроджваем увагу на аналізе практычнага прымянення нарматыўных дакументаў у сферы спецыяльнай адукацыі. Наша краіна па многіх пытаннях знаходзіцца на перадавых пазіцыях у галіне адукацыі дзяцей з асаблівасцямі ў развіцці, але існуюць і некаторыя праблемы. Непакоіць тое, што ва ўстановах сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі амаль не створаны ўмовы для навучання дзяцей з асаблівасцямі (перш за ўсё гэта тычыцца навучэнцаў з парушэннямі апорна-рухальнага апарату, з парушэннямі зроку і слыху). Дзецям прыходзіцца прыстасоўвацца да тых умоў, якія існуюць ва ўстановах, хаця павінна быць наадварот. Трэба забяспечыць беспераШкоднае перамяшчэнне па ўстанове навучэнцаў з парушэннямі апорна-рухальнага апарату. Выкладчыкам неабходна ў поўнай меры авалодаць спецыфікай работы з асаблівымі дзецьмі (адпаведнай методыкай, жэставым маўленнем, сістэмай Брайля). Многія навучэнцы запісваюць лекцыі на дыктафон, і для іх гэта пакуль з'яўляецца адзінай крыніцай атрымання ведаў. Ёсць камп'ютары, але на іх не ўсталяваны спецыяльныя праграмы, якія агучваюць інфармацыю, што навучэнцы могуць атрымаць з інтэрнэта. Даволі цяжка ідзе працэс працаўладкавання выпускнікоў. Што тычыцца выпускнікоў нашай школы, то многія з іх паступаюць у медыцынскі каледж, куды прымаюць дзяцей з парушэннямі зроку. У асноўным яны атрымліваюць спецыяльнасць "Тэхнік-масажыст". Таксама яна паступаюць у музычны каледж, ва УВА. Але вучыцца невідушчым дзецям у такіх установах вельмі цяжка.

Яшчэ адна праблема, з якой сутыкнуліся ўстановы спецыяльнай адукацыі, — жорсткія ўмовы пры атрыманні ліцэнзіі на медыцынскую дзейнасць. Перш за ўсё ад устаноў патрабуецца наяўнасць урача першай катэгорыі. Калі ўлічыць, што многія з іх размешчаны ў раённых цэнтрах, дзе такі спецыяліст можа быць усяго адзін у раёне, то гэтае патрабаванне амаль невыканальнае.

Наступнае пытанне тычыцца новага заканадаўства па прафесійным страхаванні. Згодна з ім, не ўсе нашы педагогі цяпер змогуць пайсці на пенсію па выслузе гадоў (у 50, пасля таго як адпрацавалі 25 гадоў у сістэме). З'явіліся дадатковыя патрабаванні, якія цяжка выканаць, — павінны быць адпаведнымі напаўняльнасць класаў, дзе працуе педагог, і колькасць гадзін. Навучэнцаў у класах у нас няшмат, не заўсёды ёсць і дадатковыя гадзіны ў педагога. Але работа ў спецыяльнай установе не становіцца ад гэтага менш складанай і прафесіяналізму ад педагога патрабуецца вельмі многа.

### Інклюзія для аўцят

***Таццяна Георгіеўна ЯКАЎЛЕВА, старшыня савета Міжнароднага дабрачыннага грамадскага аб'яднання "Дзеці. Аўтызм. Бацькі":***

— Першая наша праблема звязана з выяўленнем аўтызму. Часам бацькі не разумеюць, што адбываецца з іх дзіцем, лічаць, што яно перарасце свае асаблівасці. Міжнародная практыка паказвае, што з аўцятамі трэба пачынаць работу з 1,5 года. У большасці ж выпадкаў дыягназ "аўтызм" у Мінску і некаторых абласных гарадах ставяць дзецям ад 3 да 5 гадоў. У райцэнтрах ёсць выпадкі, калі і ў 9 гадоў гэты дыягназ дзіцяці альбо не выстаўляецца, альбо вуалюецца пад выглядам шызафрэніі, затрымкі ў развіцці.

Наступнае праблемнае пытанне — адсутнасць міжведамаснай узгодненасці паміж медыкамі, педагогамі і сацыяльнымі работнікамі (апошніх у нашым жыцці ўвогуле не існуе). Нянькy для дзіцяці з аўтызмам не знойдзеш, а маці працаваць трэба, бо таты, як правіла, пакідаюць такія сем'і.

Не існуе спецыяльных садоў і школ для дзяцей з аўтызмам. Іх далучаюць да дзяцей з разумовай адсталасцю, хаця ў кожнага парушэння свая спецыфіка і асноўнае, што пакутуе пры аўтызме, — працэс камунікатыўнасці. Але пры гэтым аўцяты могуць станавіцца дактарамі навук, вядомымі музыкантамі, мастакамі, праграмістамі.

Ва ўмовах інтэграцыі (у масавых школах), на жаль, не ствараюцца спецыяльныя ўмовы для дзяцей з асаблівасцямі — няма дасведчаных спецыялістаў, якія валодаюць методыкай работы з такімі дзецьмі. Праблемы ў паводзінах дзяцей часта прапаноўваюць вырашаць з дапамогай медыкаментаў. Хаця ў вядучых методыках рэкамендуецца аказваць на аўцят патрэбнае псіхолага-педагагічнае ўздзеянне. Лекі толькі ўзмацняюць праблемы.

Сацыялізаваць дзіця з аўтызмам можна ўключыўшы яго ў здаровае асяроддзе, лепш за ўсё яго аднагодкаў. Аднак і да гэтага аўцёнка неабходна падрыхтаваць. Дашкольнікам рэкамендавана 20 — 60 гадзін у тыдзень псіхолага-педагагічнай карэкцыйнай работы. Калі такое дзіця да 7 гадоў паступае ў клас да здаровых равеснікаў, то пры гэтым яно павінна мець суправаджальніка, які дапамагае як настаўніку, так і самому аўцёнку працаваць у класе. Школьнікі з аўтызмам павінны таксама атрымліваць ва ўмовах школы псіхолага-педагагічную дапамогу. Задача сацыяльнага педагога ўстановы адукацыі арганізоўваць урокі дабрыні і сяброўства, на якіх дзеці будуць вучыцца правільным адносінам да свайго асаблівага аднакласніка (аднагрупніка — у садзе).

МДГА "Дзеці. Аўтызм. Бацькі" супрацоўнічае сёння з камітэтам па адукацыі Мінгарвыканкама ў вырашэнні пытання адкрыцця рэсурснага цэнтра па аўтызме (з падтрымкай Міжнароднага дзіцячага фонду). Аб'яднанне распрацоўвае праект адкрыцця інклюзіўнага навучання для аўцят у адной са школ Мінска, а таксама абмяркоўвае з прадстаўнікамі міністэрстваў аховы здароўя, адукацыі, працы і сацыяльнай абароны праект міжведамаснага ўзгаднення дапамогі дзецям з аўтызмам з падтрымкай ЮНІСЕФ.

# Конкурсы, памножаныя на конкурсы...



**Праблема перанасычанасці выхаваўчага працэсу конкурсамі, акцыямі не новая. Хоць яна перыядычна і ўзнімаецца на ўзроўні міністэрства, упраўленняў і аддзелаў адукацыі, аднак вырашаецца марудна. Дзе ж схаваны корань праблемы? Што зрабіць для таго, каб настаўнікі ахвотна адгукаліся на прапановы паўдзельнічаць у чарговым конкурсе?**

Выхаванне ў навучэнцаў грамадзянска-патрыятычных якасцей, працавітасці, прывіццё ім духоўна-маральных каштоўнасцей, здаровага ладу жыцця — галоўныя задачы, што стаяць перад установамі адукацыі. Вырашаюцца яны з дапамогай шматлікіх методык, шляхам правядзення разнастайных мерапрыемстваў. Важная роля адводзіцца конкурсам і акцыям, накіраваным на пашырэнне ведаў навучэнцаў пра родны край, развіццё іх творчых здольнасцей, умацаванне здароўя. Гэта ўсё добра, аднак, як паказвае вопыт, такія конкурсы могуць прыносіць не толькі карысць. Калі настаўнік не па сваёй добрай волі становіцца канкурсантам, калі яшчэ даводзіцца пісаць цэлы стос справаздач, то ўдзел у мерапрыемствах (безумоўна, важных і неабходных) можа выклікаць толькі абыякавасць.

Падчас журналісцкіх камандзіровак неаднаразова даводзілася станавіцца сведкам такой сітуацыі: педагог-краязнаўца вырашыў разам з выхаванцамі прыняць удзел у конкурсе вядомай рэспубліканскай акцыі навучэнскай моладзі "Жыву ў Беларусі і тым ганаруся". Ужо пачалася работа, ладзяцца вандроўкі па родным краі, вольны час настаўнік прысвячае апрацоўцы аповедаў старажылаў, пошуку прадметаў даўніны, кансультаванню вучняў па правільным напісанні і афармленні даследчай работы. І вось у самы разгар такой дзейнасці педагогу прапаноўваецца паралельна ўдзельнічаць яшчэ ў адным конкурсе.

Павелічэнне колькасці мерапрыемстваў, некаторыя з якіх часта дубліруюцца, непасрэдным чынам уплывае на якасць іх арганізацыі і правядзення. Не сакрэт, што конкурсы часам спускаюцца на школу за 2-3 дні да пачатку іх правядзення, нярэдка ўзнікае і нескаардынаванасць розных упраўленняў і ведамстваў у гэтым пытанні. І як вынік у маі 2012 года адначасова праводзіўся тыдзень турызму, тыдзень футболу, тыдзень бяспекі дарожнага руху і цэлы шэраг іншых конкурсаў. Як у такім выпадку ўстанове адукацыі можна засяродзіцца на рабоце, зацверджанай у гадавым плане?

Як адзначыла кансультант упраўлення сацыяльнай і выхаваўчай работы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь Ларыса Васільеўна Емяльянчык, тэматыка конкурсаў і акцый вызначана праграмай бесперапыннага выхавання дзяцей і моладзі на 2011—2015 гады. Штогод міністэрства распрацоўвае план работы, куды ўваходзяць усе самыя важныя рэспубліканскія мерапрыемствы, у тым ліку і конкурсы, фестывалі. Ніводным нарматывам Міністэрства адукацыі не прадпісваецца абавязковы ўдзел у прапанаваных конкурсах. Установы адукацыі маюць права выбраць з улікам кадравага патэнцыялу, накіраванасці сваёй работы той ці іншы конкурс. Але часам на ўзроўні ўпраўленняў, аддзелаў адукацыі навучальныя ўстановы абавязваюць удзельнічаць ва ўсіх конкурсах, што і выклікае нараканні, незадаволенасць педагагічных работнікаў.

— Канечне, на працягу года ўстановамі адукацыі праводзяцца мерапрыемствы не толькі ў адпаведнасці з планамі, даведзенымі органамі кіравання адукацыі і міністэрствам. Мы лічым мэтазгодным пры планаванні выхаваўчых мерапрыемстваў, грамадска значных акцый у маштабах рэгіёна, горада ўзгадняць сумесныя мерапрыемствы і іншыя формы работы з усімі зацікаўленымі арганізацыямі, аб'яднаннямі, структурнымі падраздзяленнямі аблвыканкамаў і Мінгарвыканкама. Гэта дазволіць скаардынаваць і ўпарадкаваць сістэму іх правядзення, у тым ліку ва ўстановах адукацыі, а таксама прадугледзець цыклічнасць і колькасць мерапрыемстваў. У сувязі з гэтым Міністэрства адукацыі рэкамендуе скласці каардынацыйны план работы на ўзроўні абласцей, горада Мінска, узгадніўшы іх з усімі зацікаўленымі і ўключыўшы неабходныя мерапрыемствы. Такі падыход дазволіць упарадкаваць колькасць мерапрыемстваў, пазбегнуць іх дубліравання, — адзначыла Ларыса Васільеўна.

Паспяховыя крокі ў гэтым кірунку робяцца ў розных рэгіёнах. Як паведаміла начальнік аддзела выхаваўчай работы ўпраўлення адукацыі Гомельскага аблвыканкама Ганна Васільеўна Мельнікава, упраўленне адукацыі Гомельшчыны выступіла ў мінулым навучальным годзе з ініцыятывай стварэння міжведамаснага календара абласных масавых мерапрыемстваў для навучэнцаў агульнасярэдніх устаноў адукацыі. Распрацоўваюць каляндар зацікаўленыя службы і ведамствы, грамадскія арганізацыі. Дзякуючы іх сумеснай рабоце з упраўленнем адукацыі, шэраг мерапрыемстваў (у першую чаргу тых, што дубліруюцца) былі зняты, адпаведна зменшылася нагрузка і на педагогаў, павысілася эфектыўнасць запланаваных выхаваўчых мерапрыемстваў.

— Па выніках навучальнага года мы традыцыйна праводзім у вобласці аналіз мерапрыемстваў, разглядаем мэтазгоднасць іх уключэння ў план на наступны навучальны год. Спецыяльны каляндар зацвярджае начальнік абласнога ўпраўлення адукацыі, а потым план з электроннымі дадаткамі накіроўваюць у кожны раён. Усё гэта адбываецца да пачатку навучальнага года, каб установам адукацыі было больш зручна складаць гадавы план работы, — расказвае Ганна Васільеўна.

Каб у календары было проста арыентавацца, прадугледжаны ўмоўныя абазначэнні. Напрыклад, жоўтым колерам пазначаюцца мерапрыемствы турыстычна-краязнаўчай накіраванасці, аранжавым — эколага-біялагічнага профілю, шэрым — тэхнічнага і г.д. Складанне такога календара дазволіла ўпарадкаваць конкурсы, акцыі. Цяпер кожная школа Гомельскай вобласці пры планаванні сваёй дзейнасці і зыходзячы са сваіх магчымасцей бачыць сябе ўдзельнікам тых ці іншых мерапрыемстваў.

— Напрыклад, праводзіцца конкурс на лепшы экалагічны праект. Навошта ўсім школам удзельнічаць у ім, няхай лепш у раёне гэта будзе адна ці дзве ўстановы, аднак тыя, дзе гэты кірунак работы развіты. Адна з прычын так званай конкурснай перагрузкі крыецца ў тым, што ў рэгіёнах ёсць своеасаблівы рэйтынг, дзе адным з паказчыкаў якасці работы той ці іншай установы адукацыі з'яўляецца ўдзел у рэспубліканскіх, абласных, раённых і гарадскіх конкурсах. Важна адзначыць, што Міністэрства адукацыі хоць і аналізуе ўдзел абласцей у конкурсах і акцыях, аднак не патрабуе абавязковага ўдзелу ва ўсіх мерапрыемствах. Разам з тым, безумоўна, ёсць рэспубліканскія конкурсы і акцыі, удзел у якіх мы лічым пажаданым, — адзначыла Ларыса Васільеўна.

Спадзяёмся, што па выніках калегіі Міністэрства адукацыі пытанні конкурснай перанасычанасці будуць вырашаны, а паспяховасць выхаваўчай работы ў той ці іншай установе адукацыі будзе вызначацца не колькасцю конкурсаў, а якасцю ўдзелу ў іх.

**Ігар ГРЭЧКА.**
*hrechka@ng-press.by*
**Фота аўтара.**

## Меркаванні

**Актуальныя пытанні выхаваўчай работы можна падзяліць на некалькі блокаў. У адзін з такіх блокаў уваходзяць пытанні, звязаныя з дзейнасцю музеяў устаноў адукацыі. Атрымаць адказы на некаторыя пытанні, што хвалююць педагогаў, дапаможа галоўны спецыяліст упраўлення ўстаноў культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Дзмітрый Генадзьевіч ШЛЯХЦІН.**

***Жанна Сямёнаўна КАРАЛЕНЯ, кіраўнік Дараганаўскага школьнага комплексна-краязнаўчага музея Асіповіцкага раёна:***

*— Мае калегі, якія кіруюць музеямі ў малакамплектных школах, нярэдка выказваюць хваляванні наконт далейшага лёсу экспанатаў пасля вераголнага закрыцця ўстановы адукацыі. Хваляванні апраўданыя, паколькі выпадкі, калі прадметы мінулых эпох папросту знікалі, — нярэдкая з'ява. Як заканадаўства ў такім выпадку абараняе шматгадовую працу педагогаў-музейшчыкаў?*

— У адпаведнасці з Законам "Аб музеях і музейным фондзе Рэспублікі Беларусь" усе школьныя музеі з'яўляюцца дзяржаўнымі. Пункт 4 артыкула 10 названага закона прадугледжвае, што заснавальнік дзяржаўнага музея пры яго ліквідацыі абавязаны забяспечыць захаванасць музейных прадметаў і перадаць іх іншаму дзяржаўнаму музею ці музеям. Калі ж школа закрываецца і музей спыняе сваю дзейнасць, то музейныя прадметы павінны перадавацца на пастаяннае захоўванне ў іншыя дзяржаўныя музеі, аб чым складаецца загад Міністэрства культуры, а таксама акты прыёму і перадачы.

***Аляксандра Яўгенаўна КРАВЕЦ, загадчык аддзела краязнаўства Рэспубліканскага цэнтра турызму і краязнаўства:***

*— Супрацоўнікі органаў унутраных спраў праводзілі ў музеях установ адукацыі праверкі, падчас якіх канфіскоўвалі выбухова небяспечныя прадметы, рэшткі зброі. Наколькі правамерная з'яўляецца такая ліквідацыя? Што рабіць, каб падобныя недарэчнасці больш не паўтараліся?*

— Названыя праверкі рэгулярна праводзяцца і ў музеях сістэмы культуры. Таму пэўны вопыт у нас ёсць. Каб школьны музей мог камплектаваць свае калекцыі зброяй і боепрыпасамі, у яго павінна быць спецыяльная ліцэнзія, якую выдае Міністэрства ўнутраных спраў. Пры зборы матэрыялаў падчас экспедыцый неабходна ўважліва агледзець кожны прадмет, каб пазбегнуць няшчасных выпадкаў, а таксама праблем з супрацоўнікамі органаў унутраных спраў. Згодна з нарматыўнымі дакументамі, зброя і боепрыпасы павінны знаходзіцца ў ізаляваных, спецыяльна абсталяваных памяшканнях, у металічных шафах ці скрынях або драўляных скрынях, абабітых жалезам, што замыкаюцца на ключ. Памяшканні павінны быць абсталяваны пэўным чынам ахоўна-пажарнай сігналізацыяй і перададзены пад пазаведамасную ахову органаў унутраных спраў з падключэннем сігналізацыі на пульты цэнтралізаванага назірання.

# У вас няма гурткоў? Цэнтр ідзе да вас

**Ці ўсе сельскія школы маюць магчымасць зрабіць работу сваёй установы больш разнастайнай у шосты школьны дзень? Ці ёсць магчымасць у сельскіх школьнікаў развіваць свае таленты? Сапраўды, куды пайсці, калі тваё захапленне не ўваходзіць у пералік школьных гурткоў? Адказы на гэтыя пытанні знайшлі педагогі Дзяржынскага раённага цэнтра дзіцячай творчасці. Менавіта тут узнікла ідэя стварэння перасовачнага Цэнтра творчасці па месцы жыхарства.**

"Нам вельмі хацелася разнастаіць жыццё дзяцей і падлеткаў, якія жывуць у сельскай мясцовасці нашага раёна, інавацыйнымі формамі работы, — расказвае дырэктар установы Наталля Васільеўна Яшчук. — Так узнікла ідэя стварэння перасовачнага цэнтра. Сутнасць праекта заключаецца ў тым, што група педагогаў-прафесіяналаў выязджае ў сельскія школы для арганізацыі шостага школьнага дня. Пры гэтым мы стараемся ахапіць такія кірункі ведаў, мастацтва, тэхнікі і практычнай дзейнасці, работа ў якіх праводзіцца ў канкрэтнай школе не на тым узроўні, у якім маецца патрэба, або не праводзіцца наогул. Акрамя таго, ён прадугледжвае больш дэталёвае знаёмства з дзейнасцю нашага цэнтра, работай творчых аб'яднанняў у самой школе. Не застаюцца па-за ўвагай і рознага роду метадычныя пытанні, нашы спецыялісты аказваюць метадычна-кансультацыйную дапамогу кіраўнікам дзіцячых аб'яднанняў. Мы імкнёмся да стварэння новых форм узаемадзеяння ўстаноў дадатковай адукацыі з установамі адукацыі раёна".

Як аказалася на практыцы, праект разлічаны не толькі на ўсіх навучэнцаў ад 1 да 11 класа і кіраўнікоў гурткоў, але і ўсіх педагогаў і адміністрацыю школ. Дзяцей у такой форме работы прыцягвае перш за ўсё тое, што гэта заўсёды свята: заняткі яркія і нетрадыцыйныя і вынік не прымушае сябе доўга чакаць. Падчас аднаго толькі майстар-класа можна даведацца шмат новага, многаму навучыцца і зрабіць сувеніры і падарункі сваімі рукамі. Але самае галоўнае, на думку педагогаў Дзяржынскага цэнтра, гэта атмасфера творчасці, узаемаразумення і псіхалагічнага камфорту, якія пануюць на занятках. "Вы заўсёды розныя, новыя, незвычайныя. Як вам удаецца ніколі не паўтарацца?" — гэтае пытанне педагогі цэнтра пастаянна чуюць ад удзельнікаў праекта.

Геаграфія падарожжаў перасовачнага Цэнтра творчасці па месцы жыхарства па Дзяржынскім раёне вялікая: вёскі Волма, Станькава, Забалаце, Дворышча, Навасёлкі, Логавішча.

Што вязуць педагогі дзецям? Чароўныя падарожжы і забаўляльныя гульнёвыя праграмы. Спартыўныя спаборніцтвы, заняткі школ актыву вучнёўскага самакіравання, майстар-класы дэкаратыўна-прыкладной творчасці, тэхнічнага і турыстычна-краязнаўчага профілю. І дзеці, і педагогі вывучаюць, як правільна раскласці вогнішча, перайсці падвесную пераправу, разбіць турыстычны лагер, спрабуюць свае сілы ў стральбе з пнеўматычнай вінтоўкі, глядзяць выступленне тэатра "Батлейка" дзіцячага аб'яднання па інтарэсах "З Батлейкай па Беларусі", вучацца ствараць фларыстычныя кампазіцыі, рабіць калядныя зоркі і паштоўкі з паперы, стужак і гузікаў, сувеніры з тканіны і скуры і многае іншае.

Дзень цэнтра на базе Валмянскага вучэбна-педагагічнага комплексу быў прысвечаны Калядам.

"Дзякуючы вам, мы дакрануліся да чараўніцтва і цудаў Каляд, зрабілі сваімі рукамі незвычайнай прыгажосці сувеніры, — менавіта такімі словамі праважалі сваіх гасцей дзеці і педагогі з гэтага кутка Дзяржынскага раёна.

На занятку ў вёсцы Лагавішча дзеці прыходзяць разам з бацькамі. "Гэта адна з нешматлікіх магчымасцей цікава і з карысцю правесці вольны час не толькі для нашых дзяцей, але і для нас. Мы чакаем гэтых заняткаў з нецярпеннем", — адзначаюць жыхары вёскі. Што можа быць вышэйшым за такую ацэнку педагагічнай працы?

Рэалізацыя праекта не абмяжоўваецца рамкамі навучальнага года. Педагогі цэнтра творчасці дзеляцца сваімі ведамі і ўменнямі падчас летніх канікул у дзіцячым аздараўленчым летніку "Дружба" г.п. Энергетыкаў і ў дзіцячых аздараўленчых летніках з дзённым знаходжаннем, якія арганізаваны на базе ўстаноў адукацыі раёна.

"Па выніках прамежкавага апытання ўдзельнікаў праекта 100% педагогаў і дзяцей хацелі б зноў паўдзельнічаць у рабоце перасовачнага Цэнтра творчасці па месцы жыхарства, — адзначае Наталля Васільеўна Яшчук. — Кніга водзываў па рэалізацыі праекта поўная падзяк і станоўчых эмоцый, а значыць, наша работа не дарэмная.

Прааналізаваўшы двухгадовую работу праекта, можна зрабіць выснову, што яго дзейнасць вельмі актуальная і перспектыўная. Мы плануем працягваць работу ў гэтым кірунку, бо ў жыцці кожнага маленькага чалавека павінна адбывацца нешта, што будзе запальваць агонь у яго вачах і сэрцы. Павінен адбывацца цуд. Кажуць, немагчыма даць дзіцяці тое, чаго не маеш сам. У педагогаў нашага Цэнтра творчасці ёсць глыбокія веды, натхненне, яркі талент і фантазія, і яны гатовы зноў і зноў дарыць гэтае багацце дзецям".

**Падрыхтавала**
**Наталля АЛЁХІНА.**
*aliohina@ng-press.by*

# Знайсці правільны падыход да маладога пакалення

**Маладое пакаленне, у адпаведнасці са сваімі патрэбнасцямі, вольны час часцей за ўсё праводзіць у маладзёжных кампаніях, з равеснікамі, дзе фарміруецца асаблівая маладзёжная атмасфера, якая не заўсёды аказвае станоўчы ўплыў на станаўленне асобы падлетка. Вынік апытання выхаванцаў Цэнтра дзіцячай творчасці Чэрвеня "У якіх мерапрыемствах Цэнтра ты хацеў бы ўдзельнічаць" насцярожыў. Нягледзячы на цікава і разнастайна арганізаваны вольны час, дзеці аддавалі перавагу калектыўным формам работы, а 7% падлеткаў увогуле не задавальнялі прапанаваныя варыянты.**

Гэтую сітуацыю стандартна не вырашыць, таму педагагічным калектывам цэнтра распрацаваны інавацыйны праект "Укараненне мадэлі развіцця сацыяльна-актыўнай асобы ва ўмовах установы дадатковай адукацыі", які дазволіў не толькі задаволіць запыты нашых бацькоў і выхаванцаў, пераўтварыць у новыя трэндавыя напрамкі творчасць педагогаў, але і пашырыць дыяпазон зносін нашага калектыву да рэспубліканскага ўзроўню.

Мэта інавацыйнай дзейнасці педагагічнага калектыву — стварэнне цэласнай адукацыйнай сістэмы, якая забяспечвае карысную занятасць выхаванцаў, накіраваную на фарміраванне сацыяльна-актыўнай, духоўнай і маральна-ўстойлівай творчай асобы. У сувязі з гэтым у нашай установе на першы план выйшлі такія задачы, як удасканаленне ўмоў для фарміравання сацыяльнай актыўнасці падлеткаў, здольных самастойна, вынікова і маральна вырашаць грамадскія і свае асабістыя праблемы.

У працэсе падрыхтоўкі да ўкаранення інавацыйнага праекта ўсе педагогі цэнтра прайшлі навучанне на семінары "Развіццё сацыяльнай актыўнасці падлеткаў у дзіцячых грамадскіх аб'яднаннях" і курсах па метадыцы "Роўны вучыць роўнага" з атрыманнем сертыфікатаў. Распрацаваныя нашымі творчымі педагогамі гульні-падарожжы —"Мы — марафонцы" і "Суботні марафон" — у рамках інавацыйнага праекта рэалізоўваюцца праз новыя эфектыўныя метады, формы і тэхналогіі сацыяльнай актыўнасці: методыка навучання па прынцыпе "Роўны вучыць роўнага", КТС, інтэрактыўныя тэхналогіі, сацыяльнае праектаванне.

Сістэма калектыўных творчых спраў у цэнтры забяспечвае бесперапыннасць працэсу развіцця асобы, дапамагае падлетку адчуць сябе лідарам, генератарам ідэй у працэсе арганізацыі і правядзення КТС. Падлетак становіцца паўнацэнным суб'ектам узаемадзеяння, узмацняецца яго роля, павышаецца актыўнасць у набыцці ведаў і навыкаў, фарміраванні сацыяльных установак. У рамках праекта педагогі-кансультанты працуюць з падлеткамі-валанцёрамі па метадыцы "Роўны вучыць роўнага", якія ў сваю чаргу дзеляцца ведамі з равеснікамі і дарослымі (школы і арганізацыі горада і раёна).

На наш погляд, прымяненне методык тэхналогіі інтэрактыўнага навучання, такіх як трэнінгі, інтэрактыўныя гульні, найбольш эфектыўна выкарыстоўваецца пры навучанні падлеткаў у "Школе поспех", у рабоце з бацькамі ў рамках "Бацькоўская ўніверсітэта". Стварэнне сітуацыі поспеху ў ходзе работы забяспечвае развіццё і рэалізацыю неабходных якасцей сацыяльнай актыўнасці. Сітуацыя поспеху ў працэсе работы стала свайго роду пускавым механізмам далейшага руху асобы.

Магутным фактарам выхавання ў цэнтры становяцца традыцыі, якія аб'ядноўваюць падлеткаў, бацькоў і педагогаў. Іх захаванне і перадача з пакалення ў пакаленне — неад'емная і найважнейшая частка выхаваўчай сістэмы. Традыцыі нашых марафонцаў — гэта спецыяльна напісаны тэкст песні, атрыбутыка, якая адлюстроўвае дачыненне падлеткаў да ўдзелу ў праектах і да жыцця нашай установы, талісманы, летапіс "Мае бацькі наведвалі цэнтр", які адлюстроўвае жыццё ўстановы, выпуск камандных насценных газет і інш. Сістэма работы па развіцці сацыяльнай актыўнасці ў цэнтры — гэта мэтанакіраваная работа, асноўная мэта якой — уключэнне падлеткаў у грамадскае жыццё. Яна рэалізоўваецца па трох напрамках: "Крок да традыцый", "Крок да здароўя", "Крок насустрач".

У рэальнасці ў падлеткаў узнікае патрэбнасць у атрыманні спецыяльных ведаў, якія садзейнічаюць фарміраванню сацыяльнай актыўнасці. Дзеля гэтага на базе цэнтра дзейнічаюць клубы для падлеткаў: клуб зносін "Адпачывай", "Школа поспех", "Школа ЗЛЖ". Такім чынам, цэнтр стварае ўмовы для задавальнення патрэбнасцей, інтарэсаў падлеткаў, для канструктыўнага творчага ўзаемадзеяння і праз новыя формы работы, такія як інтэрактыўныя гульні, флэшмобы, форум-тэатр і іншае. Мы максімальна заахвочваем і зацікаўліваем навучэнцаў 9—15 гадоў школ горада і раёна, запрашаем у рады нашых выхаванцаў дзеля развіцця іх сацыяльнай актыўнасці, праз пастаянную работу разнастайных пляцовак. На базе цэнтра ў шосты школьны дзень арганізавана работа аб'яднанняў з пераменным складам дзяцей.

У якасці прыярытэту, педагагічны калектыў цэнтра выдзяляе сацыяльнае ўзаемадзеянне сям'і і ўстановы дадатковай адукацыі, стварэнне і развіццё адзінай выхаваўчай прасторы "сям'я — цэнтр". Арганізацыя практычнай дапамогі вырашэння праблем сямейных адносін праз сістэму мерапрыемстваў дазваляе змяніць уяўленне бацькоў аб іх ролі ў жыцці дзіцяці.

Па выніках даследавання, праведзенага ў працэсе работы, можна гаварыць аб эфектыўнай дзейнасці выхаванцаў аб'яднанняў па інтарэсах цэнтра дзіцячай творчасці Чэрвеня. Павысілася сацыяльная актыўнасць падлеткаў-выхаванцаў, павялічылася як колькасць дзіцячых аб'яднанняў па інтарэсах, так і колькасць іх удзельнікаў, павысіўся ўзровень групавога развіцця, адзначаны рост колькасці розных сацыяльна значных спраў і мерапрыемстваў, якія праводзяцца ўдзельнікамі, і іх выніковасць, павялічылася колькасць публікацый у СМІ.

**Ірына КАЛОША.**

## Меркаванні

**Сістэма дадатковай адукацыі сёння перажывае новы этап у сваім развіцці. Аднак гаварыць пра тое, што ўсе праблемныя моманты зняты, пакуль што рана. Пытанні застаюцца і з боку тых, хто працуе ў самой сістэме, і з боку спажыўцоў яе паслуг. Самыя актуальныя з іх мы прапануем увазе нашых чытачоў.**

***Калектыў Цэнтра дзіцячай творчасці Лунінца:***

— Нас хвалюе пытанне абнаўлення матэрыяльнай базы. Дасягаць высокай рэзультатыўнасці на самафінансаванні вельмі няпроста. Праблемы ўзнікаюць у першую чаргу ў кірунку тэхнічнай творчасці. Не менш праблем і ў эстэтычным кірунку, усе ведаюць, наколькі нятанным сёння стала набыццё апаратуры і сцэнічных касцюмаў. А дэкаратыўна-прыкладная творчасць увогуле перастала ўспрымацца як дзейнасць, якая патрабуе расходаў. Яно і зразумела, вельмі многа работы праводзіцца са стратным матэрыялам, але ўсё астатняе педагогі купляюць практычна за свае сродкі.

Яшчэ адна праблема, якая сёння на слыху ў сістэме, — адпачынкі педагогаў. Гэта адзін з фактараў, які трымаў спецыялістаў.

***Ганна Васільеўна МЕЛЬНІКАВА, начальнік аддзела выхаваўчай работы ўпраўлення адукацыі Гомельскага аблвыканкама:***

— На жаль, установы дадатковай адукацыі ў плане матэрыяльнага забеспячэння выглядаюць крыху слабей за школы, дашкольныя ўстановы і інш., хоць і прымаюцца дадатковыя меры па павышэнні якасці работы ўстаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі. Некалькі гадоў назад у нас пачалі дзейнічаць праграма па развіцці агульнай сярэдняй адукацыі, праграма па развіцці дашкольнай адукацыі, разам з мерапрыемствамі якіх ідзе мэтавае фінансаванне. Як вядома, сёння выдзяляюцца мэтавыя сродкі на абсталяванне кабінетаў фізікі, хіміі і інш. Калі б падобная праграма існавала ў сістэме дадатковай адукацыі, магчыма, нам бы ўдалося вырашыць многія пытанні, якія тычацца аказання платных паслуг. Для таго каб прапанаваць прадукт яго патэнцыяльнаму спажыўцу, ён павінен быць якасным. Думаецца, было б даволі лагічным па такім ужо апрабаваным шляху арганізаваць абсталяванне канкрэтных студый і гурткоў.

***Калектыў Лепельскага раённага цэнтра дзяцей і моладзі:***

— Кодэкс аб адукацыі прыняты, але многія палажэнні, якія тычацца сістэмы дадатковай адукацыі, у ім працуюць не на поўную сілу. Напрыклад, там гаворыцца, што па выніках навучання дзяцей на павышаным узроўні ім можна будзе выдаваць пасведчанні. Аднак праграм на павышаным узроўні пакуль не існуе. У нас толькі адно выйсце — самім іх распрацоўваць. Няма і заканадаўча зацверджаных крытэрыяў якасці дадатковай адукацыі. Мы разумеем, што падобныя крытэрыі павінны прапісвацца ў кожнай асобнай адукацыйнай праграме. Але паколькі акрамя шаблонаў, па якіх павінны стварацца такія праграмы, нічога не маем, то ўзнікае яшчэ адна праблема. Усім вядома, што значная частка спецыялістаў нашай сістэмы, гэта людзі, якія маюць не педагагічную адукацыю. Яны прафесіяналы сваёй справы, але працаваць з такой спецыфічнай дакументацыяй не ўмеюць. Метадычныя аддзелы ў сваю чаргу не заўсёды валодаюць спецыфікай канкрэтнага кірунку дадатковай адукацыі.

***Марыя Н., Брэсцкая вобласць:***

— Мяне вельмі непакоіць сітуацыя, якая складаецца часам паміж школай і ўстановамі дадатковай адукацыі. Я кіраўнік гуртка і, думаю, калегі разумеюць, наколькі важнае пытанне яго напаўняльнасці. Не памылюся, калі скажу, што справа тут не толькі ў прафесіяналізме. Калі прыходзіш у школы, каб расказаць дзецям пра сваю дзейнасць і запрасіць на заняткі, разумееш, што іх вольны час ужо размеркаваны. Па-першае, гэта шэраг мерапрыемстваў школьнай суботы, а па-другое, вельмі часта настаўнікі самі вядуць аналагічныя гурткі на базе школ. Атрымліваецца, што мы не можам падзяліць дзяцей, якіх пакуль што больш не становіцца.

***Вольга Мікалаеўна, Мінская вобласць:***

— Я адна выхоўваю ўнучку і мне вельмі хацелася б, каб яна магла танцаваць ці займацца тэатральнай дзейнасцю. Мы жывём у вёсцы, і тыя гурткі, якія прапануе наша школа, далёкія ад нашых патрэб. Гэта зразумела, бо для такой работы патрэбны вузкія спецыялісты. Найбліжэйшая ўстанова дадатковай адукацыі знаходзіцца ў райцэнтры, а гэта вельмі значная трата часу і грошай. Калі гаварыць пра сістэму культуры ў сельскай мясцовасці, то там сітуацыя яшчэ больш складаная. Атрымліваецца, што вяскова дзеці часта не маюць магчымасці развіваць свае таленты, больш за тое, ім часта проста няма куды пайсці. І гэта не скарга ў адрас настаўнікаў. Справа хутчэй у адсутнасці каардынацыі падобнай работы на раённым узроўні і ў адсутнасці супрацоўніцтва паміж сістэмамі адукацыі і культуры.

**Два гады назад спецыялістам беларускай сістэмы аховы дзяцінства былі прапанаваны новыя алгарытмы работы з нядобранадзейнымі сем'ямі. Стандарты работы ў згаданым напрамку (іх чатыры) тычыліся пытанняў стварэння прыёмных сем'яў і рэабілітацыі нядобранадзейных, правядзення сацыяльнага расследавання з мэтай вызначэння стану сям'і і закрыцця інтэрнатных устаноў. У 2011 годзе навацыяўдзенні былі вынесены на абмеркаванне і даведзены да ўсіх рэгіёнаў краіны. І хоць афіцыйнага зацвярджэння на дзяржаўным узроўні яны яшчэ не атрымалі, метады і прыёмы, прапісаныя ў названых стандартах, работнікі сферы аховы дзяцінства адразу ўзялі на ўзбраенне.**

**Асаблівую актуальнасць сёння набывае стандарт закрыцця інтэрнатных устаноў, паколькі пытанне аптымізацыі адукацыйнай сеткі выходзіць на першы план. "Настаўніцкая газета" ў свой час падрабязна пісала пра шляхі вырашэння праблемных момантаў, што маюць месца падчас дэінстытуцыяналізацыі (уладкаванне дзяцей у сем'і, працаўладкаванне педагогаў, прыстасаванне будынкаў закрытых інтэрнатных устаноў), якія прапаноўвае згаданы стандарт (№ 146 ад 29.11.2011 г.). Па новай методыцы былі закрыты Правамастоўская школа-інтэрнат для дзяцей з цяжкасцямі ў навучанні і Воранаўская дапаможная школа-інтэрнат (Гродзенская вобласць).**

**Аб тым, што змянілася з таго часу, як новыя падыходы ў рабоце з нядобранадзейнымі сем'ямі былі ўзяты пад увагу спецыялістамі сферы аховы дзяцінства, мы гутарым з кіраўніком міжнароднай арганізацыі "Надзея і дамы для дзяцей" у Рэспубліцы Беларусь Галінай Мікалаеўнай Шварц (*арганізацыя выступае распрацоўшчыкам алгарытму закрыцця дзіцячых інтэрнатных устаноў. — Заўв. аўт.*).**



# Стандарт стане міжведамасным

***— Галіна Мікалаеўна, якая сітуацыя складваецца сёння ў краіне з прасоўваннем стандарту па дэінстытуцыяналізацыі? Ці ёсць пэўныя станоўчыя зрухі ў гэтым напрамку?***

— Стандарт яшчэ не прыняты, аднак 2012 год быў багаты на пэўныя дасягненні ў гэтай рабоце: цяпер ужо на афіцыйным узроўні загаварылі аб тым, што стандарт закрыцця інтэрнатных устаноў павінен стаць міжведамасным і закранаць установы не толькі галіны адукацыі, але і аховы здароўя, і, у перспектыве, сферы сацыяльнай абароны. Справа ў тым, што да нядаўняга часу пытанне дэінстытуцыяналізацыі разглядалася даволі вузка: закрываліся інтэрнаты для дзяцей з цяжкасцямі ў навучанні, агульнаадукацыйныя школы-інтэрнаты і іншыя ўстановы, якія знаходзіліся ў падпарадкаванні выключна сістэмы адукацыі. Між тым стандарт прадугледжвае ўладкаванне на сямейныя формы выхавання ўсіх дзяцей, якія пазбавіліся бацькоўскай апекі, у тым ліку дзяцей ранняга ўзросту. І цяпер ужо на дзяржаўным узроўні агучваецца неабходнасць закрыцця дамоў дзіцяці. А гэта значае дасягненне, паколькі названых установы, нягледзячы на выдатныя ўмовы, што створаны там для ўтрымання малых, з'яўляюцца своеасаблівымі варотамі ў інстытуцыяналізацыю.

***— Нагадайце, калі ласка, асноўныя прынцыпы, на якіх грунтуецца стандарт закрыцця інтэрнатных устаноў.***

— Самае важнае: рашэнне аб закрыцці павінна прымацца за два гады. Усе работнікі ўстановы павінны быць загадзя праінфармаваны аб тым, што ўстанова закрываецца, прычым менавіта адміністрацыяй, а не з дапамогай "сарафаннага радыё". На працягу першага года праводзяцца ўсе адміністрацыйныя працэдуры (у прыватнасці, ажыццяўляецца праверка дакументацыі па будынку, тэрыторыі, бо часта гэта становіцца перашкодай пры закрыцці), ідзе абследаванне дзяцей і сем'яў, куды яны будуць накіраваны, вядзецца работа з соцыумам. За час, адведзены на закрыццё інтэрната, натуральным чынам памяншаецца колькасць выхаванцаў установы: новыя дзеці не паступаюць, выпускнікі выходзяць, такім чынам, скарачаецца і колькасць дзяцей, якіх давядзецца ўладкоўваць у сем'і.

Дарэчы, дасягненнем 2012 года можна лічыць і тое, што навіна аб закрыцці ўстановы ўжо не выклікае такога абурэння, як раней. Маўляў, "чаму нас закрываюць, а не іх?". Сёння гэта ўспрымаецца як непазбежнасць.

***— Галіна Мікалаеўна, апошнім часам спраўды шмат гаворыцца аб праблеме ранняй інстытуцыяналізацыі дзяцей. Што неабходна рабіць для таго, каб паменшылася колькасць немаўлят, якія застаюцца без бацькоўскай апекі? Хто павінен гэтым займацца?***

— Што тычыцца дэінстытуцыяналізацыі дзяцей ранняга ўзросту, то тут на першы план выходзіць прафілактыка. Як ні круці, але ж патрабуецца асаблівая работа з нядобранадзейнымі сем'ямі, дзе выхоўваецца малыя дзеці. Такія сем'і трэба падтрымліваць у пачатку крызісу, каб не дапусціцьператварэння бацькоў у абвязаных асоб, а дзяцей — у сірот.

І ў краіне ўжо ёсць такі вопыт. Напрыклад, на Гомельшчыне на працягу некалькіх гадоў ствараліся рэсурсныя пакоі для замяшчальных сем'яў, якія бяруць на выхаванне дзяцей ранняга ўзросту. Цяпер там на базе сацыяльна-педагагічных цэнтраў з'яўляюцца дзіцяча-бацькоўскія групы, дзейнасць якіх накіравана на аказанне прафесійнай дапамогі сем'ям, што знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы і выхоўваюць дзяцей ранняга ўзросту. (*Больш падрабязна пра адну з такіх груп, што дзейнічае на базе Рагачоўскага СПЦ, чытайце ў адным з наступных нумароў "Настаўніцкай газеты". —* **Заўв.аўт.**) Гэта і ёсць работа па раннім выяўленні дзіцячай нядобранадзейнасці, ацэнцы рызыкі для дзіцяці, а таксама па рэабілітацыі бацькоўска-дзіцячых адносін. І выконваюць яе прафесіяналы — педагогі-псіхолагі і сацыяльныя педагогі СПЦ. У першую чаргу яны дапамагаюць бацькам усвядоміць, што дзіця — гэта каштоўнасць, яно патрэбна ім, і бацькі павінны баяцца яго страціць.

***— Наколькі нам вядома, арганізацыя "Надзея і дамы для дзяцей" зараз працуе над стварэннем у Гомелі Цэнтра падтрымкі маці і дзіцяці. Раскажыце, калі ласка, пра гэты праект больш падрабязна.***

— Цэнтр падтрымкі маці і дзіцяці будзе вельмі дарэчы ў тых выпадках, калі не ўдасца папярэдзіць сітуацыю рызыкі для дзіцяці. Туды на рэабілітацыю плануецца змяшчаць маці і дзіця, "выцягваючы" іх з нядобранадзейнага асяроддзя. Заўважце, дзіця будзе накіроўвацца не адно, а разам з маці. Там жанчыне акажуць псіхалагічную падтрымку, правядуць з ёй работу па аднаўленні дзіцяча-бацькоўскіх адносін. На нашу думку, рэабілітаваць маці без дзіцяці няма сэнсу. Спецыялісты павінны бачыць, як жанчына паводзіць сябе з дзіцем, і пры неабходнасці даваць парады.

***— А ці дастаткова будзе аднаго такога цэнтра?***

— Безумоўна, аднаго Цэнтра падтрымкі маці і дзіцяці будзе мала для краіны, між тым вялікай колькасці іх таксама не патрабуецца: пры наяўнасці ў раёнах дзіцяча-бацькоўскіх груп, гэта значыць калі будзе мець месца ранняе ўмяшанне, такі цэнтр можа быць адзін у вобласці. Гэта тая форма падтрымкі сям'і, якая дапаможа дзяржаве разумна эканоміць і не змяшчаць дзяцей у інтэрнаты. Пасля праходжання рэабілітацыі ў цэнтры жанчыну-маці можна будзе вывесці ў дзіцяча-бацькоўскую групу, ну а потым — у самастойнае плаванне, так бы мовіць.

***— Ці адбыліся, на ваш погляд, яшчэ якія-небудзь заўважныя станоўчыя зрухі ў беларускай сферы аховы дзяцінства ў 2012 годзе?***

— Так, я магу смела сказаць, што за апошнія два гады адбыўся карэнны пералом у разуменні прыёмнымі бацькамі свайго прызначэння. Яны ўжо ўсведамляюць сябе прафесіяналамі, разумеюць, што выконваюць пэўныя функцыі. Першачарговай задачай бачаць забеспячэнне догляду дзіцяці, яго развіццё і падрыхтоўку альбо да вяртання ў біялагічную сям'ю, альбо да ўсынаўлення. А раней быў распаўсюджаны іншы погляд на прыёмнае бацькоўства, накшталт такога: "Я-маці, бяру дзіця на выхаванне, і гэта будзе маё дзіця". Цяпер сітуацыя змянілася карэнным чынам. Яшчэ ў 2010 годзе мы нават не марылі пра гэта.

Напрыклад, калегі з Нацыянальнага цэнтра ўсынаўлення апошнім часам звяртаюць увагу на тое, што людзі, якія хочуць усынавіць дзіця, усё часцей просяць паглядзець на малых, якія выхоўваюцца ў прыёмных сем'ях. Значыць, яны разумеюць: дзіця, якое жыве ў сям'і, больш сацыялізаванае, і яго адаптацыя да новых сямейных умоў будзе больш лёгкай.

***— Што, на вашу думку, паспрыяла такім пераменам у свядомасці прыёмных бацькоў?***

— Перш за ўсё гэтаму садзейнічала вялікая работа, праведзеная Міністэрствам адукацыі краіны. Летам мінулага года, напрыклад, была прынята новая рэдакцыя Палажэння аб прыёмнай сям'і, згодна з якой зменена форма кантракта (на момант падпісання кантракта прыёмныя бацькі павінны прайсці спецыяльны курс навучання і быць добра праінфармаваны аб сваіх функцыях, абавязках і правах як апекуны дзіцяці і як работнікі аддзела адукацыі).

Канечне, трэба аддаць належнае дзейнасці работнікаў сацыяльна-педагагічных цэнтраў. Суправаджэнне прыёмных сем'яў — іх работа. Яны павінны данесці да прыёмных бацькоў, што іх асноўная функцыя — падрыхтаваць дзіця да жыцця ў сям'і, стварыць яму для гэтага ўмовы. Прыёмных бацькоў трэба вучыць, паколькі першапачаткова яны ведаюць толькі адзін від прыхільнасці — да сваіх уласных дзяцей. А прыёмныя дзеці — гэта крыху іншае. Спецыялісты СПЦ павінны дапамагчы прыёмным бацькам сфарміраваць іншы від прыхільнасці да дзяцей, патлумачыць ім, што цалкам нармальна, калі ўзнікае складаная сітуацыя. Сёння методык і прыёмаў, якія дазваляюць рыхтаваць людзей да змен у іх псіхалагічным стане, больш чым дастаткова. І сацыяльна-педагагічным цэнтрам ёсць у чым праявіць сябе.

На Гомельшчыне, напрыклад, ужо 11 раёнаў не накіроўваюць дзяцей ні ў інтэрнатныя ўстановы, ні ў дамы дзіцяці — усе малыя ўладкоўваюцца ў замяшчальныя сем'і. Так, бываюць і канфліктныя сітуацыі, але ж яны заўсёды будуць: тут трэба рабіць скідку на чалавечы фактар. У гэтым і заключаецца работа органаў апекі і спецыялістаў СПЦ — разруліць складаную сітуацыю. Не складваецца адносіны дзіцяці з сям'ёй? Значыць, трэба падабраць іншую сям'ю, якая будзе адпавядаць патрэбам малога. Гэта зусім не азначае, што сям'я дрэнная. Яна, магчыма, ужо выхавала пяцярых ці шасцярых дзяцей, але тут нешта не атрымліваецца. І такое здараецца. Псіхолаг і сацыяльны педагог павінны заўважыць гэтую сітуацыю і дапамагчы.

Да таго ж спецыялісты СПЦ суправаджаюць сем'і, куды інтэгруюцца дзеці, якіх вывелі з інтэрнатных устаноў. А такіх дзяцей, заўважу, будзе станавіцца ўсё больш і больш. І ніхто, акрамя сацыяльных педагогаў і псіхолагаў сацыяльна-педагагічных цэнтраў, не зможа аказаць ім належную падтрымку. Працэс дэінстытуцыяналізацыі, такім чынам, актывізуе дзейнасць названых устаноў. Акрэсліваюцца тры важныя функцыі СПЦ: суправаджэнне сям'і ў перыяд прафілактыкі інстытуцыяналізацыі, дапамога дзіцяці і сям'і ў крызісных сітуацыях; суправаджэнне прыёмных сем'яў, якія прымаюць дзяцей, выведзеных з інтэрнатных устаноў.

***— А якая сітуацыя сёння з уладкаваннем у сем'і дзяцей з асаблівасцямі ў развіцці? Медыкі ж, калі заходзіць размова аб неабходнасці закрыцця дамоў дзіцяці, заўсёды спасылаюцца на тое, што такім дзецям патрэбен асаблівы догляд.***

— Сапраўды, "асаблівыя" дзеці яшчэ пакутуюць у гэтым плане — здаровых малых уладкаваць у замяшчальную сям'ю намнога прасцей. Між тым згаданая праблема, на мой погляд, таксама вырашальная. Дарэчы, сёння мы можам прывесці ў прыклад шмат сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей з асаблівасцямі. І яны спраўляюцца! Карыстаюцца паслугамі ЦКРНіР, медыцынскіх устаноў.

Мы павінны больш увагі ўдзяляць падрыхтоўцы замяшчальных бацькоў, якія гатовы прыняць дзяцей з асаблівасцямі ў развіцці. Тое, што сем'і прымаюць на выхаванне здаровых дзяцей, а бацькі не выказваюць былых страхаў, ужо з'яўляецца значным падрыхтоўчым крокам да таго, каб "асаблівыя" дзеці гэтак жа плаўна ўладкоўваліся ў сем'і.

Тыя ж СПЦ у садружнасці з органамі аховы здароўя могуць узяць на сябе функцыю суправаджэння выхаванцаў інтэрнатных устаноў (а многія з іх, як правіла, маюць адхіленні ў развіцці) у замяшчальных сем'ях. Тэмпы рэабілітацыі малых у такіх выпадках, як паказвае практыка, значна паскараюцца.

Неабходна таксама рыхтаваць так званыя дзяжурныя замяшчальныя сем'і. Іх не будзе шмат, як і тых сем'яў, якія бяруць на часовае выхаванне дзяцей ранняга ўзросту: праз шэсць месяцаў дзіця вернецца ў біялагічную сям'ю або яму знойдуць прыёмную сям'ю.

**Гутарыла Глафіра ЛЯТКОЎСКАЯ.**
*liatkouskaya@ng-press.by*
**Фота аўтара.**

## Меркаванні

## Сацыяльны статус

***Святлана Леанідаўна ШЫБАЛКА, выхавальнік дзіцячага сада № 368 Мінска: "Педагогі і самі павінны трымаць планку".***

— Шчыра кажучы, 20 гадоў назад адносіны людзей да прафесіі педагога былі іншымі. Я тады працавала ў раёне-навабудоўлі, і ў групах нашай установы было па 40 дзяцей. Аднак працаваць было лёгка: я адчувала павагу да сваёй працы як з боку бацькоў, так і з боку кіраўніцтва. Бацькі разумелі, што работа выхавальнікаў вельмі адказная, і гатовы былі прыйсці на дапамогу ў любы момант. А сёння яны, калі прыводзяць дзіця ў сад, нібыта знімаюць з сябе адказнасць і перакладаюць яе на нас. "Вы павінны", — часта чуем мы. Так, мы разумеем, што павінны, але дапамога з боку бацькоў таксама павінна быць.

Асабіста я лічу галоўным у сваёй рабоце адказнасць да здароўя і жыцця дзіцяці. Між тым прыкра ўсведамляць, што дзеці не заўсёды знаходзяцца ў полі зроку выхавальніка, асабліва ў першы месяц новага навучальнага года. У верасні мы, так бы мовіць, павернуты спінай да дзяцей, паколькі займаемся запаўненнем іх асабістых анкет, выпісваем звесткі з медыцынскіх картак, інфармацыю аб бацьках, абследуем сем'і з мэтай вывучэння іх статусу, складаем іх сацыяльны пашпарт і г.д. Папяровай работы, якая ўсё ж такі адцягвае педагогаў ад іх асноўнай дзейнасці, шмат. Яна, напэўна, патрэбна, але ж раней мы неяк абыходзіліся без гэтага...

Хто павінен працаваць на паляпшэнне статусу педагога? Безумоўна, мы самі павінны трымаць планку. І, канечне, значную ролю тут адыгрываюць адносіны адміністрацыі. Наш сад у гэтым плане "залатое" месца! Людміла Феліксаўна Падчаша, загадчыца установы, умее так падаваць любую інфармацыю, што негатыву мы пазбаўлены. Аднак важны і эканамічны бок: маладыя спецыялісты, атрымліваючы першы заробак, думаюць не пра тое, як працаваць, а як хутчэй уцячы з сада. Прывабіць у педагогіку моладзь сёння вельмі складана...

***Ніна Канстанцінаўна ВІКТАРОЎСКАЯ, дырэктар Мінскага абласнога ЦКРНіР: "Трэба разумець, што з "асаблівым" дзіцем можа працаваць толькі асаблівы педагог".***

— Што тычыцца статусу настаўніка-дэфектолага, то з ім, на маю думку, не так усё дрэнна. Ва ўсе часы студэнты дэфекталагічнага факультэта педуніверсітэта валодалі грунтоўнымі ведамі: вывучалі і медыцыну, і педагогіку, і псіхалогію, і спецпсіхалогію. На дэфекталагічны факультэт заўсёды паступалі моцныя абітурыенты.

Настаўнікі-дэфектолагі карысталіся і карыстаюцца павагай у грамадстве. Вядома, што дэфектолагі нават займаюць кіруючыя пасады ў органах дзяржаўнай улады. Гэта сведчыць аб тым, што ўзровень прафесійных ведаў названых спецыялістаў адпавядае патрабаванням сучаснага грамадства ў розных сферах жыцця. Хаця, шчыра кажучы, узровень ведаў, адказнасці, матывацыі сённяшніх студэнтаў-дэфектолагаў у параўнанні з іх равеснікамі васьмігадовай даўнасці знізілася.

Што рабіць для павышэння статусу педагога? Канечне, у першую чаргу на статус уплываюць узровень заработнай платы і ўмовы працы. Але ж калі гаварыць пра настаўнікаў-дэфектолагаў, то іх статус значна залежыць ад фарміравання інклюзіўнай свядомасці грамадства ўвогуле: павінна быць разуменне таго, што з дзіцем, якое мае пэўныя абмежаванні, можа працаваць толькі асаблівы чалавек. Канечне, педагогаў неаб-

## педагога: які ён сёння? ад чаго залежыць?

ходна заахвочваць, і ў Беларусі гэта робіцца на дзяржаўным узроўні: настаўнікі-дэфектолагі, выхавальнікі і спецыялісты ўстаноў спецыяльнай адукацыі маюць надбаўкі да зарплаты, у адрозненне ад выхавальнікаў дзіцячых садоў і настаўнікаў агульнаадукацыйных школ.

Бацькі ў асноўным задаволены работай дэфектолагаў, паколькі бачаць вынік іх працы.

***Алена Мікалаеўна МЛЕЧКА, выкладчык кафедры гісторыі, айчыннай і сусветнай культуры Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта:** "Выкладчык — заўсёды статусная пасада".*

— Безумоўна, сацыяльны статус выкладчыка, як і любога іншага работніка, — гэта не толькі ўзровень яго заробку. Немалаважнае значэнне мае і тое, наколькі прэстыжная прафесія ў грамадстве. У адносінах да сябе магу смела сказаць, што я і сама паважаю сваю прафесію, і такое ж стаўленне адчуваю з боку грамадскасці. Выкладчык — гэта заўсёды статусная пасада ў разуменні і дарослых — людзей, якія адбыліся як асобы, і студэнтаў, хоць, здаецца, жыццёвыя каштоўнасці ў іх розныя.

Насамрэч, мне не раз даводзілася чуць нараканні на сённяшніх "лянівых" і "няўдзячных" студэнтаў. Маўляў, яны цяпер зусім не тыя: няма ранейшай павагі і ўвагі да выкладчыка. Але, лічу, усё залежыць ад самога выкладчыка: ці зможа зацікавіць, выдаць нешта такое, чаго студэнт не знойдзе ў той жа сусветнай павуціне ці падручніку. Зразумела, каб адпавядаць такім патрабаванням, трэба шмат працаваць над сабой.

Што ж да матэрыяльнага боку, то тут многае залежыць ад кіраўніцтва ўстановы. У нашым універсітэце маладыя выкладчыкі не адчуваюць сябе пакрыўджанымі. Як правіла, яны маюць добрую нагрузку, а пры жаданні — і магчымасць падзарабіць. Да таго ж статус маладых спецыялістаў дае магчымасць штомесяц атрымліваць пэўную даплату. Ну а далей — усё ў нашых руках: будзе абаронена дысертацыя, з'явіцца і больш магчымасцей для прафесійнай самарэалізацыі.

***Аляксандр Пятровіч ЦЫБУЛЬКА, дырэктар Любушанскай сярэдняй школы Бярэзінскага раёна (Мінская вобласць):** "Статус педагога — гэта яшчэ і камфортны мікраклімат у калектыве".*

— Сацыяльны статус педагога залежыць ад яго заробку. Сёння ў суадносінах з цэнамі зарплата педагога невысокая, і гэта ні для каго не сакрэт. Калі браць нашу школу, то добрай нагрузкай для настаўнікаў лічыцца 24 гадзіны (1,3 стаўкі). Гэта ў сярэднім 3 млн для педагога з вышэйшай катэгорыяй. Што тычыцца выхавальнікаў, то ў нашай вёсцы яны ў лепшым выпадку атрымліваюць 2 млн.

Між тым у настаўніка заўсёды ёсць магчымасць падзарабіць: ён можа паўдзельнічаць у конкурсах, падрыхтаваць алімпіяднікаў і, згодна з калектыўным дагаворам, атрымаць прэмію, надбаўку (каля 900 тысяч). Выхавальнікі такой магчымасці не маюць.

І ўсё ж такі раней настаўнікаў, асабліва ў сельскай мясцовасці, паважалі больш. Сёння адносіны да педагогаў змяніліся, і адбылося гэта, на маю думку, па той прычыне, што настаўнікі пачалі выконваць неўласцівыя ім функцыі. Напрыклад, значны час настаўнік цяпер удзяляе рабоце з нядобранадзейнымі сем'ямі, хаця, акрамя школы, ёсць іншыя структуры, якія таксама абавязаны займацца сем'ямі названай катэгорыі: тэрытарыяльныя цэнтры сацыяльнай абароны і інш. Часам даходзіць да таго, што настаўнікі нарыхтоўваюць дровы нядбайным бацькам, наводзяць парадак у іх дамах. Нават калі дзеці гінуць на пажарах, усё роўна абвінавачваюць настаўнікаў — маўляў, не дагледзелі. Хаця праверка спраўнасці праводкі цалкам уваходзіць у абавязкі супрацоўнікаў службаў МНС.

Ну і папяровая работа, якой сёння, напэўна, зашмат. Прывяду наступны просты прыклад. У 2005 годзе, калі ў нашай школе з'явіўся камп'ютарны клас, картрыдж для прынтара мы запраўлялі 1 раз у паўгода. Сёння мы маем ужо 3 лазерныя прынтары, і запраўку кожнага ажыццяўляем раз у месяц...

Статус педагога — гэта яшчэ і камфортны мікраклімат у калектыве. Вельмі важна стварыць у школе такія ўмовы, каб было зручна ўсім — і дзецям, і настаўнікам. А ўвогуле, педагог камфортна будзе адчуваць сябе тады, калі будзе бачыць добрыя адносіны з боку адміністрацыі. У нашай школе настаўнікі ведаюць, што за любую ініцыятыву і ўдзел у любой рабоце, звыш вучэбнага працэсу, яны абавязкова будуць адзначаны.

***Ірына Аляксандраўна ІОЎЛЕВА, педагог дадатковай адукацыі Цэнтра дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі "Эўрыка" (Мінск), кіраўнік гуртка "Горад майстроў":** "Настаўнік павінен зарабляць так, каб выглядаць годна".*

— Як педагог дадатковай адукацыі я выдатна адчуваю сябе ў сваім статусе. На занняткі гуртка да мяне ходзіць шмат дзяцей, бацькі выхаванцаў заўсёды рады дапамагчы і часам самі прымаюць удзел у занятках. Я адчуваю павагу з іх боку.

Калі гавораць пра нізкі сацыяльны статус педагогаў, то гэта, на маю думку, больш закранае школьных настаўнікаў. Аднак праблема не ў настаўніках — яны ўсе працуюць. Праблема ў бацьках: адукацыйны ўзровень і ўзровень культуры многіх бацькоў сёння, на жаль, вымушае жадаць лепшага. Сёння чалавек, які мае заробак на парадак вышэйшы за заробак настаўніка, лічыць сваім правам прыйсці ў школу і выказаць педагогу сваё меркаванне па любым пытанні. Момант атрымання ім больш высокага заробку робіць яго чамусьці вельмі значным ва ўласных вачах. І далёка не кожны настаўнік можа паставіць на месца такога чалавека. Гэтая з'ява становіцца ўсё больш распаўсюджанай.

І яшчэ адзін момант: многія бацькі цяпер лічаць, што займацца з іх дзецьмі павінны толькі настаўнікі, паколькі гэта справа педагогаў. Гэта вялікая памылка.

Асабіста я, на першы погляд, раблю такую маленькую справу — вучу дзяцей майстраваць. Але так прывіваецца любоў да працы, і мой статус абумоўлены гэтым момантам. Дзеці ўжо ведаюць, што змогуць нешта стварыць сваімі рукамі. Мяне як кваліфікаванага спецыяліста паважае адміністрацыя (дырэктар цэнтра С.В.Шмагарэўская і намеснік дырэктара А.А.Альхавая), а павага з боку кіраўніцтва таксама важна для сацыяльнага статусу. Прыемна працаваць у добрым калектыве.

На статус значна ўплывае і эканамічны складнік. Мая маці, якая шмат гадоў назад закончыла сельскую школу, часта гаворыць: "Я ніколі не забуду, як выглядала мая настаўніца, у сіняй строгай сукенцы з белым карункавым каўнерыкам...". Адзенне для жанчыны — гэта яе здароўе, як сказала адна з вядучых вядомага тэлевізійнага ток-шоу. Адзенне гэта яшчэ і паводзіны, і педагагічны такт. Хочаш не хочаш, а яно нібыта ўзнімае цябе, нават выпраўляе паставу, робіць іншым маўленне. Знешні выгляд многае значыць для жанчыны, а педагогі ў нас сёння ў асноўным жанчыны. І я лічу, што настаўнік павінен зарабляць так, каб выглядаць годна.

# Камандны падыход у рабоце забяспечыць план развіцця сям'і

**Летам мінулага года было прынята ў новай рэдакцыі Палажэнне аб прыёмнай сям'і. Дакумент для спецыялістаў, што працуюць у сферы замяшчальнага бацькоўства, вельмі важны: ён не толькі прывёў у адпаведнасць з сённяшнім заканадаўствам асноўныя нормы ў гэтай сферы, але і даў адказы на многія пытанні, што ўзнікаюць у сувязі з развіццём інстытута замяшчальнага бацькоўства. А такіх пытанняў апошнім часам, у сувязі з трансфармацыяй ролі і задачы прыёмных бацькоў, узнікала ўсё больш: хто такія прыёмныя бацькі — работнікі ці дабрачынцы; наколькі шырокія паўнамоцтвы і абавязкі ў замяшчальных бацькоў; за што ў працэсе рэабілітацыі дзяцей з асаблівым лёсам адказваюць замяшчальныя бацькі, а дзе павінны падключыцца спецыялісты?**
**Як "спрацаваў" дакумент на месцах? Ці дапамог вырашыць найбольш вострыя пытанні? Гэта мы паспрабавалі высветліць у Кармянскім раёне Гомельскай вобласці.**

## Рэсурсаў дастаткова

Адрас быў выбраны невыпадкова. Кармянскі раён у гэтым пытанні ўнікальны: ужо на працягу больш чым 10 гадоў ніводнае зноўвыяўленае дзіця сіроцкай катэгорыі не накіроўваецца ў інтэрнатныя ўстановы.

— У кожным выпадку шукаем для дзяцей сям'ю — апякунскую, прыёмную, усынавіцеляў, — расказвае Алена Мікалаеўна Чупругіна, галоўны спецыяліст па ахове дзяцінства аддзела адукацыі Кармянскага райвыканкама. — Так, на сёння ў 20 апякунскіх сем'ях выхоўваецца 28 дзяцей, у 26 прыёмных — 47 дзяцей. Акрамя таго, у гэтым годзе ў раёне адкрыўся першы дзіцячы дом сямейнага тыпу, дзе зараз выхоўваецца 8 дзяцей.

Пры гэтым асноўная частка прыёмных бацькоў — работнікі са стажам. Першыя прыёмныя бацькі з'явіліся ў раёне ў 2001 годзе. Некаторыя з іх працягваюць сваю дзейнасць і сёння. Зараз усе яны заключылі з аддзелам адукацыі дагаворы аб умовах выхавання і ўтрымання дзяцей. Іншымі словамі, і муж, і жонка ў прыёмнай сям'і прынялі на сябе абавязкі апекуноў. І ў пэўнай ступені гэта дапамагло павысіць адказнасць сям'і: не толькі мама, але і тата становіцца апекуном дзіцяці.

Як адзначае Алена Мікалаеўна (якая, дарэчы, ужо 16 гадоў працуе на пасадзе спецыяліста па ахове дзяцінства), за гэтыя гады вельмі прыкметна павысіўся прафесійны ўзровень прыёмных бацькоў. Псіхолага-педагагічная падрыхтаванасць, эрудзіраванасць, камунікабельнасць, прафесійны такт і далікатнасць, эмацыянальная ўстойлівасць і гатоўнасць да псіхалагічных нагрузак, талерантнасць, добразычлівасць, эмпатыя, любоў да дзяцей, уменне прымаць рашэнні і адказваць за іх — усё гэта якасці сённяшніх прыёмных бацькоў, набытыя імі як падчас спецыяльнай падрыхтоўкі, так і ў штодзённым прафесійным жыцці.

— Сёння, дарэчы, у нас няма патрэбы прыцягваць новых работнікаў у сферу замяшчальнага бацькоўства, — падкрэслівае Алена Мікалаеўна. — Рэсурсаў ужо дзеючых сем'яў поўнасцю дастаткова для таго, каб прыняць дзяцей, што набываюць сіроцкі статус, на выхаванне. Паспрыяла гэтаму ў пэўнай ступені і новая норма палажэння, згодна з якой у прыёмнай сям'і, акрамя родных, можа быць ад 1 да 4 прыёмных дзяцей. Але сем'яў, дзе выхоўваецца чацвёра прыёмных дзяцей, няшмат: пакуль у нас няма патрэбы так "загружаць" прыёмныя сем'і. Да таго ж тут важна правільна ацаніць патэнцыял сям'і, каб яна ў сваім складзе максімальна працавала на інтарэсы дзіцяці.

Пры гэтым трэба адзначыць, што ў прыёмныя сем'і ў раёне накіроўваюцца не толькі дзеці з сіроцкім статусам, але і некаторыя з тых, хто прызнаны асобамі, якія маюць патрэбу ў дзяржаўнай абароне, на час рэабілітацыйнай работы з сям'ёй. Гаворка ідзе ў першую чаргу аб дзецях да трох гадоў. Як вядома, згодна са статутам установы, у сацыяльны прытулак накіраваць дзіця да трох гадоў на час адабрання з сям'і немагчыма. У многіх раёнах у такім выпадку дзейнічаюць па старых звычаях: накіроўваюць малых у Дом дзіцяці. Але гэта не спрыяе як развіццю дзіцяці, так і захаванню бацькоўска-дзіцячых адносін.

— У мінулым годзе ў нас быў выпадак, калі прыйшлося забраць з сям'і дзіця ва ўзросце аднаго месяца, — прыводзіць прыклад Алена Мікалаеўна. — Мы маглі накіраваць яго ў Гомельскі дом дзіцяці. Але зразумелі, што гэта вельмі негатыўна адбілася б на ўзаемаадносінах маці з дзіцем: крокавая даступнасць для наведвання дзіцяці мае вялікае значэнне. Да таго ж і прыёмныя бацькі ў такой сітуацыі былі настроены на тое, каб дапамагчы сям'і аб'яднацца. Сёння мы з радасцю заўважаем, што нашы намаганні не былі дарэмнымі: сям'я аднавілася, вярнулася да нармальнага жыцця, а прыёмная мама да гэтага часу падтрымлівае з роднай мамай і дзіцем сувязі.

## Выключыць суб'ектыўны фактар

Адзін у полі не воін. Гэты выраз як мага лепш характарызуе дзейнасць прыёмных бацькоў па рэабілітацыі дзяцей з асаблівым лёсам. Проста разумення, што яны жывуць у сям'і, гэтым дзецям недастаткова. З імі неабходна працаваць. Працаваць прафесійна, вырашаючы індывідуальныя праблемы кожнага — ад медыцынскіх да псіхалагічных. І намаганняў толькі прыёмнай мамы ў гэтай справе недастаткова. Тут патрабуецца менавіта камандны падыход. Дзіцяці неабходна спецыялізаваная дапамога, дакладны план дзейнасці для ўсіх дарослых, што з ім кантактуюць: замяшчальных бацькоў, настаўнікаў, выхавальнікаў.

Менавіта на тое, каб забяспечыць такі камандны падыход у рэабілітацыйнай рабоце з дзіцем, наладзіць неабходнае псіхолага-педагагічнае суправаджэнне замяшчальнай сям'і, накіравана норма Палажэння аб складанні ў адносінах да кожнай з прыёмных сем'яў індывідуальнага плана развіцця сям'і. Калі звярнуцца да тэксту дакумента, то там значыцца, што план развіцця прыёмнай сям'і распрацоўваецца прыёмнымі бацькамі разам з аддзелам адукацыі ці ўстановай, якая забяспечвае псіхалагічную і педагагічную дапамогу.

— Для стварэння эфектыўных планаў развіцця неабходна, найперш, ведаць патрэбы дзіцяці і сям'і, — падкрэслівае Алена Мікалаеўна. — Зрэшты, гэта не стала для нас чымсьці новым. Гэтае патрабаванне дзейнічала і да ўступлення ў сілу новай рэдакцыі Палажэння аб прыёмнай сям'і. Сёння, як і раней, перад перадачай дзіцяці на выхаванне ў сям'ю, мы праводзім яго поўнае медыцынскае абследаванне, да работы падключаюцца спецыялісты сацыяльна-педагагічнага цэнтра для высвятлення псіхалагічных асаблівасцей дзіцяці. Потым гэтая інфармацыя сістэматызуецца і прадстаўляецца ў выглядзе плана дзейнасці па рашэнні ці мінімізацыі тых ці іншых праблем.

Пры гэтым, як падкрэсліла спецыяліст, галоўнымі прынцыпамі застаюцца захаванне прыярытэтаў патрэб дзіцяці, яго актыўная пазіцыя ў пытаннях уласнага жыццеўладкавання, пераемнасць сацыякультурнага асяроддзя па месцы знаходжання дзіцяці.

— Безумоўна, для кожнай сям'і складаецца індывідуальны план развіцця, але пры гэтым існуюць і агульныя патрабаванні. Мы распрацавалі сваю форму гэтага дакумента, узяўшы за аснову прадстаўлены інстытутам развіцця адукацыі план, — расказвае Алена Мікалаеўна. — Так, для сябе мы выдзелілі тры асноўныя часткі: умовы функцыянавання сям'і, развіццё дзіцяці ці дзяцей у прыёмнай сям'і і павышэнне прафесіяналізму прыёмных бацькоў. У сваю чаргу кожны з гэтых раздзелаў змяшчае пералік пазіцый, на якія неабходна звярнуць увагу прыёмным бацькам і спецыялістам, што суправаджаюць сям'ю.

Так, у дачыненні да ўмоў функцыянавання прыёмнай сям'і звяртаецца ўвага на гарантаванне належных бытавых умоў, арганізацыю харчавання дзіцяці, захаванне рэжыму дня, бяспекі дзіцяці, забеспячэнне ўмоў для падтрымкі сваяцкіх сувязей дзіцяці і іншае. У адносінах да развіцця дзіцяці звяртаецца ўвага на выкананне неабходных умоў для адаптацыі і сацыялізацыі дзіцяці, яго выхавання і навучання ва ўстановах адукацыі, медыцынскае суправаджэнне дзяцей. І, нарэшце, апошні раздзел — павышэнне прафесійнай кампетэнтнасці прыёмных бацькоў — маюцца на ўвазе такія напрамкі работы, як удзел бацькоў у метадычных аб'яднаннях, атрыманне імі кансультацыйнай дапамогі спецыялістаў, прававая і псіхолага-педагагічная самаадукацыя.

Пры гэтым важна разумець, што кожная з адзначаных пазіцый утрымлівае канкрэтныя дзеянні, якія ў ходзе рэалізацыі плана павінны быць выкананы ў вызначаны час. Прычым патрабаванне па выкананні адзначаных у плане развіцця сям'і дзеянняў тычыцца не толькі прыёмных бацькоў, але і спецыялістаў сацыяльна-педагагічнага цэнтра, установы адукацыі, якую наведвае дзіця. Менавіта таму гэты план падпісваецца не толькі прыёмнымі бацькамі, але і ўсімі названымі спецыялістамі.

— План развіцця сям'і — гэта дакумент, які павінен з цягам часу змяняцца, — падкрэслівае спецыяліст. — Менавіта таму ён складаецца на тэрмін да 6 месяцаў. Пасля чаго зноў праводзіцца неабходная дыягностыка, вызначаюцца праблемы, на якія неабходна звярнуць увагу, патрэбы дзіцяці, і складаецца новы парадак дзеянняў для ўсіх зацікаўленых спецыялістаў. Калі ж мерапрыемствы з плана ў план дакладна паўтараюцца, то неабходна задумацца, дзе адбываецца збой: ці то патрэбы дзіцяці і сям'і вызначаюцца фармальна, ці то дзеянні прыёмных бацькоў і спецыялістаў, што іх суправаджаюць, не адпавядаюць устаноўленым патрабаванням. Такі падыход сапраўды дапамагае выключыць суб'ектыўны фактар у рабоце прыёмных бацькоў і прыцягнуць да гэтай дзейнасці ўсіх неабходных спецыялістаў.

**Алена МАРКЕВІЧ.**
*markevich@ng-press.by*

# Новая схема падрыхтоўкі кадраў: больш сучасная і мабільная

**У 2012 годзе айчынная вышэйшая школа пачала масава пераход на дыферэнцаваныя тэрміны навучання. Плануецца, што ў хуткім часе падрыхтоўка спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй будзе весціся пераважна па схеме “4 + 2” (чатыры гады навучання на першай ступені і два гады — на другой).**
**На сёння адзінай установай вышэйшай адукацыі, якая плануе цалкам перавесці ўсе спецыяльнасці першай ступені (а іх 36) на чатырохгадовае навучанне, з’яўляецца Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі.**
**Тут правялі грунтоўны аналіз усіх вучэбных планаў і праграм, адпрацавалі ўсе арганізацыйныя і метадычныя пытанні і цалкам інтэнсіфікавалі працэс навучання.**
**У выніку ўдалося скараціць цэлы год падрыхтоўкі на першай ступені, але не страціць пры гэтым высокай якасці, наадварот, былі знойдзены дадатковыя рэзервы для яе павышэння. Для кіраўніцтва БДУІР гэта была прынцыповая пазіцыя.**

Як заўважыла прарэктар па вучэбнай рабоце і менеджменце якасці БДУІР Алена Мікалаеўна ЖЫВІЦКАЯ, пераход да новай схемы падрыхтоўкі стаў магчымым таму, што для гэтага з’явіліся спрыяльныя ўмовы, істотна змянілася метадалогія адукацыі. Напрыклад, у савецкі час такі пераход быў бы заўчасным і не меў бы станоўчага эфекту.

Спецыялісты БДУІР правялі каласальную работу па аптымізацыі вучэбных планаў.

“Напрыклад, з цыкла сацыяльна-гуманітарных дысцыплін мы выключылі інфармацыю, што дублявалася школьнай праграмай, а таксама тэмы, якія студэнты цалкам могуць асвоіць самастойна, — гаворыць Алена Мікалаеўна. — Пры распрацоўцы новага пакалення стандартаў мы адштурхоўваліся найперш ад тых кампетэнцый, якія патрэбны выпускніку непасрэдна на яго асноўным месцы работы”.

Акрамя таго, быў аптымізаваны блок прыродазнаўчанавуковых дысцыплін. У выніку асобныя дысцыпліны былі абагульнены і згрупаваны, а асобныя тэмы перанесены на другую ступень вышэйшай адукацыі. Такая ж работа была праведзена і па цыкле агульнапрафесійных і спецыяльных дысцыплін.

Таксама пры пераходзе на чатырохгадовы тэрмін на першай ступені было прынята рашэнне аб’яднаць перыяд навучання і перыяд дыпломнага праектавання (дагэтуль студэнты на час дыпломнага праектавання вызваляліся ад вучобы). Зараз шэраг дысцыплін будзе давацца студэнтам паралельна з работай над дыпломным праектам.

“Хачу сказаць, што, дзякуючы такой аптымізацыі, пры пераходзе на чатырохгадовы тэрмін навучання мы не толькі сэканомілі гадзіны, але і на большасці спецыяльнасцей у нас нават з’явіўся дадатковы час, — паведаміла Алена Жывіцкая. — Таму зараз мы можам уключаць у праграму новыя дысцыпліны, каб даць будучым спецыялістам паглыбленыя ці нават дадатковыя кампетэнцыі. Так, пры пераходзе на чатырохгадовы тэрмін навучання з пункта гледжання прафесійнай дзейнасці мы можам падрыхтаваць нават больш якаснага спецыяліста, чым раней”.

Варта сказаць, што пераход на чатырохгадовы тэрмін навучання на першай ступені стаў магчымы таксама дзякуючы актыўнаму выкарыстанню інфармацыйных тэхналогій у навучальным працэсе. Гэтым у многім і тлумачыцца першынство БДУІР.

Ва ўніверсітэце па ўсіх дысцыплінах вучэбнага плана распрацаваны электронныя вучэбна-метадычныя комплексы. І студэнты БДУІР ужо не канспектуюць па-старому лекцыі, а загадзя знаёмяцца з электроннымі комплексамі. На лекцыі ж яны атрымліваюць дадатковую інфармацыю, часта самую новую, эксклюзіўную, якую не прачытаеш у іншых крыніцах.

Ва ўсіх вучэбных карпусах універсітэта ўведзена ў эксплуатацыю сетка бесправаднога доступу WI-FI, праз якую студэнты маюць доступ да інфармацыйных рэсурсаў кафедр і электроннай бібліятэкі. Тут працуюць 15 камп’ютарных класаў агульнауніверсітэцкага карыстання і 50 камп’ютарных класаў на кафедрах для забеспячэння падрыхтоўкі студэнтаў па канкрэтных спецыяльнасцях. Усе лекцыйныя аўдыторыі ўніверсітэта абсталяваны мультымедыйнай тэхнікай.

“Інфармацыя, якую мы даём студэнтам, вельмі хутка абнаўляецца, — расказвае Алена Мікалаеўна. — Акрамя таго, аптымізаваны ўсе лабараторныя работы. У шэрагу электронных вучэбна-метадычных комплексаў прадстаўлены так званыя віртуальныя лабараторныя работы, каб студэнт мог сам, дома, зрабіць мадэль той ці іншай работы з выкарыстаннем інфармацыйных тэхналогій. Потым ва ўніверсітэце ён правярыць атрыманыя веды на рэальным абсталяванні, а яно ў нас самае сучаснае”.

Зараз вельмі многа ўвагі ўдзяляецца самастойнай кіруемай рабоце студэнтаў. Дзякуючы выкарыстанню сучасных тэхналогій, выкладчыкі могуць даць студэнтам значна больш інфармацыі, чым калісьці. І вельмі важна, што студэнтам гэта падабаецца. Яшчэ да пераходу на дыферэнцаваныя тэрміны навучання больш як палова студэнтаў выказаліся “за” . А сёння прыхільнікаў інтэнсіўнага навучання па схеме “4 + 2” яшчэ больш.

**Галіна СІДАРОВІЧ.**
*sidarovich@ng-press.by*

# Практыка-арыентаваная магістратура для прамысловасці і будаўніцтва

**Аднымі з першых магістарскія праграмы з паглыбленай падрыхтоўкай спецыялістаў сталі прапаноўваць Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт і Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.**
**Да апошняга часу, нягледзячы на падключэнне БДУ, БДУІР і БНТУ, сярод спецыяльнасцей практыка-арыентаванай магістратуры пераважалі эканамічныя і кіраўніцкія.**
**Але відавочна, што хутка перавага пачне перамяшчацца ў бок тэхнічных спецыяльнасцей.**

У Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэце ў недалёкай будучыні спецыяльнасці магістратуры з паглыбленай падрыхтоўкай спецыялістаў павінны з’явіцца на кожнай выпускаючай кафедры, а іх у БНТУ каля 100!

Зусім нядаўна БНТУ прапанаваў уключыць у Агульнадзяржаўны класіфікатар “Спецыяльнасці і кваліфікацыі” 17 новых спецыяльнасцей практыка-арыентаванай магістратуры (ад некаторых факультэтаў — нават па некалькі). У цэлым яны ахопліваюць многія галіны прамысловасці і будаўніцтва. Напрыклад, машынабудаўнічы факультэт прапаноўвае спецыяльнасці “Інавацыйныя тэхналагічныя сістэмы машынабудаўнічага профілю”, “Інавацыйныя тэхналогіі ў машынабудаванні”, “Мехатронныя сістэмы ў машынабудаванні”, “Механіка і надзейнасць машын”, прыборабудаўнічы факультэт — “Металагічнае забеспячэнне вытворчасці”, “Стандартызацыя і менеджмент якасці ў прамысловасці”, “Оптыка-электронная і лазерная тэхніка”.

**БНТУ ініцыіруе адкрыццё 17 новых спецыяльнасцей практыка-арыентанаванай магістратуры, якія ахопліваюць многія галіны прамысловасці і будаўніцтва.**

Акрамя таго, 20 спецыяльнасцей практыка-арыентаванай магістратуры ўключаны ў класіфікатар раней. Большасць з іх адносіцца да напрамкаў адукацыі “Кіраванне” і “Эканоміка”, але ёсць і спецыяльнасці, напрыклад, архітэктуры (“Горадабудаўніцтва”, “Архітэктура будынкаў і збудаванняў”, “Рэстаўрацыя помнікаў архітэктуры”, “Архітэктурны дызайн”). Магчыма, набор на гэтыя магістарскія праграмы пачнецца ўжо ў бягучым годзе: універсітэт падаў адпаведныя заяўкі ў Міністэрства адукацыі.

— Канечне, прапаноўваючы новыя спецыяльнасці практыка-арыентаванай магістратуры, мы абапіраемся на вынікі праведзеных маркетынгавых даследаванняў, кансультацый з асноўнымі работадаўцамі будучых магістраў — прадстаўнікамі прадпрыемстваў і арганізацый-заказчыкаў, улічваем аналіз запатрабаванасці магістраў у рэальным сектары эканомікі краіны, — расказвае начальнік Цэнтра развіцця інжынернай адукацыі і арганізацыі вучэбнага працэсу БНТУ А.С.СНАРСКІ. — Пры фарміраванні прапаноў па новых спецыяльнасцях на ўсіх этапах вельмі дапамагае Цэнтр бесперапыннай прафесійнай адукацыі РІВШ і ў першую чаргу яго кіраўнік Вольга Андрыянаўна Олекс.

Прадстаўнік універсітэта падкрэслівае, што ў БНТУ ёсць некалькі прычын развіваць магістратуру з паглыбленай падрыхтоўкай спецыялістаў. Па-першае, гэта імкненне захаваць лідарства ў тэхнічнай адукацыі, у тым ліку і на ІІ ступені. Па-другое, у 2013 годзе каля 30 спецыяльнасцей БНТУ пераходзяць на 4—4,5-гадовыя тэрміны навучання на І ступені, таму для іх асабліва актуальны працяг навучання ў магістратуры. Па-трэцяе, магістарскія праграмы практыка-арыентаванага характару вельмі запатрабаваны ў замежных грамадзян, а ўніверсітэт лічыць адным з прыярытэтаў экспарт адукацыйных паслуг.

Мінулы год быў шмат у чым знамянальны для развіцця практыка-арыентаванай магістратуры. Не толькі шмат зроблена па фарміраванні падсістэмы спецыяльнасцей, але і распрацоўваліся адукацыйныя стандарты і тыпавыя вучэбныя планы.

У разліку на тое, што папулярнасць такіх магістарскіх праграм у нашай краіне будзе расці, павялічана колькасць бюджэтных месцаў у практыка-арыентаванай магістратуры (з 7% да 14% ад колькасці выпускнікоў І ступені).

Пытанне развіцця практыка-арыентаванай магістратуры разглядалася на пасяджэнні Рэспубліканскага савета рэктараў устаноў вышэйшай адукацыі 31 мая — 1 чэрвеня 2012 года ў Наваполацку. Тады кіраўнікі УВА прызналі, што гатоўнасць да масавай падрыхтоўкі магістраў па новых адукацыйных праграмах не з’яўляецца стапрацэнтнай.

Што перашкаджае прагрэсу, ды і росту прывабнасці новаўвядзення ў вачах патэнцыяльных спажыўцоў паслугі, дык гэта нявызначанасць месца магістра на рынку працы, на канкрэтных прадпрыемствах. Застаецца няўлічанай прапанова аб тым, каб прадаставіць права выпускнікам практыка-арыентаванай магістратуры займаць пасады на 1-2 разрады вышэй, чым выпускнікі І ступені.

Рэалізацыя магістарскіх праграм патрабуе змены не толькі зместу, але і арганізацыі вучэбнага працэсу, а таксама метадык выкладання. Далёка не ўсе ўстановы вышэйшай адукацыі да гэтага гатовы. Тым не менш універсітэты-лідары разумеюць, што для замацавання тых поспехаў, якія ўжо ёсць, трэба больш шырока прыцягваць да падрыхтоўкі магістраў прадстаўнікоў рэальнага сектара.

Адна з галоўных праблем развіцця практыка-арыентаванай магістратуры звязана з тым, што не вызначаны прыярытэтныя навукова-тэхналагічныя напрамкі. А значыць, як суаднесці падрыхтоўку магістраў з перспектыўнымі планамі эканомікі і сацыяльнай сферы?

Відавочна, што зараз неабходна вывучэнне патрэб галін у выпускніках магістратуры, прычым пры падтрымцы арганізацый, прадпрыемстваў і кампаній. Заказчыкі павінны ўплываць таксама на вызначэнне запатрабаваных спецыяльнасцей і іх адкрыццё.

**Іна НІКІЦЕНКА.**
*nikitsenka@ng-press.by*

## Меркаванні

# Экзамены —

## *Што стрымлівае дыстанцыйнай*

***Васіль Міхайлавіч БАНДАРЫК, дэкан факультэта бесперапыннага і дыстанцыйнага навучання БДУІР:***

— Дыстанцыйнае навучанне адрозніваецца не толькі ад усіх форм дзённага, але і нават ад завочнага навучання. Напрыклад, у студэнтаў дыстанцыйнай формы практычна адсутнічаюць абавязковыя аўдыторныя заняткі. У той час як студэнт-завочнік спасцігае веды самастойна, з дапамогай падручнікаў, а задаць пытанні выкладчыкам можа толькі некалькі разоў у год на сесіях, то чалавек, які вучыцца дыстанцыйна праз інтэрнэт, мае пастаянны кантакт з выкладчыкамі.

На дыстанцыйнай форме навучання прымяняюцца сучасныя інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі, што дазваляе выкладчыкам з высокай эфектыўнасцю перадаваць студэнтам свае веды і ўменні. Дарэчы, зараз у БДУІР на дыстанцыйнай форме вучыцца больш за 800 студэнтаў.

Поспех укаранення дыстанцыйнага навучання залежыць ад узаемадзеяння чатырох фактараў:

1) менеджмент;
2) тэхнічнае і праграмнае забеспячэнне дыстанцыйнай формы навучання;
3) студэнты;
4) выкладчыкі-цьютары.

Па першым — трэцім фактарах праблем у БДУІР практычна няма. Менеджмент усіх узроўняў актыўна выступае за пашырэнне адукацыйных паслуг па дыстанцыйнай форме навучання. Гаворка ідзе аб прэстыжы вядучага IT-універсітэта краіны, атрыманні дадатковых даходаў, спрашчэнні і фармалізацыі працэсаў пераводу і аднаўлення ва ўніверсітэце, дадатковых працоўных месцах, у тым ліку дадатковай педагагічнай нагрузцы і г.д.

Студэнты факультэта яшчэ больш актыўна падтрымліваюць дыстанцыйную форму навучання. Гэтая форма дазваляе ім атрымаць вышэйшую адукацыю і дыплом дзяржаўнага ўзору без адрыву ад работы і месца пражывання, эканомячы час і сродкі. Дыстанцыйная форма прапаноўвае ім гнуткую траекторыю працэсу навучання.

**У якасці прычын, якія затрымліваюць развіццё дыстанцыйнай формы, можна вылучыць наступныя.**

Недахоп высокакваліфікаваных інжынераў для падтрымкі і развіцця праграмнага і тэхнічнага забеспячэння, у тым ліку і з-за недастаткова высокай аплаты працы інжынераў-праграмістаў. Апошнія, як правіла, ідуць працаваць у фірмы Парка высокіх тэхналогій або на замежныя прадпрыемствы.

Другім стрымліваючым фактарам выступаюць

## пакуль вочна

### развіццё формы навучання

праблемы з забеспячэннем выкладчыкамі. Справа ў тым, што шэраг выкладчыкаў узроставыя, а гэта часта ўскладняе засваенне імі сучасных інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій. Ёсць праблемы з арганізацыяй аплаты працы выкладчыкаў, нармаваннем іх працы. І, нарэшце, шэраг выкладчыкаў псіхалагічна не гатовы працаваць са студэнтамі віртуальна, ацэньваць іх веды без асабістага кантакту і г.д.

Па шэрагу прычын выклікае цяжкасці дыстанцыйнае навучанне асоб з абмежаванымі магчымасцямі. Так, паводле Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, вылучаецца дзённае і завочнае (у тым ліку дыстанцыйнае) навучанне, што аўтаматычна пераносіць на працэс дыстанцыйнага навучання ўсю нарматыўную базу па завочным навучанні.

Сёння адсутнічае магчымасць дыстанцыйнай падачы і разгляду большасці дакументаў пры афармленні студэнтаў дыстанцыйнай формы. Састарэлая нарматыўная база ўскладняе арганізацыю прамежкавай атэстацыі дыстанцыйна з выкарыстаннем інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій.

Не створана безбар'ернае асяроддзе для арганізацыі вочных кансультацый і атэстацыі асоб з абмежаванымі магчымасцямі. Ёсць цяжкасці з прадастаўленнем месцаў для пражывання гэтым людзям падчас вочных сесій.

Узровень даходаў сем'яў, у якіх жывуць асобы з абмежаванымі магчымасцямі, як правіла, невысокі. У той жа час няма дакладных механізмаў аказання спонсарскай дапамогі такім сем'ям у аплаце за навучанне.

Як вынік, вышэйшую адукацыю ў БДУІР на дыстанцыйнай форме навучання за ўвесь перыяд (з 2002 года) атрымалі толькі два чалавекі з абмежаванымі магчымасцямі. Зараз на факультэце бесперапыннага і дыстанцыйнага навучання БДУІР вучацца 12 чалавек з абмежаванымі магчымасцямі, прычым 6 з іх з'яўляюцца інвалідамі-калясачнікамі.

Хачу сказаць, што ў гэтым навучальным годзе ў якасці эксперымента мы атрымалі дазвол Міністэрства адукацыі на правядзенне экзаменаў пры дапамозе відэаканферэнцсувязі для студэнта-інваліда факультэта бесперапыннага і дыстанцыйнага навучання.

Сёння на дыстанцыйнай форме ў нашым універсітэце вучацца 7 замежных студэнтаў, пераважна грамадзяне Туркменістана. Стрымальным фактарам навучання замежных грамадзян на дыстанцыйнай форме з'яўляецца ўсё тая ж неабходнасць вочнай атэстацыі па ўсіх заліках і экзаменах вучэбнага плана.



# Замест лекцыі — у вытворчы цэх

**З пераходам да рыначнай эканомікі патрабаванні да маладых спецыялістаў узрастаюць. Ад іх чакаюць не толькі глыбокіх тэарэтычных ведаў, але і практычных навыкаў па арганізацыі і кіраванні вытворчасцю. Зразумела, што такі вопыт выпускнікі могуць набыць толькі непасрэдна на прадпрыемстве. Таму супрацоўніцтва ўстаноў адукацыі з арганізацыямі і прадпрыемствамі ў падрыхтоўцы кадраў не проста пажаданае, а з'яўляецца неабходнай умовай якаснай падрыхтоўкі спецыялістаў.**

Сёння ўстановы адукацыі імкнуцца развіваць такое супрацоўніцтва ў розных напрамках: ад арганізацыі студэнцкіх практык у навуковых установах на прадпрыемствах да адкрыцця філіялаў сваіх кафедр на іх базе. У выніку студэнты бываюць на вытворчасці не толькі падчас практыкі, але і на працягу ўсяго перыяду навучання, а да выкладання спецыяльных дысцыплін прыцягваюцца вядучыя спецыялісты прадпрыемстваў. Гэта, безумоўна, садзейнічае больш хуткай адаптацыі будучых спецыялістаў да ўмоў сучаснай вытворчасці і дае ім магчымасць праявіць сябе ўжо на самым пачатку працоўнай дзейнасці.

Напрыклад, у БДТУ ў 2012 годзе 37% дыпломных праектаў было выканана па заказах прадпрыемстваў і амаль 40% рэкамендавана да ўкаранення. Па асобных спецыяльнасцях і спецыялізацыях выкананне студэнтамі дыпломных праектаў па заказах прадпрыемстваў склала больш за 75% ("Лясная гаспадарка", "Машыны і апараты хімічных вытворчасцей і прадпрыемстваў будаўнічых матэрыялаў", "Тэхналогія паліграфічных вытворчасцей", "Канструяванне і вытворчасць вырабаў з кампазіцыйных матэрыялаў").

"Многія курсавыя і дыпломныя праекты нашы студэнты выконваюць па запытах рэальнага сектара эканомікі на аснове зборніка праблем тэхнічнага, тэхналагічнага і эканамічнага характару прадпрыемстваў ("Задачнік ад прамысловасці"), — расказвае прарэктар па вучэбнай рабоце БДТУ Сяргей Антонавіч КАСПЯРОВІЧ. — Так, у 2012 годзе ў адпаведнасці з "Задачнікам ад прамысловасці" студэнты ўніверсітэта выканалі 38 курсавых і 278 дыпломных праектаў".

Зразумела, што такі вынік стаў магчымым дзякуючы цеснаму супрацоўніцтву ўстановы адукацыі з прадпрыемствамі і арганізацыямі краіны. Сёння базамі практык БДТУ з'яўляюцца каля 870 арганізацый. Сярод іх нацыянальныя паркі і запаведнікі, дзяржаўныя лесагаспадарчыя ўстановы, прадпрыемствы канцэрнаў "Белнафтахім" і "Беллеспапераппрам", Міністэрства прамысловасці, Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва, Міністэрства інфармацыі і іншыя. Такая работа дазваляе інтэграваць намаганні ўніверсітэта і работадаўцаў па падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў.

У 2012 годзе у БДТУ працягвалася работа па развіцці супрацоўніцтва з арганізацыямі — заказчыкамі кадраў. Так, універсітэт прапанаваў больш чым 60 прадпрыемствам і арганізацыям заключыць дагаворы аб узаемадзеянні пры падрыхтоўцы кадраў. На гэты час падпісаны і ўзгоднены 6 дагавораў і шэраг дакументаў, якія атрымалі адабрэнне кіраўніцтва прадпрыемстваў і арганізацый, знаходзяцца на ўзгадненні ў адпаведных міністэрствах і ведамствах.

З мэтай павышэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў, больш паглыбленай інтэграцыі навукі, адукацыі і вытворчасці ў дзяржаўных установах і на прадпрыемствах створаны і функцыянуюць 35 вучэбна-навукова-вытворчых цэнтраў БДТУ, а таксама філіялы кафедраў на прадпрыемствах ААТ "Керамін", ЗАТ "Холдынгавая кампанія "Пінскдрэў" , РУП "Мінскі трактарны завод", РУП "Белмедпрэпараты", ДУ "Беллесаахова".

Дарэчы, першыя філіялы кафедр на прадпрыемствах універсітэт пачаў ствараць яшчэ ў 1998 годзе. Сёння гэта ўжо сталыя структуры, якія вядуць падрыхтоўку кадраў, займаюцца навукова-даследчай работай і ўкараняюць вынікі сваіх даследаванняў у вытворчасць.

Напрыклад, філіял кафедры тэхналогіі шкла і керамікі БДТУ (дарэчы, як і саму кафедру) на "Кераміне" ўзначальвае доктар тэхнічных навук прафесар Іван Адамавіч ЛЯВІЦКІ. А ў склад філіяла кафедры ўваходзяць інжынерна-тэхнічныя работнікі "Кераміна". Тут студэнты спецыялізацыі "Тэхналогія тонкай, функцыянальнай і будаўнічай керамікі" замацоўваюць тэарэтычныя веды па асноўных дысцыплінах. Прычым чытаюцца лекцыі і праводзяцца практычныя заняткі не толькі ў спецыялізаваных вучэбных класах, але і ў цэхах, дзе ўстаноўлена сучаснае абсталяванне, канвеерныя лініі, робататэхніка. Безумоўна, гэта садзейнічае больш глыбокаму і трываламу засваенню студэнтамі спецыяльных ведаў.

Практычнае замацаванне атрыманых ведаў дасягаецца таксама падчас тэхналагічнай практыкі. Прафесарска-выкладчыцкі склад кафедры цікавіцца меркаваннем начальнікаў цэхаў, тэхнолагаў, кіраўнікоў практыкі, і ў выніку лепшым студэнтам прапануецца прайсці пераддыпломную практыку ў ААТ "Керамін" з наступным працаўладкаваннем.

Дыпломнае праектаванне з'яўляецца завяршальным этапам навучання ва ўніверсітэце, і фарміраванню тэматыкі дыпломных праектаў, а таксама іх абароне кафедра ўдзяляе самую сур'ёзную ўвагу.

Абарона дыпломных праектаў ажыццяўляецца на "Кераміне", дзе дзяржаўная экзаменацыйная камісія збіраецца ў поўным складзе пад старшынствам генеральнага дырэктара ці галоўнага тэхнолага прадпрыемства. На абароне абавязкова прысутнічаюць вядучыя спецыялісты "Кераміна", у тым ліку работнікі канструктарскага бюро.

"Паколькі значная частка дыпломных праектаў выконваецца па заказе ААТ "Керамін", такая абарона з'яўляецца вельмі добрым урокам не толькі для студэнтаў, але і для выкладчыкаў-кіраўнікоў, — расказвае Іван Адамавіч ЛЯВІЦКІ. — Праекты і абароны звычайна прадстаўлены вельмі годна: добрая графіка, у тым ліку камп'ютарная, выразныя даклады, граматнае прадстаўленне атрыманых вынікаў. Такі падыход да абароны актывізуе старанніасць студэнтаў на працягу ўсёй работы над праектамі, павышае іх адказнасць. Немалаважная і выхаваўчая роля публічных абарон: выпускнікі адчуваюць увагу да сябе з боку прафесіяналаў і разумеюць сваю значнасць для прадпрыемства".

**Галіна СІДАРОВІЧ.**
*sidarovich@ng-press.by*

***Меркаванні***

# Аб прагназаванні патрэб заказчыкаў і практычнай падрыхтоўцы інжынераў

***Генадзь Аляксеевіч ГАЧКО, дэкан фізіка-тэхнічнага факультэта ГрДУ імя Янкі Купалы:***

— Рэгіянальныя ўніверсітэты сваёй асноўнай задачай лічаць падрыхтоўку кадраў па заказах арганізацый і прадпрыемстваў свайго рэгіёна. У рэалізацыі гэтай місіі ёсць праблема прагназавання рэальных патрэб заказчыкаў кадраў як на этапе адкрыцця падрыхтоўкі спецыялістаў па канкрэтнай спецыяльнасці, так і на этапе планавання кантрольных лічбаў прыёму на бягучы год.

Абгрунтаванне неабходнасці адкрыцця падрыхтоўкі спецыялістаў традыцыйна базіруецца на лічбах перспектыўнай патрэбы ў кадрах вядучых арганізацый рэгіёна адпаведнай галіны эканомікі. З такім падыходам, на мой погляд, не паспрачаешся. Напрыклад, пры адкрыцці ў ГрДУ імя Янкі Купалы спецыяльнасці "Тэхнічная эксплуатацыя энергаабсталявання арганізацый" у якасці заказчыкаў кадраў выступілі РУП "ГродНаэнерга", камітэт па сельскай гаспадарцы і харчаванні і аддзел энергетыкі Гродзенскага аблвыканкама.

А вось на этапе планавання кантрольных лічбаў прыёму на бюджэтныя месцы Кодэкс аб адукацыі патрабуе ўстанаўлення дагаворных адносін паміж установай адукацыі і арганізацыямі-заказчыкамі. І тут узнікае неадназначнасць. Эканоміка краіны мадэрнізуецца хуткімі тэмпамі, штогод адбываюцца значныя змены ва ўмовах гаспадарання і гандлю, кан'юнктуры рынкаў збыту, а падрыхтоўка спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй больш інерцыйная. Зразумела, што кіраўнік канкрэтнай арганізацыі ці прадпрыемства не можа заключыць дагавор з універсітэтам, дзе прадугледжаны пералік спецыяльнасцей і колькасць спецыялістаў на 4—8 гадоў наперад. Вопыт фізіка-тэхнічнага факультэта паказвае, што рэальныя месцы размеркавання выпускнікоў высвятляюцца за 1 год да выпуску па выніках вытворчай практыкі студэнтаў. Таму прапаноўваю фарміраваць кантрольныя лічбы прыёму на 1 курс канкрэтнай спецыяльнасці ў памеры 125% ад перспектыўнай патрэбы вядучых арганізацый — заказчыкаў кадраў з улікам вынікаў размеркавання выпускнікоў бягучага года.

Некалькі слоў аб практычнай накіраванасці падрыхтоўкі спецыялістаў. З аднаго боку, гэты тэзіс не выклікае сумненняў, асабліва ва ўмовах пераходу на 4-гадовую падрыхтоўку інжынераў на I ступені вышэйшай адукацыі. Безумоўна, трэба захаваць узровень агульнапрафесійнай і спецыяльнай падрыхтоўкі, але і рыхтаваць спецыялістаў для канкрэтнага першага месца работы (далейшае яго станаўленне можа адбывацца на II ступені ці шляхам перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі). Для гэтага неабходна цеснае супрацоўніцтва установы адукацыі і прадпрыемстваў на аснове доўгатэрміновых дагавораў, у якіх павінны быць прадугледжаны як сумесныя прыкладныя навуковыя даследаванні, так і стварэнне на прадпрыемстве інфраструктуры для практычнай падрыхтоўкі студэнтаў. Але трэба ўлічваць некаторыя аспекты. Па-першае, ёсць шэраг прадпрыемстваў (напрыклад энергетыкі ці хімічнай прамысловасці), на якіх абмежаваны допуск студэнтаў да дзеючых тэхналагічных установак. Па-другое, далёка не на кожным прадпрыемстве, дзе ёсць патрэба ў інавацыйна-ўспрымальных кадрах, выкарыстоўваюцца інавацыйныя тэхналогіі і ёсць дастаткова спецыялістаў, здольных на належным узроўні кіраваць практычнай падрыхтоўкай студэнтаў. На мой погляд, варта прыглядзецца да рэсурсных цэнтраў, якія ствараюцца ў прафесійна-тэхнічных навучальных установах. Напрыклад, мы разлічваем рэалізоўваць практычную падрыхтоўку будучых інжынераў-энергетыкаў на базе рэсурснага цэнтра па энергетыцы, які ў бягучым годзе пачне працаваць у Гродзенскім электратэхнічным прафесійным каледжы імя Івана Шчаснага.

**Меркаванні**

# Трэба давесці да дасканаласці ўжо дасягнутае

***Уладзімір Аляксандравіч ЯНЧУК, дэкан факультэта псіхалогіі, сацыяльнай і выхаваўчай работы Акадэміі паслядыпломнай адукацыі, доктар псіхалагічных навук, прафесар:***

— Падводзячы вынікі мінулага года, варта адзначыць пастунальны характар развіцця сістэмы адукацыі, які суправаджаўся аналізам зробленага і разважаннямі над прыярытэтамі. Безумоўным дасягненнем з'яўляецца стварэнне педагагічнай суполкі і актыўны дыялог з ёй з боку Міністэрства адукацыі. Гэта вельмі важнае ўсведамленне таго, што развіццё адукацыі — працэс і вынік скаардынаваных сумесных намаганняў усіх зацікаўленых бакоў і ад здольнасці выбудоўвання дыялога паміж імі залежыць паспяховасць рэалізацыі пастаўленых задач. Асабліва хачу падкрэсліць актыўны ўдзел у гэтым дыялогу кіраўніцтва Міністэрства адукацыі і міністра асабіста.

Вельмі важным для паспяховага працягу гэтай, безумоўна, пазітыўнай тэндэнцыі з'яўляецца знаходжанне аптымальных шляхоў павышэння якасці функцыянавання ўсіх элементаў сістэмы. Надышоў час спыніцца ў інавацыйным руху і давесці да дасканаласці ўжо дасягнутае па ўсіх напрамках.

Што для гэтага трэба?

**Першае**, дакладнае вызначэнне прыярытэтаў. Мы павінны засяродзіцца на павышэнні якасці прыняцця кіраўніцкіх рашэнняў на ўсіх узроўнях кіраўніцкай іерархіі, у тым ліку і шляхам публічнага абмеркавання новых праектаў. Трэба актыўна ўключаць у гэты працэс усю адукацыйную суполку, якая выступае ў якасці экспертаў і актуалізатараў. Для гэтага неабходна прапрацоўка адпаведнага механізму. Важна і стварэнне першага прэцэдэнту хоць бы і ў форме вынясення пэўнага праекта на публічную экспертызу ў педагагічным грамадстве.

**Другое**, распрацоўка сучасных сістэм ацэнкі якасці і іх крытэрыяў. Не той механістычнай і арыентаванай, хутчэй, на вытворчасць і тэхніку сістэмы, якая выкарыстоўваецца сёння і прыводзіць да знаходжання папяровай адпаведнасці адных фармальных крытэрыяў іншым (як гэта прынята ў менеджменце якасці), а сістэм, якія ўлічваюць спецыфіку адукацыі і абапіраюцца на так званы чалавечы фактар, што не падлягае механічнай фармалізацыі. У сусветнай практыцы ёсць аналагі такога роду сістэм, і іх можна і трэба адаптаваць.

Сёння асабліва значнай з'яўляецца распрацоўка такой сістэмы для кваліфікацыйнай ацэнкі работы педагогаў, над чым інтэнсіўна працуе Акадэмія паслядыпломнай адукацыі. Вельмі важна, каб педагог ведаў крытэрыі і яны былі аб'ектыўнымі і дасягальнымі пры наяўнасці адпаведнай кваліфікацыі. Варта адзначыць пры гэтым, што і сістэма матывацыі на дасягненне вышэйшай кваліфікацыі таксама павінна быць прапрацаванай. Уладальнік вышэйшай кваліфікацыі павінен атрымліваць істотна іншае матэрыяльнае ўзнагароджанне і валодаць больш высокім сацыяльным статусам. Гэта тычыцца ўсіх спецыялістаў, якія працуюць у сістэме адукацыі, бо пры недасканаласці крытэрыяў ацэнкі кваліфікацыі і адсутнасці значных матыватараў імкненне да павышэння кваліфікацыі рэзка зніжаецца або не фарміруецца зусім і работнік ідзе па шляху найменшага супраціўлення.

**Трэцяе**, радыкальнае пераўтварэнне навуковага забеспячэння і суправаджэння развіцця адукацыі. Сёння сітуацыя сумная. Кадры старэюць, моладзь не матываваная з-за абмежаванасці стымулаў і перспектыў. Матываваная педагагічная суполка сутыкаецца з праблемай крайняга дэфіцыту навуковага кваліфікаванага кіраўніцтва, якое суправаджаецца відавочным разрывам навукі і практыкі. Моцна абмежаваны доступ да сучасных сусветных дасягненняў, што часта прыводзіць да шматлікіх "вынаходак ровараў" у эксперыментальнай педагагічнай даследчай дзейнасці.

Вельмі недасканалая сістэма інфармавання аб сусветных дасягненнях, у дэфіцыце аналітычныя даследчыя службы і выданні. Надзея на інтэрнэт памылковая. У ім трэба, па-першае, арыентавацца, па-другое, атрымліваць аператыўную экспертную ацэнку, па-трэцяе, валодаць замежнымі мовамі на досыць высокім узроўні. Гэтая праблема павінна стаць прадметам глыбокага і адкрытага абмеркавання, бо прамаруджванне можа прывесці да наступстваў, пераадолець якія будзе вельмі затратна, а ў нечым і немагчыма.

# Між традыцыйнай адукацыяй і рэальным сектарам

**Супрацоўніцтва ўніверсітэтаў з прадпрыемствамі рэальнага сектара дазваляе вырашаць вельмі многія задачы. Адна з найважнейшых — далучэнне да інавацый як будучых спецыялістаў, так і выкладчыкаў. У IT-адукацыі такое ўзаемадзеянне развіваецца найбольш плённа. Расказвае дэкан факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі намеснік першага прарэктара па адукацыйных інавацыях і інфармацыйных тэхналогіях БДУ П.А.МАНДРЫК:**

— Некаторы разрыў паміж патрабаваннямі рэальнага сектара і адукацыяй, вядома, існуе. І праблема натуральная, перш за ўсё з-за імклівага развіцця інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, старэння выкладчыкаў, істотнага адрознення ў аплаце працы спецыялістаў IT-галіны і IT-адукацыі, адсутнасці ў многіх выкладчыкаў вопыту ўдзелу ў рэальных праектах. Каб стрымліваць павелічэнне гэтага разрыву, даводзіцца прыкладаць вельмі вялікія намаганні, накіраваныя на ўмацаванне сувязей з прадпрыемствамі IT-галіны і аб'яднанне намаганняў у справе падрыхтоўкі спецыялістаў.

У якасці прыкладу пленнага супрацоўніцтва магу спыніцца на ўзаемадзеянні БДУ і IBA. Гэта надзейны партнёр універсітэта, які добра разумее праблемы і задачы адукацыі, забяспечвае пастаянную шматпланавую падтрымку.

Мы вельмі цэнім, напрыклад, дваццацігадовую падтрымку студэнцкага алімпіяднага руху, дапамогу ў арганізацыі і правядзенні навукова-адукацыйных семінараў і канферэнцый, рэгулярны ўдзел ва ўмацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы для суправаджэння вучэбнага працэсу.

У гэты час прыярытэтным напрамкам у нашым супрацоўніцтве з IBA выбрана падрыхтоўка па карпаратыўнай сістэме кіравання SAP ERP і сістэмах бізнес-аналізу ў асяроддзі COGNOS і SPSS. У Цэнтры кампетэнцый па інфармацыйных тэхналогіях БДУ на базе ФПМІ для студэнтаў і выкладчыкаў універсітэта сумесна са спецыялістамі IBA праводзяцца лекцыі, семінары і лабараторныя заняткі па вучэбных курсах "Распрацоўка праграм на SAP ABAP", "Бізнес-аналіз у асяроддзі COGNOS TM1", "Асновы работы з SPSS Modeler", "Бізнес-аналіз у асяроддзі COGNOS BI".

Прычым галоўнай задачай навучання выкладчыкаў БДУ з'яўляецца іх прафесійная падрыхтоўка ў галіне інавацыйных інфармацыйных тэхналогій і найноўшага праграмнага забеспячэння ад вядучых сусветных вендараў, што ў далейшым дазволіць ім выкарыстоўваць гэтыя веды для выкладання на сучасным узроўні.

**Галоўная задача навучання выкладчыкаў у Цэнтры кампетэнцый па інфармацыйных тэхналогіях БДУ — іх прафесійная падрыхтоўка ў галіне інавацыйных інфармацыйных тэхналогій і найноўшага праграмнага забеспячэння ад вядучых сусветных вендараў, што ў далейшым дазволіць ім выкарыстоўваць гэтыя веды для выкладання на сучасным узроўні.**

Нашы сумесныя праграмы адкрыты для ўсіх студэнтаў і выкладчыкаў любога ўніверсітэта краіны. Дзясяткі і сотні студэнтаў і IT-спецыялістаў пастаянна праглядаюць сайт IBA ў пошуках прапаноў аб удзеле ў навучальных трэнінгах і семінарах. Дык вось, добрым прыкладам такога адкрытага курса з'яўляецца курс SAP TERP10 "Інтэграцыя бізнес-працэсаў", які чытаецца для студэнтаў і выкладчыкаў устаноў вышэйшай адукацыі ў межах праграмы "Універсітэцкі альянс SAP". Варта адзначыць, што заняткі вядуць выкладчыкі ФПМІ БДУ, якія прайшлі навучанне ў Акадэмічным цэнтры кампетэнцый SAP пры падтрымцы IBA і паспяхова здалі сертыфікацыйны тэст.

Для разумення маштабу той падтрымкі, якую мы атрымліваем дзякуючы Цэнтру кампетэнцый па інфармацыйных тэхналогіях, дастаткова пералічыць адукацыйныя ініцыятывы, у якіх удзельнічае цэнтр. Гэта праграма "Сеткавая акадэмія Cisco"; універсітэцкія праграмы IBM; праграма "Універсітэцкі альянс SAP"; акадэмічная ініцыятыва "ORACLE ACADEMY" з трох узроўняў; адукацыйная праграма Microsoft, якая ўключае такія напрамкі, як інавацыі ў вучэбным працэсе, праграмы ліцэнзавання для выкладчыкаў і студэнтаў, падтрымка студэнтаў і маладых спецыялістаў у правядзенні алімпіяд і канферэнцый; выкарыстанне праграмных прадуктаў 1С у вучэбным працэсе; "Акадэмія Касперскага".

Акрамя таго, на базе ФПМІ БДУ працуе Інстытут перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі ў галіне тэхналогій інфарматызацыі і кіравання, дзе арганізоўваецца цэлы спектр адукацыйных курсаў па сучасных праблемах інфарматызацыі, інфармацыйнай бяспекі, карпаратыўных сістэмах бізнес-аналізу і кіравання.

**Падрыхтаваў Аляксандр АНДРЫЯНАЎ.**

**Меркаванні**

# Курс на ўніфікацыю і тыпізацыю,

## *або Небяспека страціць перавагі дадатковай адукацыі*

***Таццяна Францаўна МІЛОВА, дырэктар Інстытута бесперапыннай адукацыі БДУ:***

— Сацыяльна-эканамічная значнасць усіх форм дадатковай адукацыі з кожным годам лепш усведамляецца грамадствам і ў той жа час аб'ектыўна павышаецца, бо гэта найбольш мабільная, самая практыка-арыентаваная і максімальна набліжаная да патрэб інавацый частка адукацыі. Дзякуючы кодэксу і нарматыўным дакументам, якія былі прыняты ўслед за ім, дасягнута легалізацыя спецыфікі дадатковай адукацыі. І гэта безумоўны плюс. Аднак шэраг тэндэнцый паказвае на магчымае зніжэнне або нават страту сістэмай дадатковай адукацыі сваіх асноўных пераваг.

Напрыклад, аказалася, што фармулёўкі кодэкса не прадугледжваюць магчымасць перападрыхтоўкі студэнтаў старшых курсаў. І ранейшы парадак, калі студэнт для навучання на перападрыхтоўцы павінен быў атрымаць дазвол рэктара ўніверсітэта, спрэчны. А цяпер навучанне, якое дазваляе дапоўніць асноўны профіль сумежнымі кампетэнцыямі, адпавядае еўрапейскай "Стратэгіі-2020", рыхтуе для эканомікі больш эфектыўных спецыялістаў, існуе фактычна ў рэжыме прававога парадоксу і чакае ўнясення змен у закон.

Насуперак неабходнасці развіваць экспертны, дынамічны, інавацыйны характар дадатковай адукацыі ў 2012 годзе пераважаў курс на ўніфікацыю і тыпізацыю. Распрацоўку і зацвярджэнне адукацыйных стандартаў спецыяльнасцей перападрыхтоўкі я ацаніла б станоўча. У адрозненне ад запланаванага ўвядзення тыпавых вучэбных праграм. Тыпавыя праграмы ніяк не спрыяюць распаўсюджанню лепшых практык, затое цалкам прыдатныя для таго, каб яшчэ больш запаволіць абнаўленне зместу, паменшыць разнастайнасць тэхналогій, перанесці акцэнт з новага і ўнікальнага на звыклае, тое, што ўжо добра ўстаялася.

Беларускай эканоміцы неабходна, каб на рынку працы з'яўляліся спецыялісты новай фармацыі, якія валодаюць сучаснымі падыходамі. Гэта важна як для інавацыйнага развіцця, так і часам для вырашэння надзённых задач. Да чэмпіянату свету па хакеі 2014 года плануецца адкрыццё дзясяткаў гасцініц, рэстаранаў і іншых аб'ектаў. Неабходнасць падрыхтоўкі спецыялістаў з адпаведнай адукацыяй быццам бы відавочная, але наш інстытут больш за паўтара года не можа атрымаць дазвол на арганізацыю праграмы "Менеджмент прадпрыемстваў гасціннасці". Яшчэ тры вострa актуальныя адукацыйныя праграмы перападрыхтоўкі ў сферы экалогіі і інфармацыйных тэхналогій застаюцца заложнікамі абмеркавання фармальных акалічнасцей. З-за гэтага інтарэсы прадпрыемстваў, спецыялістаў і ў цэлым дзяржавы толькі прайграюць.

За мінулы год дадатковая адукацыя стала лепш адпавядаць сваім задачам. Але якасны рывок, які наша сістэма павінна зрабіць у забеспячэнні пастаяннай мадэрнізацыі ведаў і кампетэнцый спецыялістаў, у фарміраванні шматмернай прасторы ўдасканалення чалавека, яшчэ трэба будзе здзейсніць.

**Адным з лепшых інавацыйных праектаў 2012 года прызнаны праект вядучага навуковага супрацоўніка лабараторыі лекавых сродкаў на аснове мадыфікаваных полісахарыдаў НДІ фізіка-хімічных праблем БДУ Паўла Міхайлавіча БЫЧКОЎСКАГА. Ён заняў другое месца ў апошнім рэспубліканскім конкурсе інавацыйных праектаў, што праводзіўся Дзяржаўным камітэтам па навуцы і тэхналогіях.**




# Новая вытворчасць лекаў,

## які дапамогуць хворым на рак

Конкурс праходзіць кожны год пры ўдзеле Міністэрства адукацыі, Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і іншых зацікаўленых ведамстваў у мэтах камерцыялізацыі вынікаў навуковых даследаванняў. Сёлета разглядаліся найбольш перспектыўныя інавацыйныя праекты з дэталёва прапрацаванай стратэгіяй рэалізацыі.

Інавацыйны праект П.М.Бычкоўскага пад назвай "Стварэнне малатаннажнага прадпрыемства фармацэўтычных субстанцый для атрымання проціпухлінных, кардыятропных і іншых лекавых сродкаў, якія адпавядаюць стандартам GMP на базе арганізацый Міністэрства адукацыі" прадугледжвае не толькі пашырэнне вытворчасці, якая ўжо дзейнічае, але і стварэнне новай. Згодна з праектам, на ўнітарным прадпрыемстве "Унітэхпрам БДУ" плануецца мадэрнізаваць вытворчасць арыгінальнага проціпухліннага лекавага прэпарата "Цысплацэл", які прызначаны для лакальнай хіміятэрапіі злаякасных новаўтварэнняў галаўнога мозга і пухлін галавы і шыі.

Прэпарат "Цысплацэл" ужо ўключаны ў Пратаколы лячэння Міністэрства аховы здароўя Беларусі. Ён дазваляе павялічыць безрэцыдыўны перыяд, палепшыць якасць і працяглასць (у 1,5—2 разы) жыцця хворых з пухлінамі галаўнога мозга, на 30—40% павысіць поўнае вылячэнне хворых з пухлінамі ў вобласці галавы і шыі. Таварны знак "Цысплацэл" зарэгістраваны ў Арменіі, апошнім часам разглядаецца магчымасць яго рэгістрацыі на Украіне і ў Казахстане.

Акрамя таго, прадпрыемства "Унітэхпрам БДУ" сумесна з НДІ ФХП БДУ ажыццяўляе распрацоўку тэхналогіі і арганізацыі вытворчасці арыгінальных фармацэўтычных субстанцый проціпухліннага ўздзеяння "Тэмадэкс", "Праспідэлонг", "Тэмадал", а таксама прэпарата кардыятропнага ўздзеяння "Нітаргал". Аналагі гэтых фармацэўтычных прэпаратаў адсутнічаюць у Рэспубліцы Беларусь і ў краінах СНД. Па спектры медыкабіялагічнага ўздзеяння яны маюць перавагі ў параўнанні з замежным аналагам — прэпаратам "Gliadel" вытворчасці "MGI Pharma. Inc" (USA) коштам 18 000 долараў ЗША за адну ўпакоўку.

Праект заснаваны на выніках фундаментальных і прыкладных даследаванняў, якія праводзіліся вучонымі лабараторыі лекавых сродкаў на аснове мадыфікаваных полісахарыдаў НДІ ФХП БДУ ў межах дзяржаўнай праграмы "Фармацэўтычныя субстанцыі і лекавыя сродкі". Па тэме праекта было надрукавана 20 артыкулаў і 80 тэзісаў дакладаў. Атрымана больш за 10 патэнтаў Рэспублікі Беларусь і Расіі.

"Унітэхпрам БДУ", намеснікам дырэктара якога з'яўляецца Павел Міхайлавіч Бычкоўскі, займаецца выпускам хімічных рэчываў, фармацэўтычных прэпаратаў і харчовых дабавак для Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання, а таксама вырабам прыбораў для медыцыны і комплексных паляпшальнікаў для Міністэрства прамысловасці.

Зараз "Унітэхпрам БДУ" мадэрнізуецца: у мінулым годзе за кошт уласных сродкаў набыў абсталяванне і камплектуючыя на 80 мільёнаў рублёў для абнаўлення вытворчых магутнасцей у адпаведнасці з патрабаваннямі GMP (Good Manufactured Practice, міжнародны стандарт якасці. — **Заўв. рэд**). Праект, прапанаваны П.М.Бычкоўскім, пры спрыяльных умовах можа быць рэалізаваны на працягу трох гадоў.

**Ганна ЛАГУН.**

## Меркаванні

# Ці варта чакаць у педагагічнай навуцы прарыўных вынікаў?

**Дысертацыі па педагагічных навуках трывала "лідзіруюць" сярод адхіленых Вышэйшай атэстацыйнай камісіяй. Чаму? Сапраўды нізкая якасць работ ці чаканні ВАК завышаныя? Якім увогуле патрабаванням павінна адпавядаць дастойная дысертацыя ў галіне педагогікі? Сваім меркаваннем на гэты конт дзеліцца пераможца конкурсу на лепшую дысертацыю ВАК 2011 года, малады кандыдат навук, дацэнт кафедры сурдапедагогікі факультэта спецыяльнай адукацыі БДПУ імя Максіма Танка Кацярына Мікалаеўна САРОКА:**

— Любы даследчык, напэўна, хацеў бы зрабіць прарыў у той галіне, у якой працуе, стварыць нешта прынцыпова новае, адкрыць яшчэ нявывучанае. Але ў педагогіцы, у прыватнасці ў карэкцыйнай педагогіцы, у якой я займаюся даследаваннямі, гэта, лічу, нерэальна. Росквіт дэфекталогіі як навукі прыйшоўся на 60—80 гады мінулага стагоддзя. Дзякуючы тым вынікам, зараз спецыяльная адукацыя выглядае вельмі годна. А сучасныя даследаванні, на мой погляд, могуць толькі дапоўніць тое, што ўжо зроблена, нешта перагледзець у сувязі з новымі сацыяльна-эканамічнымі ўмовамі.

Галоўнае, каб педагог-даследчык не быў адарваны ад прыктыкі. Найбольш каштоўнымі з'яўляюцца менавіта практыка-арыентаваныя даследаванні. Можна выводзіць новыя паняцці, мяняць тэрміналогію, але што ад гэтага зменіцца па сутнасці?

Чаму ў педагогіцы і псіхалогіі складана абараніцца? Не кожнаму даследчыку ўдаецца падаць свае ідэі даказальна, не супярэчліва. Важна, каб іх падзялялі аднадумцы, і пажадана, каб гэта былі вопытныя вучоныя, наватары, майстры. Гэта ўжо паказчык таго, што ідэі нечага вартыя. Нельга адштурхоўвацца толькі ад асабістага меркавання. Надзвычай важную ролю адыгрывае ўзаемаразуменне з навуковым кіраўніком.

У педагагічных даследаваннях далёка не адразу заўважны эфект: усё правяраецца часам, практыкай. Таму яны вельмі працаёмкія і вельмі працяглыя па часе, бо мы залежым ад дзяцей, ад навучальнай установы, з якой супрацоўнічаем, і ад вучэбнага працэсу, які ў ёй наладжаны. Асабіста я патраціла год толькі на фарміруючы эксперымент, укараненне сваёй методыкі ў практыку Рэспубліканскага цэнтра для дзяцей дашкольнага ўзросту з парушэннем слыху, гэта было неабходна для атрымання дакладных даных. Напэўна, мне адной з нямногіх удалося падрыхтаваць і абараніць кандыдацкую дысертацыю за чатыры з паловай гады. У некага гэта можа займаць дзесяцігоддзі.

Жадаю маладым навукоўцам не ставіцца да напісання дысертацыі і абароны як да самамэты. Трэба думаць аб тым, каб унесці ўклад у развіццё не толькі тэорыі, але і практыкі адукацыі. Бывае і так, што праца праходзіць абарону, але шырокага выкарыстання не знаходзіць. Педагогі павінны пісаць навуковыя працы не для таго, каб яны пыліліся на паліцах, а каб іх маглі выкарыстоўваць будучыя даследчыкі ў блізкай ці сумежнай галінах і, самае галоўнае, каб яны прыносілі карысць дзецям і педагогам, якія з імі працуюць. Хацелася б, каб дысертацыі былі даступнымі, зразумелымі для любога чытача: ці то доктар навук, ці то настаўнік школы.

**У 2012 годзе вучоныя ўніверсітэтаў Міністэрства адукацыі ўдзельнічалі ў выкананні больш як 660 (55%) заданняў дзяржаўных праграм навуковых даследаванняў. Па 12 праграмах з'яўляліся галаўнымі арганізацыямі-выканаўцамі. Летась ва ўніверсітэцкай навуцы атрыманы важныя вынікі, многія з якіх ужо ў найбліжэйшы час будуць выкарыстаны ў рэальным сектары эканомікі.**

# Як фінансуецца і як зарабляе ўніверсітэцкая навука

Паводле папярэдніх даных упраўлення навукі і інавацыйнай дзейнасці Міністэрства адукацыі, агульны аб'ём фінансавання навуковай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці ў сістэме міністэрства ў мінулым годзе склаў больш як 330 млрд рублёў, у тым ліку за кошт пазабюджэтных крыніц каля 170 млрд рублёў.

У рамках Дзяржаўнай праграмы інавацыйнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2011—2015 гады 12 устаноў вышэйшай адукацыі і навуковых арганізацый міністэрства выконвалі 32 праекты. Паводле папярэдняй інфармацыі, на іх рэалізацыю выдаткавана больш як 26 млрд рублёў.

Універсітэты падтрымліваюць партнёрскія адносіны ў навуковай і навукова-тэхнічнай сферы з арганізацыямі 60 краін у рамках 800 дагавораў. Найбольшым попытам карыстаюцца навуковыя распрацоўкі ўніверсітэтаў у галіне нанатэхналогій і новых матэрыялаў, радыёэлектронікі, інфармацыйных тэхналогій, тэлекамунікацый, лазерных тэхналогій, энерга- і рэсурсазберажэння, медыцыны і аховы здароўя, металургіі, будаўніцтва, лёгкай прамысловасці.

Сумесна з замежнымі партнёрамі вучоныя УВА актыўна ўдзельнічаюць у выкананні больш чым 110 праектаў міжнародных праграм, фондаў і грантаў, што дазволіла прыцягнуць больш за 2,1 млн долараў ЗША.

Міжнароднае супрацоўніцтва акупляецца станоўчай дынамікай пастаўкі навуковай прадукцыі (тавараў, работ, паслуг) за мяжу. У 2012 годзе экспарт ажыццяўляўся ў 30 краін па больш чым 400 кантрактах, дагаворах, ліцэнзійных пагадненнях. Аб'ём сродкаў, атрыманых на знешніх рынках, перавысіў 6,5 млн долараў.

На павелічэнне экспарту працуе калектыўная экспазіцыя навукова-тэхнічных распрацовак і інавацыйнай прадукцыі Міністэрства адукацыі. Летась яна была прадстаўлена на 22 выставах. У выніку ўдзелу толькі ў замежных выставах заключана каля 50 кантрактаў на пастаўку навуковай прадукцыі больш чым на 1,8 млн долараў.

**Найбольшым попытам за мяжой карыстаюцца навуковыя распрацоўкі ўніверсітэтаў у галіне нанатэхналогій і новых матэрыялаў, радыёэлектронікі, інфармацыйных тэхналогій, тэлекамунікацый, лазерных тэхналогій, энерга- і рэсурсазберажэння, медыцыны і аховы здароўя, металургіі, будаўніцтва, лёгкай прамысловасці.**

Прасоўваць распрацоўкі на замежныя рынкі дапамагаюць і 12 сумесных цэнтраў міжнароднага навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва. Актыўна развіваецца ўзаемадзеянне ў межах навукова-адукацыйнага кансорцыума паміж вышэйшымі навучальнымі ўстановамі, НДІ Рэспублікі Беларусь і Рэспублікі Казахстан. Яго ўдзельнікамі ўжо сталі 19 беларускіх універсітэтаў і навуковых арганізацый і 14 казахстанскіх універсітэтаў. Сфарміраваны 109 сумесных праектаў, значная частка якіх будзе фінансавацца партнёрамі.

Ва ўніверсітэтах створана разгалінаваная сетка інавацыйных падраздзяленняў, якая ўключае больш за 40 суб'ектаў. У інтэрнэце паспяхова працуе Інфармацыйна-маркетынгавы вузел Міністэрства адукацыі. Сёння на гэтай пляцоўцы размешчана каля 150 актуальных тэхналагічных запытаў ад 6 міністэрстваў і 70 прадпрыемстваў рэспублікі, 540 тэхналагічных прапаноў універсітэтаў. У мінулым годзе дабаўлена 140 тэхналагічных прапаноў у галіне біятэхналогіі, харчовай прамысловасці, аховы навакольнага асяроддзя, машынабудавання, медыцыны і вылічальнай тэхнікі. Дзейнічае сістэма анлайн-перамоў, яе наведвальнікі — спецыялісты з 60 краін СНД, Еўропы, Азіі.

Унутры нашай краіны прасоўваць навуковую прадукцыю дапамагаюць кааперацыйныя біржы. У 2012 годзе ў Мінску адбыліся два такія мерапрыемствы: "Новыя тэхналогіі для аўтатрактарабудавання" (у межах Беларускага прамысловага форуму) і "Вада і цяпло: новыя тэхналогіі зберажэння і ўліку рэсурсаў" (у межах XIV Міжнароднай выставы "Вада і цяпло").

**Падрыхтаваў Аляксандр АНДРЫЯНАЎ.**

Настаўніцкая газета
5 лютага 2013 года

# Не рэформа, а трансфармацыя



◄◄◄ 1 стар.

***— Аркадзь Ханонавіч, не сакрэт, што кіраўніцтва прафесійнай адукацыі, дырэктары навучальных устаноў, нашы педагогі насцярожана ставяцца да працэсу аптымізацыі. А што вы думаеце на гэты конт?***

— Абапіраючыся на свой багаты жыццёвы і прафесійны вопыт і доўгую работу ў сістэме прафесійнай адукацыі, лічу, што сёння наша адукацыя перажывае новы віток свайго развіцця. За перыяд функцыянавання адукацыйнай галіны было апрабавана многа падыходаў для яе паспяховай дзейнасці, назапашана шмат вопыту. Але за апошнія гады мы, напэўна, упершыню пачалі абмяркоўваць пытанне рацыянальнага выкарыстання бюджэтных сродкаў для забеспячэння развіцця сістэмы адукацыі і ў прыватнасці прафесійнай школы. Хачу адразу заўважыць, што, гаворачы пра аптымізацыю сістэмы прафесійнай адукацыі, мы маем на ўвазе не эканомію дзяржаўных асігнаванняў, не скарачэнне сродкаў, якія выдаткоўваюцца сёння на прафесійную адукацыю, а іх рацыянальнае выкарыстанне. Асноўнай мэтай аптымізацыі з'яўляецца павышэнне эфектыўнасці функцыянавання рэгіянальнай сеткі навучальных устаноў у канкрэтных сацыяльна-эканамічных і дэмаграфічных умовах. Гэты кірунак прадугледжвае шматгранныя падыходы, якія павінны не толькі паўплываць на высокую выніковасць фінансавання, але і палепшыць якасць прафесійнай адукацыі. І гэтая ўзаемасувязь эканамічных рычагоў, з дапамогай якіх прафесійная адукацыя зможа далей імкліва развівацца, з механізмам павышэння яе якасці і прадстаўляе менавіта тое паняцце, якое стаіць за тэрмінам "аптымізацыя".

На маю думку, гэты працэс з'яўляецца сёння рэальнай неабходнасцю для сістэмы прафесійнай адукацыі. Мы павінны разумець, што аптымізацыю трэба праводзіць не дзеля яе самой, а рэальнымі дзеяннямі рэагаваць на тыя змены, якія адбываюцца як у нашай краіне, так і ў свеце. І гэта не толькі сённяшнія сацыяльна-эканамічныя ўмовы, але і дэмаграфічная сітуацыя, якая істотна ўплывае на функцыянаванне нашых навучальных устаноў. Таму, як бы хто ні хацеў, так, як раней, сістэма прафесійнай адукацыі існаваць не будзе, як у арганізацыйным, так і ў змястоўным плане.

Сёння нашай эканоміцы, якая ідзе шляхам мадэрнізацыі і інавацыйных тэхналагічных пераўтварэнняў, патрэбны рабочыя і спецыялісты, якія здольны працаваць у новых высокапрадукцыйных умовах і маюць для гэтага адпаведную кваліфікацыю. У гэтай сувязі хацелася б звярнуцца да статыстыкі. Так, у 2020 годзе большасць рабочых месцаў на вытворчасці ў еўрапейскіх краінах будзе належаць тым людзям, якія маюць высокі альбо сярэдні ўзровень кваліфікацыі: высокі — каля 33 працэнтаў, а сярэдні — каля 50 працэнтаў. Што тычыцца нізкай кваліфікацыі, то частка рабочых з гэтым узроўнем падрыхтоўкі будзе скарочана да 18 працэнтаў. Таму натуральна, што мадэрнізацыя, якая распачата і ў нашай краіне, будзе ўплываць на тое, што на вытворчасць прыйдуць рабочыя і спецыялісты толькі высокай кваліфікацыі. Паспрыяць гэтаму працэсу павінна і аптымізацыя, якая прадугледжвае не рэфармаванне сістэмы прафесійнай адукацыі, а яе трансфармацыю.

***— Якія крокі неабходны для аптымізацыі сістэмы прафесійнай адукацыі?***

— Гэты працэс будзе ахопліваць некалькі кірункаў. Па-першае, гэта перайменаванні, а разам з гэтым і адпаведная змястоўная насычанасць навучальных устаноў з мэтай іх уніфікацыі. Такім чынам мы адыдзем ад разнастайнасці іх назваў, якая існавала яшчэ да нядаўняга часу. Як вядома, у сістэме прафтэхадукацыі функцыянавалі прафесійна-тэхнічныя вучылішчы, каледжы, прафесійныя ліцэі. На гэты раз у нас будзе толькі два віды навучальных устаноў. Гэта каледж, які забяспечыць навучанне нашай моладзі згодна з адукацыйнымі праграмамі сярэдняй спецыяльнай і прафесійна-тэхнічнай адукацыі, і прафесійны ліцэй, у якім можна будзе атрымаць рабочую прафесію.

Стварэнне ліцэяў і каледжаў дазволіць прыцягнуць больш падрыхтаваных выпускнікоў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі і павялічыць долю выпускнікоў з павышаным узроўнем кваліфікацыі. Акрамя таго, важна, што гэтыя ўстановы стануць шматпрофільнымі і шматфункцыянальнымі з пашыраным пералікам адукацыйных паслуг для розных катэгорый насельніцтва. Гэта асабліва актуальна ў сельскай мясцовасці, малых гарадах і пасёлках — у першую чаргу там, дзе недастаткова развіта сетка ўстаноў адукацыі. Навучальныя ўстановы павінны істотна пашыраць свае паслугі для дарослага насельніцтва, у тым ліку для работнікаў вытворчасці, беспрацоўных, а таксама асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

Другім важным кірункам аптымізацыі павінна стаць змяненне падпарадкаванасці ўстаноў адукацыі і іх перадача з рэспубліканскага падпарадкавання ў рэгіянальнае. Трэба звярнуць увагу і на тыя ўстановы, якія падпарадкаваны сёння іншым галінам эканомікі. Мэтазгодным было б перавесці іх у структуру Міністэрства адукацыі. Рыхтаваць кадры для іншых галін без каардынуючай ролі нашага міністэрства даволі складана і не зусім правільна. Акрамя таго, аптымізацыя прадугледжвае інтэграцыю ўстаноў адукацыі, за якой стаіць далучэнне, аб'яднанне ўстаноў адукацыі з мэтай выключэння іх дубліравання. Неад'емным элементам аптымізацыі сістэмы прафесійнай адукацыі стануць і рэсурсныя цэнтры.

***— Аркадзь Ханонавіч, ці падрыхтавалі сёння Міністэрства адукацыі і непасрэдна РІПА неабходныя матэрыялы для навукова-метадычнага суправаджэння аптымізацыі?***

— Супрацоўнікі нашага інстытута распрацавалі Метадычныя рэкамендацыі па аптымізацыі рэгіянальнай сеткі ўстаноў прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, дзе прапісаны асноўныя кірункі гэтай работы і вызначаны механізмы аптымізацыі ў рэгіёнах. Акрамя таго, мы можам аказваць дадатковыя кансультацыі ўпраўленням адукацыі, іншым кіруючым структурам аблвыканкамаў і Мінгарвыканкама, кіраўнікам навучальных устаноў. Такім чынам на рэспубліканскім узроўні створаны неабходны інструментарый, які дасць магчымасць упраўленням адукацыі, канкрэтным установам адукацыі распрацаваць рэгіянальныя праграмы аптымізацыі. У кожнага рэгіёна павінны быць свае падыходы. Але аснова гэтага працэсу павінна быць адна. Гэта ўпарадкаванне структуры і аб'ёмаў падрыхтоўкі кадраў, павышэнне якасці падрыхтоўкі і запатрабаванасці выпускнікоў, рацыянальнае выкарыстанне вучэбна-матэрыяльнай базы і бюджэтных сродкаў.

Хачу сказаць, што нашы метадычныя рэкамендацыі па аптымізацыі атрымалі шырокі водгук у краінах СНД. Нашы калегі з Казахстана, Расійскай Федэрацыі прайшлі павышэнне кваліфікацыі ў нашым інстытуце, у тым ліку і па аптымізацыі прафесійнай адукацыі. У сакавіку ва Украіне пад эгідай Еўрапейскага фонду адукацыі пройдзе рэгіянальны семінар, прысвечаны метадычнаму суправаджэнню аптымізацыі. РІПА запрошаны на гэтае мерапрыемства і будзе прадстаўляць наш метадычны інструментарый замежным калегам.

***— Як вядома, метадычныя рэкамендацыі распрацаваны на аснове даследаванняў, якія былі праведзены Міністэрствам адукацыі і РІПА ў ходзе маніторынгу рэгіянальнай сістэмы прафесійнай адукацыі Гродзенскай вобласці. Раскажыце аб гэтым больш падрабязна. Якія высновы былі зроблены пасля гэтага даследавання?***

— Маніторынг праводзіла спецыяльная камісія. У склад гэтай камісіі ўвайшлі прадстаўнікі ўпраўленняў аблвыканкама па ўсіх сферах дзейнасці і, безумоўна, сістэмы адукацыі. Задачу маніторынгу была вызначыць, наколькі адпавядае колькасць і якасць кадраў, што рыхтуюцца ва ўстановах адукацыі, тым запатрабаванням, якія прад'яўляе сёння рынак працы рэгіёна. У навучальных установах былі распаўсюджаны анкеты з пытаннямі аб прыёме і выпуску навучэнцаў, працаўладкаванні выпускнікоў на вытворчасці, патрэбнасці работадаўцаў у тых ці іншых кадрах. Акрамя таго, вывучаўся кантынгент рабочых і спецыялістаў на прадпрыемствах, дзейнасць службаў занятасці па прафесійнай падрыхтоўцы дарослага насельніцтва.

У выніку маштабнага аналізу, які быў зроблены пасля гэтых даследаванняў, высветлілася, напрыклад, што па некаторых запатрабаваных у рэгіёне прафесіях установы прафесійнай адукацыі падрыхтоўку не вядуць. З іншага боку, выяўлена нерацыянальнае выкарыстанне вучэбных плошчаў і магутнасцей некаторых устаноў адукацыі. Ёсць факты, калі навучальная ўстанова была разлічана, напрыклад, на 500 навучэнцаў, але там вучылася толькі 100 чалавек. Магчыма, і ўзнікае першая думка закрыць такую ўстанову. Але я хацеў бы перасцерагчы ад такіх паспешных высноў, тым больш калі ад іх могуць пацярпець цэлыя калектывы. Важна пры гэтым улічваць зменлівасць запатрабаванняў рынку працы. Сёння адны прафесіі могуць быць незапатрабаваны, а заўтра попыт на іх можа ўзрасці. Таму навучальныя ўстановы павінны быць больш мабільнымі, аператыўна рэагаваць на запатрабаванні часу, пашыраць спектр адукацыйных паслуг.

Да правядзення аптымізацыі трэба ставіцца вельмі асцярожна, абдумваць кожны крок, каб не нашкодзіць. Неабходна памятаць, што закрыццё навучальных устаноў працэс аптымізацыі не прадугледжвае.

***— Як у рэгіёнах складваецца сітуацыя з аптымізацыяй? Наколькі актыўна дзейнічае кіраўніцтва рэгіянальнай адукацыі?***

— Найбольш спрыяльныя перадумовы па аптымізацыі сістэмы прафесійнай адукацыі складваюцца сёння ў Магілёўскай вобласці. Трэба аддаць належнае абласному ўпраўленню адукацыі, якое вельмі актыўна ўзялося за аптымізацыю рэгіянальнай сеткі прафесійнай адукацыі і цесна супрацоўнічае з нашым інстытутам. Дарэчы, РІПА ў Магілёве была арганізавана падрыхтоўка дырэктароў навучальных устаноў менавіта па гэтай тэматыцы. Кіраўніцтва адукацыі вобласці на месцы правяло дасканалыя аналітычныя даследаванні, адпаведныя маніторынгі і прапанавала прымальную сістэму аптымізацыі структуры прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Што тычыцца іншых абласцей, то там кіраўнікі адукацыі знаходзяцца ў стадыі асэнсавання пастаўленай задачы і пачатку канкрэтных дзеянняў. Загад міністра адукацыі па выніках пасяджэння калегіі, прысвечанага аптымізацыі сістэмы прафесійнай адукацыі, прадугледжвае, што да мая ўпраўленні адукацыі рэгіёнаў павінны прадставіць свае праграмы. У РІПА плануецца правесці семінар для кіраўнікоў адукацыі рэгіёнаў і дырэктараў навучальных устаноў, каб аказаць ім метадычную дапамогу. Так, сапраўды, святы абавязак РІПА — дапамагаць нашым рэгіёнам, каардынаваць іх работу ў правядзенні аптымізацыі. Але павінен быць сустрэчны рух, зацікаўленасць і ініцыятыўнасць рэгіянальных структур.

Пакуль начальнікі ўпраўленняў адукацыі не ўсведомяць, што аптымізацыя папярэдне патрабуе сур'ёзнай аналітычнай работы, узважвання ўсіх "за" і "супраць" і ў далейшым рэалізацыі канкрэтных шляхоў з улікам рэгіянальных асаблівасцей, безумоўна, працэс будзе цяжкім.

***— Вельмі важная, напэўна, у гэтым працэсе роля кіраўніка навучальнай установы?***

— Так, сапраўды, кіраўнік навучальнай установы павінен быць у цэнтры падзей і прымаць самы актыўны ўдзел у аптымізацыі сваёй навучальнай установы. Дзеля гэтага павінен быць створаны бізнес-план, пры складанні якога кіраўнік установы адукацыі павінен распрацаваць механізм узаемадзеяння з рынкам працы ў адпаведным рэгіёне. Дырэктару неабходна дыверсіфікаваць адукацыйныя праграмы, сарыентаваць сваю ўстанову адукацыі на падрыхтоўку дарослага насельніцтва, у тым ліку асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Пільную ўвагу кіраўніцтва ўстановы павінна ўдзяляць інавацыйным кірункам развіцця эканомікі рэгіёна, новым відам эканамічнай дзейнасці, арганізацыі і развіццю прыватнай формы ўласнасці.

Кіраўніцтву ўстаноў адукацыі трэба рэгулярна аналізаваць размеркаванне і працаўладкаванне выпускнікоў, больш узважана падыходзіць да праектавання кантрольных лічбаў прыёму ці скарачаць альбо ўвогуле адмовіцца ад прыёму па незапатрабаваных спецыяльнасцях і кваліфікацыях.

У той час, калі дэмаграфічная сітуацыя не дае нам станоўчых перспектыў, кіраўнік установы павінен паклапаціцца, каб плошчы навучальнай установы не пуставалі, а выкарыстоўваліся на поўную магутнасць і прыносілі карысць. Пастаянна вывучаць лакальны рынак працы, ведаць, якія прафесіі патрэбны ў рэгіёне і ў якой колькасці, якія адукацыйныя паслугі неабходна пашыраць, ці мае дарослае насельніцтва рэгіёна патрэбу ў перападрыхтоўцы і па якіх прафесіях — усе гэтыя і многія іншыя пытанні павінны стаць злабадзённымі для кіраўніка ўстановы.

У сваю чаргу мы гатовы аказаць садзейнічанне кіраўніцтву ўстаноў у стварэнні такіх бізнес-планаў. Але ім трэба праяўляць ініцыятыву, быць неабыякавымі да лёсу сваёй навучальнай установы, свайго педагагічнага калектыву і навучэнцаў.

***— Аднымі з вынікаў аптымізацыі павінны стаць развіццё пазабюджэтнай дзейнасці і пашырэнне адукацыйных паслуг насельніцтву. А наколькі будуць задзейнічаны іншыя крыніцы фінансавання сістэмы прафесійнай адукацыі? Ці варта чакаць дзейснай дапамогі з боку работадаўцаў?***

— Я хачу сказаць, што сёння з боку дзяржавы, урада, канкрэтных міністэрстваў зроблена вельмі шмат для таго, каб стварыць самыя спрыяльныя ўмовы для развіцця пазабюджэтнай дзейнасці ў сістэме прафесійнай адукацыі. У першую чаргу гэта, канечне, стварэнне новай падатковай сістэмы, якая дазваляе навучальным установам не плаціць падатак на прыбытак. Вырашаны і іншыя пытанні, якія дазваляюць паспяхова развіваць пазабюджэтную дзейнасць.

Па сутнасці, утрыманне такой галіны, як прафесійная адукацыя, вельмі дарагое, і ўскладваць гэта на плечы толькі дзяржаўнага бюджэту нерацыянальна. Таму задача дзяржавы — стварыць такія ўмовы, каб і нашы работадаўцы былі зацікаўлены ва ўкладанні сродкаў у прафесійную адукацыю. Сёння вытворцы апраўдваюць сваё дыстанцыраванне ад сістэмы прафесійнай адукацыі тым, што яны плацяць падаткі ў бюджэт і такім чынам фінансава падтрымліваюць прафадукацыю.

Але ж на адны падаткі прадпрыемстваў яна існаваць не можа. На жаль, сёння ў нашай краіне няма эфектыўных механізмаў уздзеяння на работадаўцаў, каб яны, нарэшце, больш актыўна супрацоўнічалі з навучальнымі ўстановамі па павышэнні якасці падрыхтоўкі рабочых і спецыялістаў і ўкладвалі ў гэта грошы.

Напэўна, трэба ўключыць і такі механізм, які б не дазваляў ніводнаму прадпрыемству прымаць на работу чалавека, які не мае адпаведнага сертыфіката аб прафесійнай падрыхтоўцы. Паколькі, як паказвае практыка, у многіх галінах эканомікі, у тым ліку ў будаўніцтве, камунальнай гаспадарцы, машынабудаванні, на прадпрыемствах, працуюць людзі, як кажуць, з вуліцы.

І яшчэ адзін момант. Вядома, што ў кожнай галіне створана аб'яднанне работадаўцаў, мэтай якога з'яўляецца клопат пра развіццё сваёй сферы дзейнасці. Але ні ў адным статуце такога аб'яднання не гаворыцца аб тым, як работадаўцы павінны спрыяць павышэнню прафесіяналізму сваіх кадраў. Згадзіцеся, што гэта нонсэнс. Як можна будаваць стратэгію развіцця той ці іншай галіны і не клапаціцца пра падрыхтоўку кадраў для яе?

Я лічу, што ўжо наспеў час, каб на дзяржаўным узроўні былі прыняты меры, скіраваныя на павышэнне зацікаўленасці работадаўцаў у сістэме прафесійнай адукацыі, якая рыхтуе для іх кадры. Такі вопыт ужо існуе ў многіх краінах. Напрыклад, ва Украіне прэзідэнт падпісаў закон аб канфедэрацыі работадаўцаў, дзе некалькі яго артыкулаў прысвечаны супрацоўніцтву работадаўцаў з сістэмай прафесійнай адукацыі. У нас такіх законаў няма. І гэта прыводзіць да таго, што сёння, за выключэннем некалькіх канкрэтных галін, большасць работадаўцаў па-ранейшаму адлучана ад сістэмы падрыхтоўкі кадраў, а гэта можа азначаць толькі адно: кіраўнікам прадпрыемстваў і арганізацый гэтай галіны ўсё роўна, хто ў іх будзе працаваць. І з гэтым нельга згадзіцца. Такім чынам, аптымізацыю трэба праводзіць не толькі ўнутры самой сістэмы прафесійнай адукацыі, але і звонку, як таго патрабуе час.

**Гутарыла Ала КЛЮЙКО.**
*kliuiko@ng-press.by*

ISSN 1994-9146

Галоўны рэдактар Вадзім Кнышаў